ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Выдаецца з 1932 г.
№ 32 (2558)
ПЯТНІЦА
6
жніўня 1971 г.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ НА ШАСНАЦЦАЦІ СТАРОНКАХ

Цана 8 кап.

ГАНАРОВАЯ ПРАФЕСІЯ

8 ЖНІЎНЯ — ДЗЕНЬ БУДАЎНІКА

Іх называюць людзьмі сціплай прафесіі. Магчыма, што яно і сапраўды так. Зрэшты, справа не ў гэтым. Справа ў тым, што прафесію будаўніка не назавеш непрыкметнай, хоць словы сціпласць і непрыкметнасць знаходзяцца недзе ў адным сінанімічным радзе. Бо тое, што ствараюць людзі, якіх мы называем будаўнікамі, відно ўсім і кожнаму. У нашай жа краіне прафесія будаўніка даўно стала не толькі патрэбнай і надзвычай распаўсюджанай, але і ў самым высокім значэнні ганаровай. Бо, зноў-такі, з першых дзён нараджэння на сцягу нашай дзяржавы рабочых і сялян напісана слова — будаўніцтва, а герб яе ўпрыгожваюць скрыжаваныя серп і молат — адвечныя сімвалы мірнай стваральнай працы.

І з тае пары — вось ужо пяцьдзесят чацвёрты год — мы будуем. Будуем заводы і фабрыкі, электрастанцыі і руднікі, школы і інстытуты, дзіцячыя сады і дамы адпачынку. Мы будуем цэлыя гарады — светлыя, прасторныя, утульныя, у якіх створаны ўсе ўмовы для творчай, натхнёнай працы і адпачынку савецкіх людзей.

Зірнем толькі на сённяшнюю карту роднай Беларусі. У цэнтры зялёнага кляновага лістка — так выглядае наша рэспубліка на карце — значыцца кружок з надпісам: Мінск. За гэтым кароткім словам — светлыя, сонечныя праспекты і вуліцы роднай сталіцы, яе аўтамабільны і трактарны гіганты, дзесяткі іншых заводаў, камбінатаў і фабрык, гмахі яе ВНУ і тэхнікумаў, школ, тэатраў, бібліятэк.

Вакол Мінска мы бачым адноўленыя, таксама адбудаваныя нанова Віцебск і Магілёў, Гомель і Бабруйск, Рэчыцу і Барысаў, Гродна і Полацк, Ліду і Маладзечна, Баранавічы і Брэст, Мазыр і Пінск. Поруч з імі за апошнія гады паўсталі зусім новыя гарады: горад энергетыкаў — Белазёрск, горад шахцёраў — Салігорск, гарады хімікаў — Светлагорск і Наваполацк.

А дзесяткі, сотні іншых гарадоў і пасёлкаў, тысячы калгасных і саўгасных вёсак! Яны таксама перажываюць сёння сваё другое нараджэнне — радуюць вока новымі вуліцамі і гандлёва-культурнымі цэнтрамі, карпусамі прамысловых прадпрыемстваў і капітальнымі, тыпавымі будынкамі жывёлагадоўчых ферм.

І ўсё гэта зроблена і робіцца рукамі будаўнікоў — мулярау і тынкоўшчыкаў, кранаўшчыкоў і электразваршчыкаў, цесляроў і экскаватаршчыкаў, бляхароў і мантажнікаў.

Найвялікшы подзвіг савецкіх будаўнікоў—узведзенае імі жытло. Мільёны квадратных метраў добраўпарадкаванай жылой плошчы, мільёны людзей, што ўсяліліся за пасляваенныя гады ў новыя, з усімі выгодамі кватэры,—якая краіна можа пахваліцца такімі тэмпамі, такім размахам жыллёвага будаўніцтва?!

А планы, накрэсленыя роднай партыяй на будучае, яшчэ больш велічныя, яшчэ больш захапляючыя. За пяць наступных гадоў мы павінны пабудаваць 565—575 мільёнаў квадратных метраў жылля, што дасць магчымасць палепшыць жыллёвыя ўмовы прыкладна 60 мільёнам чалавек.

Мы будуем. Паўсюдна — ад гарачага Поўдня да сцюжнай Поўначы — над нашай зямлёй узвышаюцца краны. Гэта не паэтычная метафара: Краіна Саветаў —велізарная будаўнічая пляцоўка. На ёй з гонарам нясуць сваю працоўную вахту мільёны людзей самай мірнай прафесіі на зямлі—будаўнікі.

Паслязаўтра — іх свята. Разам са сваімі калегамі і сябрамі плённымі поспехамі страчае яго электразваршчык 34-га будаўнічага ўпраўлення сталіцы Міхась Каліноўскі.

Фота А. і М. АНАНЫНЫХ.

СЯБРОЎСКАЯ СУСТРЭЧА КІРУЮЧЫХ ДЗЕЯЧОЎ БРАЦКІХ КРАІН

2 жніўня 1971 года ў Крыме адбылася сяброўская сустрэча кіраўнікоў камуністычных і рабочых партый раду сацыялістычных краін, якія знаходзяцца на адпачынку ў Савецкім Саюзе, і савецкіх кіраўнікоў, партыйных і дзяржаўных дзеячоў. У ёй удзельнічалі: Першы сакратар ЦК БКП, Старшыня Дзяржаўнага Савета НРБ Т. Жыўкаў, Першы сакратар ЦК ВСРП Я. Кадар, Першы сакратар ЦК САПГ Э. Хонекер, Першы сакратар ЦК МНРП, Старшыня Савета Міністраў МНР Ю. Цэдэнбал, Першы сакратар ЦК ПАРП Э. Герэк, Генеральны сакратар ЦК КПЧ Г. Гусак, Генеральны сакратар ЦК КПСС Л. І. Брэжнеў, член Палітбюро, Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР М. В. Падгорны, член Палітбюро ЦК КПСС, першы сакратар ЦК КП Украіны П. Я. Шэлест.

Удзельнікі сустрэчы праінфармавалі адзін аднаго аб ходзе сацыялістычнага і камуністычнага будаўніцтва ў сваіх краінах. Пры гэтым было аднадушна адзначана ўзрастаючае значэнне вялікіх поспехаў, дасягнутых брацкімі сацыялістычнымі дзяржавамі, цеснага ўсебаковага ўзаемадзеяння паміж імі на аснове прынцыпаў марксізма-ленінізма і сацыялістычнага інтэрнацыяналізму. Удзельнікі сустрэчы выказалі глыбокае задавальненне тым, што ў адпаведнасці з асноўнымі задачамі і прынцыповымі напрамкамі развіцця сацыялістычнай эканамічнай інтэграцыі, вызначанымі кіраўнікамі камуністычных і рабочых партый і кіраўнікамі ўрадаў краін — членаў СЭУ на XXIII (спецыяльнай) сесіі Савета эканамічнай узаемадапамогі, XXV сесіі СЭУ аднагалосна прыняла комплексную праграму далейшага паглыблення і ўдасканалення супрацоўніцтва і развіцця сацыялістычнай эканамічнай інтэграцыі краін — членаў СЭУ. Рэалізацыя гэтай доўгатэрміновай праграмы будзе актыўна садзейнічаць вырашэнню задачы далейшага ўздыму жыццёвага ўзроўню працоўных, далейшаму ўмацаванню палітычнага і эканамічнага адзінства і згуртаванасці брацкіх краін сацыялізма і адыграе гістарычную ролю ў забеспячэнні новых перамог сацыялізма і камунізма, за ўмацаванне міру і міжнароднай бяспекі.

На сустрэчы былі закрануты актуальныя пытанні развіцця сусветнага камуністычнага руху, а таксама праблемы знешняй палітыкі, якія маюць узаемную цікавасць. Было падкрэслена, што ўвесь ход міжнароднага развіцця пацвярджае правільнасць ацэнак і вывадаў міжнароднай Нарады камуністычных і рабочых партый 1969 года, якія з'яўляюцца непахіснай асновай палітыкі брацкіх марксісцка-ленінскіх партый.

Жыццё пацвярджае гістарычнае значэнне нарады для далейшага ўмацавання адзінства сусветнага камуністычнага і рабочага руху на аснове марксізма-ленінізма, барацьбы супраць правага і левага апартунізму, для згуртавання ўсіх прагрэсіўных і нацыянальна-вызваленчых сіл у антыімперыялістычнай барацьбе.

Удзельнікі сустрэчы падкрэслілі вялікае значэнне праграмы міру, выстаўленай XXIV з'ездам КПСС і падтрыманай брацкімі камуністычнымі і рабочымі партыямі. Ажыццяўленне гэтай праграмы заклікана адыграць важнейшую ролю ў сапраўднай разрадцы міжнароднай напружанасці, у забеспячэнні міру і бяспекі народаў.

Значная ўвага ў ходзе абмену думкамі была ўдзелена пытанням умацавання еўрапейскай бяспекі. Ажыццяўляючы на практыцы ленінскую знешнюю палітыку, брацкія сацыялістычныя краіны выставілі шэраг буйных ініцыятыў, накіраваных на забеспячэнне трывалага міру ў Еўропе, і здолелі дабіцца пэўных пазітыўных зрухаў у развіцці еўрапейскай абстаноўкі. Удзельнікі сустрэчы выказалі перакананне, што карэнныя інтарэсы еўрапейскіх народаў патрабуюць актыўных крокаў па разрадцы напружанасці з боку ўсіх еўрапейскіх дзяржаў. Скліканне агульнаеўрапейскай нарады, ратыфікацыя дагавораў ФРГ з СССР і ПНР, урэгуляванне праблемы Заходняга Берліна, прызнанне мюнхенскага пагаднення несапраўдным з самага пачатку, скарачэнне ўзбраенняў і ўзброеных сіл ў Еўропе могуць і павінны стаць важнымі вехамі на шляху ўсталявання трывалага еўрапейскага міру.

Удзельнікі сустрэчы зноў выказалі цвёрдую і нязменную рашучасць аказваць усебаковую неабходную падтрымку гераічнай барацьбе народаў Індакітая супраць амерыканскай агрэсіі. Яны лічаць, што няўдачныя прапановы Часовага рэвалюцыйнага ўрада Рэспублікі Паўднёвы В'етнам аб мірным урэгуляванні канфлікту ў Індакітаі, выкладзеныя ў вядомых «7 пунктах», з якімі поўнасцю салідарызаваўся ўрад ДРВ, адпавядаюць карэнным інтарэсам усіх народаў Індакітая і з'яўляюцца справядлівай асновай аднаўлення міру і бяспекі ў Паўднёва-Усходняй Азіі.

У ходзе сустрэч была канстатавана поўная агульнасць поглядаў яе ўдзельнікаў у адносінах да падтрымкі справядлівай барацьбы арабскіх народаў за аднаўленне міру на Блізкім Усходзе і ліквідацыю вынікаў ізраільскай агрэсіі. Неадкладнае выкананне рэзалюцыі Савета Бяспекі ад 22 лістапада 1967 года з'яўляецца надзённай патрэбнасцю цяперашняга часу. Удзельнікі сустрэчы выказалі сур'ёзную трывогу ў сувязі з жорсткім тэрорам, абрушаным на Камуністычную партыю і іншыя дэмакратычныя арганізацыі ў Судане. Яны рашуча асуджаюць беззаконнасць і самавольства, якія ўчыняюцца суданскімі ўладамі, што выкарыстоўваецца сіламі імперыялізму і рэакцыі супраць інтарэсаў суданскага народа.

Удзельнікі сустрэчы падкрэслілі асаблівую важнасць барацьбы за далейшае ўмацаванне адзінства і згуртаванасці сацыялістычнай садружнасці, міжнароднага рабочага і камуністычнага руху, усіх антыімперыялістычных сіл для забеспячэння паспяховага ходу сацыялістычнага і камуністычнага будаўніцтва, усталявання прынцыпаў мірнага суіснавання ў адносінах паміж краінамі з розным сацыяльным ладам, для новых перамог рабочага класа і справы сацыялізма.

Сустрэча кіруючых дзеячоў брацкіх партый прайшла ў сардэчнай, сяброўскай абстаноўцы і характарызавалася поўнай аднадушнасцю і ўзаемаразуменнем па ўсіх закранутых пытаннях.

У сустрэчы ўдзельнічалі сакратары ЦК КПСС К. Ф. Катушаў і Б. М. Панамароў, члены ЦК КПСС К. В. Русакоў, Г. Э. Цуканаў.

ТЭАТР АБРАЗЦОВА У МІНСКУ

З вялікім поспехам праходзяць у Мінску гастролі Дзяржаўнага цэнтральнага тэатра лялек пад кіраўніцтвам народнага артыста СССР Сяргея Абразцова. Жыхары беларускай сталіцы пазнаёміліся з другой рэдакцыяй спектакля «Незвычайны канцэрт». На здымку вы бачыце сцэну з гэтага спектакля (канцэртны нумар «Апалон Перадзелкін»).

Фота Ул. КРУКА.

ПРЫНЕСЦІ РАДАСЦЬ ЛЮДЗЯМ...

ЗА АПОШНІЯ некалькі гадоў мы з'яўляліся сведкамі і ўдзельнікамі трох Усесаюзных мастацкіх латарэй.

Улічваючы крытычныя заўвагі і прапановы па выніках трох папярэдніх латарэй, Міністэрства культуры СССР і Саюз мастакоў СССР у гэтым годзе праводзяць IV Усесаюзную мастацкую латарэю, тыраж выйгрышаў якой адбудзецца ў лістападзе ў Маскве.

Аб грандыёзнасці гэтай латарэі гаворыць тое, што ў ёй будуць разыграны выйгрышы на суму 3.154.700 рублёў. Сярод выйгрышаў — творы жывапісу, графікі, скульптуры, дэкаратыўна - прыкладнога мастацтва, вырабы народных майстроў, экскурсійна - турысцкія пуцёўкі для азнаямлення з мастацкімі музеямі і помнікамі культуры ў буйнейшых гарадах СССР, Венгрыі, Польшчы, Балгарыі, камплекты мэблі для аднапакаёвых кватэр, выданні па пытаннях выяўленчага мастацтва і эстэтыкі.

Актыўны ўдзел у латарэі прымаюць беларускія мастакі. Сярод іх твораў нямала таленавітых. Хто не захоча мець у сябе на кватэры такія унікальныя рэчы утылітарнага і дэкаратыўнага прызначэння, як прыбор для віна і свяцільнікі для свечак С. Раудвез, сервіз «Лясны» А. Літвіненкі, сервіз «Бяседа» С. Мікушына, дэкаратыўны набор «Сутонне» і бакалы «Святочныя» К. Вакс, прыборы для віна «Ромб» і «Рэпка» В. Пракоф'ева, кафейны сервіз «Жолуд» В. Леантовіча.

Акрамя таго, можна выйграць прыгожыя пейзажы В. Цвірко, С. Каткова, Я. Красоўскага, В. Вярсоцкага, А. Гугеля, Л. Дударэнкі, Б. Зайцава, К. Харашэвіча, І. Пушкова, Л. Лейтмана, нацюрморты В. Сахненкі, Ф. Гумена, С. Катковай, В. Жолтак, В. Сумарава, якія цяпер экспануюцца ў выставачнай зале Саюза мастакоў БССР.

У фондзе латарэі ёсць шмат твораў і вядомых майстроў мастацтва Масквы, Ленінграда, саюзных рэспублік: Кукрыніксаў, Ю. Піменава, А. Пластава, Н. Рамадзіна, С. Чуйкова, Т. Яблонскай, І. Кузьмінскіса, В. Юркунуса, С. Красаўскаса, М. Дзерагуса, В. Толлі, Д. Мітрохіна, Ю. Васняцова, А. Сідоркіна, Л. Ільіной, В. Пачыталава, майстроў грузінскай чаканкі.

К. БОРЫН.

СТО РАДКОЎ з рэдакцыі

А ШТО, КАЛІ З АДКРЫТЫМ ЗАБРАЛАМ?..

КАЛЕКТЫЎ аднаго з нашых тэатраў раптам захваляваўся. Нехта пусціў чутку, што запрошаны на пастаноўку рэжысёр размяркоўвае ролі, у прыватнасці жаночыя, гасцюючы ў адной актрысы, карыстаючыся яе парадамі. Хіба з гэтым можна мірыцца! Чалавек парушыў элементарную тэатральную этыку, не палічыўся з думкай мастацкага савета. Усё робіць «яна». І імя называлася... Пра гэта гаварылі то цішэй, то на ўвесь голас у грыміровачных пакоях, у рэпетыцыйных запах, і ўсе нерваваліся, абураныя такім непрыстойным фактам, бо калектыў ніколі раней і ведаць не ведаў, што шлях да ролі можа праходзіць праз гасцінную кватэру хой сабе і адной з вядучых актрыс.

Нарэшце, прагучала пытанне: а хто сказаў, хто ведае той факт і можа адкрыта заявіць пра гэта? Хто! Ананім. Пачалося амаль следства: з чаго завязаўся ланцуг пагалоскі, дзе тая першакрыніца, што хавае твар пад забралам! І людзям стала сорамна і агідна за тое, што яны прынялі ўсур'ёз плётку. Так, плётку. Гэта высветлілася. І «аўтару» пагалоскі перад усім калектывам было зададзена пытанне, чаму ён, ведаючы пра элементарнае парушэнне тэатральнай этыкі, не звярнуўся ў дырэкцыю і ў грамадскія арганізацыі, а пусціў па трупе чутку! Аўтар спаслаўся на тое, што і сам ён гэта ад нагосьці пачуў, не праверыўшы, уголас «падзяліўся» з сяброўкай.

Інцыдэнт, як кажуць, быў вычарпаны. Таму, хто некалі цішком прамовіў «а», давялося сказаць і «б» — папрасіць прабачэнне не толькі ў пакрыўджаных, а і ва ўсяго калектыву.

Так ананімшчыцу вывелі на чыстую ваду, як кажуць, — за вуха ды на сонейка. Гэта будзе добрым і павучальным урокам не толькі для яе...

Сапраўды, ананімам часта ўдаецца выбіць сваю ахвяру з сядла. Тым больш, што мяшчане ахвотна падтрымліваюць ім. І ўсе мы гэта, як гаворыцца, тварэтычна ведаем, але мала калі даводзім справу да канца. І колькі энергіі, часу забірае ў нас натуральнае жаданне аспрэчыць паспешлівыя і бяздоказныя «паведамленні» ананімшчыка. Міжволі спрабуеш уявіць, што гэта за дзеяч такі, ён жа на словах быццам і хварэе за нешта, а фактычна паклёпнічае на людзей. Рэдка гэта бывае. Часам нехта адзін выплесне з сябе на паперу злосную небыліцу, і пачне гудзець калаўрот. І маўчаць тут—значыць, патураць ананімшчыку. Вось ужо ён пазваніў, скажам, супрацоўніку Упраўлення па справах мастацтваў Міністэрства культуры БССР і намякнуў, што актрыса Н. мыла бялізну рэжысёру Х., а той у падзяку даў ёй ролю. У Камітэт па дзяржаўных прэміях можа паступіць сігнал, што сярод кандыдатаў на атрыманне высокай узнагароды аказаўся адзін плагіятар або дружбан крытыка С., які нібыта ўжо даўно муціць ваду ў Саюзе пісьменнікаў. Потым будуць праверкі, камісіі, пасяджэнні. Высветліцца, што не, не было гэтага, і актрыса не мыла бялізну, і пісьменнік не з'яўляецца дружбаком крытыка С. Не было з чаго рабіць шум. Аднак ён быў. Творчага чалавека траўміравалі. Хай сабе на кароткі час, але кінулі цень на яго грамадзянскую і творчую рэпутацыю. А хтосьці па-абывацельску яшчэ сумняваецца: маўляў, дыму ж без агню не бывае...

Мірыцца з гэтым нельга. Клопат пра нармальную атмасферу ў творчых калектывах — на студыях, у рэдакцыях, у тэатрах—гэта не абарона «мундзіра». Без здаровых і дзелавых узаемавадносін паміж людзьмі поспехі не здабываюцца. Нездарма ж, напрыклад, у славутае «вучэнне Станіслаўскага» арганічна ўваходзяць дэталёва распрацаваныя этычныя нормы. Невыпадкова ў творчых саюзах арганізаваны секцыі, на якіх любы з нас мае магчымасць выступіць з самай рэзкай крытыкай калегі. З крытыкай і яго творчых здабыткаў або пралікаў, і асабістых паводзін. Толькі зацяты фарысей пазбягае трыбуны. Ён лепш пазвоніць па тэлефоне ў адпаведную ўстанову або «даверыць» плётку не вельмі патрабавальнаму сябру. Так нараджаецца паклёп, хоць ананімшчык не надта клапоціцца пра аргументацыю сваіх паведамленняў і выкрывальных заўваг. Праўда, потым усё праясняецца, стане на сваё месца. Але падазронасць зробіць сваё, пацешыць аматараў калідорных сенсацый.

На XXIV з'ездзе Камуністычнай партыі Л. І. Брэжнеў гаварыў, што не можа быць перамогі камуністычнай маралі без рашучай барацьбы з такімі яе антыподамі, як сквапнасць, хабарніцтва, дармаедства, паклёп, ананімка, п'янства і да т. п. Людзям творчай працы асабліва трэба заўсёды памятаць гэта. Не забываць, што наш грамадзянскі абавязак прадугледжвае рашучую барацьбу і з такімі з'явамі, як ананімка і ананімшчык.

ЯНКА МАЎР



3-га жніўня памёр Янка Маўр, адзін з заснавальнікаў беларускай савецкай дзіцячай літаратуры, старэйшы пісьменнік, заслужаны дзеяч культуры БССР.

Янка Маўр (Іван Міхайлавіч Фёдараў) нарадзіўся ў 1883 годзе ў г. Лібаве ў сям'і рабочага. У 1899 годзе паступіў у Панявежскую настаўніцкую семінарыю, з якой незадоўга да заканчэння яе быў выключаны за ўдзел у гуртку рэвалюцыйнай моладзі. Здаўшы экстэрнам экзамен на званне настаўніка пачатковай школы, працаваў памочнікам настаўніка ў Новым Месцы ў Літве, затым у в. Бытча, каля Барысава.

У 1906 годзе ўдзельнічаў у нелегальным з'ездзе настаўнікаў, за што быў звольнены з пасады і прыцягнуты разам з Якубам Коласам да следства. Пазбаўлены права працаваць настаўнікам, доўгі час знаходзіўся пад наглядам паліцыі і толькі ў 1911 годзе атрымаў пасаду выкладчыка гісторыі і геаграфіі ў Мінскай прыватнай гандлёвай школе.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі Янка Маўр вядзе педагагічную работу ў школах Мінска, працуе загадчыкам школьнага аддзела Наркамасветы БССР, прымае актыўны ўдзел у арганізацыі прафсаюза настаўнікаў, неаднаразова выбіраецца дэлегатам настаўніцкіх канферэнцый і з'ездаў.

Першыя творы Янкі Маўра—фельетоны і нарысы—з'явіліся ў друку ў 1923 годзе, а ў 1925 годзе часопіс «Беларускі піянер» надрукаваў яго першую аповесць «Чалавек ідзе».

За час сваёй літаратурнай дзейнасці Я. Маўр напісаў шмат твораў для юнага чытача, у тым ліку: «У краіне райскай птушкі», «Сын вады», раман «Амок», аповесці «Палескія рабінзоны», «Аповесць будучых дзён», «ТВТ», «Шлях з цемры», «Фантамабіль прафесара Цылякоўскага». Акрамя таго, ім напісаны шэраг апавяданняў, фельетонаў, памфлетаў, адрасаваных дарослым чытачам.

Большасць твораў пісьменніка перакладзена на рускую, украінскую і мовы іншых братніх народаў СССР, а таксама на мовы краін народнай дэмакратыі.

Янка Маўр—адзін з выдатных прадстаўнікоў савецкай дзіцячай літаратуры. Ён паклаў пачатак прыгодніцкаму жанру ў беларускай літаратуры. Кнігі Янкі Маўра, пісьменніка-камуніста, маюць вялікае пазнавальнае і выхаваўчае значэнне. Яны ўвайшлі ў залаты фонд нашай мастацкай літаратуры для дзяцей і юнацтва.

Шматгадовая літаратурная, педагагічная і грамадская дзейнасць Янкі Маўра адзначана высокімі ўрадавымі ўзнагародамі—двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэнам «Знак Пашаны» і медалямі.

Светлы вобраз Івана Міхайлавіча назаўсёды застанецца ў нашых сэрцах.

П. М. Машэраў, Ц. Я. Кісялёў, Ф. А. Сурганаў, А. Н. Аксёнаў, А. Т. Кузьмін, У. Е. Лабанок, У. Ф. Міцкевіч, М. Н. Полазаў, І. Я. Палякоў, А. А. Смірноў, Л. Г. Кляцкоў, У. І. Падрэз, І. М. Трацяк, М. І. Лагір, Я. П. Нікулкін, І. Ф. Клімаў, Н. Л. Сняжкова, А. Х. Асіпенка, Э. Агняцвет, П. У. Броўка, Я. Брыль, В. Вітка, В. А. Грамыка, А. С. Грачанікаў, П. Н. Кавалёў, М. І. Калачынскі, Р. В. Канавалаў, К. Ц. Кірэенка, У. У. Корш-Саблін, К. Кранціва, А. М. Кулакоўскі, М. Ц. Лынькоў, А. Я. Макаёнак, С. В. Марцэлеў, І. П. Мележ, М. Г. Мінкевіч, М. А. Мінковіч, Д. К. Міцкевіч, П. С. Пестрак, Л. Я. Прокша, М. Танк, М. Г. Ткачоў, В. Ф. Хомчанка, І. П. Шамякін, Р. Р. Шырма, А. І. Якімовіч.

ВАНДРОЎНІК, ШУКАЛЬНІК, ЛЕТУЦЕННІК

Памёр Янка Маўр, старэйшы наш пісьменнік, патрыярх беларускай дзіцячай літаратуры. Усе, хто ведаў яго, не маглі не адчуць, як глыбока разумеў ён сэрцы сваіх юных сяброў, незвычайна багаты свет нашых дзяцей.

Цікавы і дапытлівы, нястомны шукальнік, ён не змарнаваў ні аднаго дня, каб не спазнаць новае ў жыцці, не ўзбагаціць сваіх душэўных запасаў. Дзеля таго, каб сказаць патрэбнае і карыснае людзям, трэба шмат ведаць.

Янка Маўр шчодра раздаваў назапашаныя багацці сваёй душы усім, хто чытаў і чытае яго кнігі.

«Чалавек ідзе» — так называўся першы твор Янкі Маўра, з якога ён пачынаў свой літаратурны шлях. Гэта задушэўная гутарка пісьменніка са сваім чытачом, якая адкрывала яму таямнічыя старонкі далёкай гісторыі, і зараз будзіць фантазію, мацуе ўпэўненасць у сілу і розум чалавека.

Чалавек ідзе. Усё дзужэйшым становіцца яго шлях. Колькі мільёнаў год ён ужо ідзе? Як ён паявіўся на нашай планеце, як жыў і як стаў тым магутным волатам, што цяпер дастае да іншых планет? На гэтыя пытанні пісьменнік дае адказы юным чытачам у сваёй захапляючай кнізе.

Новым чытачам Янкі Маўра цікава будзе ведаць, што аповесць «Чалавек ідзе» была надрукавана ў 1925 годзе на старонках часопіса, які называўся «Беларускі піянер». Так Янка Маўр стаў адным з першых піянераў нашай літаратуры для юнацтва.

Часопіс, у якім упершыню выступіў пісьменнік, быў невялікі і адразу цалкам не змог змясціць усю аповесць. Яна друкавалася ў некалькіх нумарах. Прачытаўшы апублікаваны раздзел, чытачы не маглі дачакацца наступнага. Яны патрабавалі, каб рэдакцыя хутчэй друкавала працяг, звярталіся да самога аўтара, каб ён хоць у пісьме паведаміў, пра што будзе расказваць далей.

Такой прагнай зацікаўленасцю сустракалася кожная кніга пісьменніка. З году ў год яго творы набывалі ўсё большую вядомасць і славу.

За сваё жыццё Янка Маўр напісаў шмат кніг. Сабраныя разам, яны складаюць цэлую бібліятэку, паліцы якой займаюць «У краіне райскай птушкі», «Сын вады», «Амок», «Слёзы Тубі», «ТВТ», «Палескія рабінзоны», «Шлях з цемры», «Фантамабіль прафесара Цылякоўскага», апавяданні аб нашым жыцці, аб нашых савецкіх дзецях.

Па меры таго, як папаўнялася гэтая цудоўная бібліятэка, расла і павялічвалася колькасць яе чытачоў. Ужо некалькі пакаленняў людзей, успамінаючы сваё маленства і юнацтва, не абмінаюць добрым словам пісьменніка, які адкрыў ім цэлы свет — новы, таямнічы і захапляючы.

Першымі чытачамі Янкі Маўра былі нашы бацькі і мы, людзі, якім цяпер па 50—60 гадоў, пасля — нашы дзеці, цяпер яго чытаюць дзеці нашых дзяцей.

Кнігі Янкі Маўра ўзбагачаюць чытача глыбокімі ведамі. Пісьменнік у сваёй творчасці ўдала спалучаў навуковыя адкрыцці з самымі захапляючымі прыгодамі, з фантастыкай, з высокім гуманізмам. Любоўю да народа каланіяльных краін, спачуваннем іх гераічнай барацьбе за сваё вызваленне вызначаюцца ўсе творы Янкі Маўра — пісьменніка, вучонага, выдатнага публіцыста.

Ён быў старэйшым дзеячом савецкай літаратуры, якая ствараласе для юнакоў і дзяцей. Славутыя пачынальнікі яе, такія, як С. Маршак, К. Чукоўскі, як наш Янка Маўр, сталі любімымі пісьменнікамі не толькі ў нас, у Савецкім Саюзе, але далёка за яго межамі. Кнігі Маўра чытаюцца ў Польшчы, Румыніі, Чэхаславакіі, Кітаі і многіх іншых краінах свету.

Чалавек моцнай жыццёвай загартоўкі, заўсёды чуйны да ўсяго новага і светлага, непрымірымы да несправядлівасці, няшчырасці і фальшу, ён прэйшоў нялёгкі шлях, але ніколі і нідзе не адступіўся ад сваіх перакананняў. Калі вы сустракаліся з ім, наглядалі, як ён выступаў перад сваімі чытачамі, нельга было не здзівіцца яго душэўнай непасрэднасці, нават нейкай сарамлівасці, якая ўласціва толькі шчырым і добрым людзям. Калі даведаўшся з яго біяграфіі, што дваццацідвухгадовы юнак, выключаны з апошняга курса настаўніцкай семінарыі і занесены ў спісы палітычных злачынцаў, не толькі не спалохаўся царскіх наглядчыкаў, а стаў яшчэ больш актыўным удзельнікам рэвалюцыйнага падполля, дык з глыбокай пашанай думаеш аб такіх людзях, здольных на мужнасць, што вымяраецца высокай самаахвярнасцю чалавечага сэрца.

Сустрэўшыся ў 1906 годзе на падпольным з'ездзе беларускіх настаўнікаў, Янка Маўр знаёміцца з Якубам Коласам, стаўшы яго выпрабаваным другам на ўсё жыццё.

Такім мы ведалі нашага Янку Маўра. Праз суровыя цяжкасці і пакуты пракладаў ён дарогу ў жыццё. Але нават маленькі хлопчык Янка з аўтабіяграфічнай аповесці «Шлях з цемры» ў галоднай і халоднай хаце з дзіцячай даверлівасцю адкрывае для сябе свет сваіх радасцей.

Пісьменнік іранізуе над сваімі далёкімі перажываннямі, ён не можа схаваць добрай усмешкі. І ў гэтай шчырасці бачыш праўду жыцця, бачыш той аптымізм, які не пакідаў яго нават у самыя цяжкія часы.

Некалькі год таму назад пісьменніка была спасцігла вялікая бяда. Ён пачаў слепнуць. Усе мы з болем у душы бачылі, як з кожным днём траціцца яго зрок. Без праважатага ён ужо не мог перайсці вуліцу, а сваіх знаёмых пазнаваў толькі па голасе. Мы са страхам думалі аб яго няшчасці, і толькі сам ён спакойна кожнаму тлумачыў, што поўная слепата ўратуе яму зрок. Упэўненасць, з якой гэта гаварылася, не дапускала ніякіх пярэчанняў. Будучы зусім сляпым, ён ні на хвіліну не падаваўся адзіноце. Як і раней, мы бачылі яго і на сходах, і на творчых сустрэчах. Ён адчуваў сябе патрэбным сваім сябрам, якія заўсёды былі рады свайму старэйшаму таварышу і настаўніку. Маўрава вытрымка і ўпэўненасць перамаглі і на гэты раз. Пасля складаных і тонкіх хірургічных аперацый пісьменнік, як ён сам сцвярджаў, зноў нарадзіўся на свет.

Але доўгая хвароба, цяжар пражытых гадоў з дня ў дзень падточвалі здароўе пісьменніка. І вось яго не стала. Але кнігі, якія ён напісаў, будуць жыць. І яшчэ не адно пакаленне юных і дарослых людзей будуць чытаць іх з цікавасцю і захапленнем.

Васіль ВІТКА.

Праўленне Саюза пісьменнікаў БССР з глыбокім смуткам паведамляе аб смерці вядомага беларускага пісьменніка, заслужанага дзеяча культуры БССР Янкі МАЎРА (Івана Міхайлавіча Фёдарава) і выказвае шчырае спачуванне сям'і і ўсім блізкім нябожчыка.

Калектыў супрацоўнікаў Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР глыбока смуткуе з прычыны смерці вядомага беларускага пісьменніка Янкі Маўра (Івана Міхайлавіча Фёдарава) і выказвае спачуванне родным і блізкім нябожчыка.

У сталіцы нашай рэспублікі гастралюе Тбіліскі рускі драматычны тэатр імя Грыбаедава. У яго рэпертуары — трагедыя В. Карастылёва «Крокі камандора», «Не турбуйся, мама» Н. Думбадзе, п'есы Розаева, Арбузава, Дэльмара, Алёшына.

Сустрэча грузінскіх артыстаў з беларускімі калегамі. Злева направа—народны артыст БССР Л. Бражнік, заслужаны артыст Грузінскай ССР А. Левін, народная артыстка СССР Л. Александроўская, артыст В. Страмоўскі, заслужаная артыстка Грузінскай ССР М. Кебадзе, народны артыст Грузінскай ССР М. Пясецкі.



Анатоль ДЗІК

НА РЫШТАВАННЯХ

НАРЫС

ВАЛОДЗЯ клаў цагліну за цаглінай і ўсё азіраўся на Радзіна. «Што ён тут згубіў? Разглядае рыштаванні, як быццам першы раз бачыць... Звычайныя яны, шарнірна-панельныя... Знаёмыя, як свае рукі». А Радзін дастаў тым часам з кішэні складны метр, яшчэ раз абмераў гэтыя рыштаванні, насупіў шырокія светлыя бровы, сеў на стосік цаглін і закурыў. Курыў, і ўсё жмурыўся, нешта думаў, запісваў у запісную кніжку.

— Што, Мікалай Васільевіч, незадаволены, быццам астаткі ў печ укінулі?—не ўцерпеў Александровіч.

— Ты ведаў Мароза з першага будтрэста? — пытаннем адказаў Радзін. — Дык вось—няма яго ўжо. А ўсё з-за гэтых шарнірна-панельных... Быў чалавек, добры цясляр—і няма. Спатыкнуўся на цагліну, а агараджэння не было—паляцеў з восьмага паверха...

Пасля ўчарашняй выпіўкі ў Валодзі было мутарна на душы. Вялі рукі, не слухаліся.

— Забутуй сярэдзіну кавалкамі... —кінуў падсобніцы па сцяну, а сам падышоў да Мікалая Васільевіча.—От, каб гэтыя рыштаванні мелі жорсткую агароджу, дык лепшых і не трэба. А то кожны раз прыбівай, адрывай... Ужо часам і прыбіваць няма чаго, спаткуецца дошка на тырсу. А хто і ляпуецца.

— Прычын многа, а вынік адзін—загублена жыццё чалавека... Тут трэба не драўляная агароджа... Каб металічнае што прыдумаць. Склаў, як партсігар, — вязі. Трэба збіраць — расклаў: тут табе і пляцоўка, тут і борцік.

— О, каб так прыдумаць, было б здорава!—захапіўся і Валодзя, нават пранаў з твару сонны выраз.

— Давай удваіх і будзем мазгаваць, га?—прапанаваў Радзін.

— Што вы, Мікалай Васільевіч! З маёй адукацыяй, з маёй галавой...

— Галава як галава. Калі без градусаў... Колькі ты класаў скончыў?

— Скончыў то дзесяць, але вучыўся так сабе. Да арміі яшчэ трохі што помнілася, а цяпер і той лад згубіў. Матэматыка—цёмны лес...

Пачаўся абедзенны перапынак. Міма да бытовак ішлі рабочыя, ляпалі Валодзю па плячах, па спіне: «Ну, чаго стаіш? Абед!»—«Хадзем, стукнем партыю ў касцяшкі!» Адмахнуўся ад іх:

— Ідзіце, нешта не хочацца... На яду не глядзеў бы здаецца...

Мікалай Васільевіч уважліва паглядаўся ў яго твар.

— І часта ты вось так... бастуеш?

— Не-а... Учора на вяселлі перадаў крыху.

— Што—і сёння пойдзеш, «паддасі»?

— Запрашалі вечарам апахмяляцца...—пачырванеў Валодзя.

— Ну, даражэнькі, гэта нікуды ня варта...—у голасе інжынера дакор і незадавальненне.—Мы ўсе не святыя, бывае, што возьмеш чарку на якой бяседзе. Але калі пачнеш пахмяляцца, то гэта ўжо да дабра не давядзе... Чым ты паогул на вечарах займаешся?

— А-ат... так усё... Туды-сюды... Кіно, танцы.

— І «па рубліку»?..

— Бывае...—яшчэ больш заліўся чырванню Александровіч.

— Транжырыш лепшыя гады... Потым будзеш сябе за локаць кусаць, ды не дастанеш. Паступай у педагагічна-індустрыяльны тэхнікум—я там вучуся на завочным.

— Я, канечне... З ахвотай... Але чорт яго экзамены здасць!

— Вось табе першае заданне па рускай мове.... Прастаў прапушчаныя літары ў сказах. А гэтыя назоўнікі напішы ў множным ліку...

Александровіч падцягнуў да сябе лістоў паперы з заданнем.

«Малайчына ўсё-такі, прыйшоў...— думаў пра яго Радзін.—І пра апахмелку забыў... Шанцуе мне на Валодзяў...»

Пакуль Александровіч пацеў і чмыхаў носам над заданнем, думкі Радзіна луналі далёка. Успомніўся яму яшчэ адзін Валодзя, Валодзя Шульчанка... Даўнавата гэта ўжо было, як яшчэ хадзіў у камсамольскіх сакратарах будаўнічага ўпраўлення № 21 пятага трэста. Тады яшчэ яго не звалі Мікалаем Васільевічам — проста Коля Радзін...

Тады ён таксама сядзеў за гэтым сталом, у гэтай невялікай зале, дзе праходзілі ўсякія лятучкі і нарады. Перад ім з'явіўся Валодзя Шульчанка і, збіваючыся, пачаў расказваць пра сваю адысею. Адседзеў за хуліганства ледзь не тры гады, выпусцілі датэрмінова за добрую працу. Прыйшоў зноў у тое ж самае ўпраўленне на работу. А начальнік на дыбы: «Мне патрэбны сумленныя рабочыя, а не хуліганы. І не прасі—не возьму! Ідзі лепш у другое ўпраўленне, дзе цябе ніхто не ведае». — «Я хачу тут чалавекам стаць, дзе зняславіў сваё імя!»—настойваў Шульчанка. «Не траць дарэмна часу!»—сказаў, як адрэзаў. Але Шульчанка не з тых, хто адразу і спасуе. Пайшоў у брыгаду, дзе працаваў да зняволення, заручыўся яе падтрымкай. Праўда, і там знайшоўся адзін. «Не трэба нам такіх! Адгадаваў кулакі з парасячую морду, яшчэ і нам сківіцы пакрышыць!» — кіпяціўся рыжы чалавечак. Валодзю і праўда, хацелася стукнуць гэтаму плюгаваму, але знарок засунуў глыбока рукі ў кішэні. Толькі слёз не стрымаў, самі пасыпаліся... «Затнісь, — Памагу. Цяпер сакавік, часу яшчэ шмат да наступлення, будзем займацца.

— У мяне не толькі з матэматыкай. І з рускай мовай...

— І рускую паштудзіруем. Заходзь пасля работы да мяне ў кантору. Ведаеш, дзе мой стол?

— Так вось... адразу?

— А нашто раскачка? Гэта ж не на арэлях.

...У бытоўцы Валодзю абступілі рабочыя.

— Пра што гэта вы так шчыранька?—папытаў брыгадзір Грыша Котаў.

— Вучыцца раіць. На буксір бярэ...

— А ты ўпарціўся, у хамут б'еш? Дурань... Ён жа хоча з цябе чалавека зрабіць. Не аднаго вісуса ўжо на пуць паставіў...

— У яго ўжо сям'я, а вучыцца! Інжынерам паставілі па тэхніцы бяспекі!.. А «інжынер Уладзімір Александровіч»—хіба не гучыць?!—усур'ёз і жартам загаманілі рабочыя.

— Сціхніце, у мяне і так галава трашчыць..— узмаліўся Александровіч.

ВЯРНУЎШЫСЯ ў кантору, Мікалай Васільевіч дастаў са стала стос папер. На іх у розных ракурсах былі вычарчаны шарнірна-панельныя рыштаванні. Каб іх пярун высмаліў!.. І добрую рэч прыдумалі, але каб сказаць ужо і «б», каб агароджу складную прырабіць — глуздоў не хапіла...

«У транспартным становішчы, пры перавозках, панелі і павіны выглядаць панелямі—плоска... А паставіў у рабочым становішчы борт, як у кузаве аўтамашыны.. Ага, стоп, стоп! Тут штосьці ёсць... Падняў, зашплінтаваў... Так? Думай, думай...»—рука з алоўкам нешта пісала, перакрэслівала, вычэрчвала нанова...

— Я не перашкодзіў, Васільевіч?—пачуўся нясмелы голас.

— А-а, ты... Сядай, калі ласка. Ты перакусіў? А то мо засядзімся... Ды распранайся, тут цёпла!

Валодзя рабіў усё замаруджана, як бы ў роздуме: а ці сюды ён трапіў? Мо варта не расседжвацца, а сабрацца ды... лататы?

— Вось табе першае заданне па рускай мове.... Прастаў прапушчаныя літары ў сказах. А гэтыя назоўнікі напішы ў множным ліку...

Александровіч падцягнуў да сябе лістоў паперы з заданнем.

«Малайчына ўсё-такі, прыйшоў...— думаў пра яго Радзін.—І пра апахмелку забыў... Шанцуе мне на Валодзяў...»

Пакуль Александровіч пацеў і чмыхаў носам над заданнем, думкі Радзіна луналі далёка. Успомніўся яму яшчэ адзін Валодзя, Валодзя Шульчанка... Даўнавата гэта ўжо было, як яшчэ хадзіў у камсамольскіх сакратарах будаўнічага ўпраўлення № 21 пятага трэста. Тады яшчэ яго не звалі Мікалаем Васільевічам — проста Коля Радзін...

Тады ён таксама сядзеў за гэтым сталом, у гэтай невялікай зале, дзе праходзілі ўсякія лятучкі і нарады. Перад ім з'явіўся Валодзя Шульчанка і, збіваючыся, пачаў расказваць пра сваю адысею. Адседзеў за хуліганства ледзь не тры гады, выпусцілі датэрмінова за добрую працу. Прыйшоў зноў у тое ж самае ўпраўленне на работу. А начальнік на дыбы: «Мне патрэбны сумленныя рабочыя, а не хуліганы. І не прасі—не возьму! Ідзі лепш у другое ўпраўленне, дзе цябе ніхто не ведае». — «Я хачу тут чалавекам стаць, дзе зняславіў сваё імя!»—настойваў Шульчанка. «Не траць дарэмна часу!»—сказаў, як адрэзаў. Але Шульчанка не з тых, хто адразу і спасуе. Пайшоў у брыгаду, дзе працаваў да зняволення, заручыўся яе падтрымкай. Праўда, і там знайшоўся адзін. «Не трэба нам такіх! Адгадаваў кулакі з парасячую морду, яшчэ і нам сківіцы пакрышыць!» — кіпяціўся рыжы чалавечак. Валодзю і праўда, хацелася стукнуць гэтаму плюгаваму, але знарок засунуў глыбока рукі ў кішэні. Толькі слёз не стрымаў, самі пасыпаліся... «Затнісь, аршын з шапкаю! Сам летась сядзеў пятнаццаць сутак...»—атушылі гарачку рыжага рабочыя. Гэта яны і параілі схадзіць яшчэ і да Колі Радзіна...

Пагаварыў тады Мікалай Васільевіч з ім.

— Бацькі ведаюць, што выпусцілі ўжо?

— Няма каму ведаць... Дзетдомаўскі я... Ёсць нейкія сваякі—дзесятая вода на кісялі! Але ні яны мною не цікавяцца, ні я імі.

— А-а... дзяўчына ёсць? Куры, не саромся...—падсунуў яму Радзін пачак з цыгарэтамі.

— Была... Пасадзілі, дык праз тыдзень за нейкага вайскоўца выскачыла замуж.

Валодзя Шульчанка адказваў тады на пытанні таропка, збіваючыся, нібы чакаў, што яго пераб'юць, не выслухаюць да канца.

Параіў яму пакурыць з гадзіну, пачакаць, пакуль ён сходзіць на перагаворы з начальнікам упраўлення. Ішоў сам да начальніка, і ўспаміналіся пра яго анекдоты, былі і небыліцы. Праграб Мілашэўскі пераманіў быў да сябе арматуршчыка—хоць «па насенне», каб другіх падвучыў, сказаў ісці да Аркадзя Сямёнавіча афармляцца. Дык арматуршчыку таму начальнік тры разы соваў назад заяву—«Адчаіся! Во прыстаў...» А Мілашэўскаму сказаў, выскачыўшы на калідор: «Слухай, каго ты прыслаў да мяне? Што гэта за спецыяльнасць—арматуршчык? Ён мяне да інфаркта давядзе!» Давялося тлумачыць начальніку будаўнічага ўпраўлення, што гэта за спецыяльнасць — арматуршчык, што чалавек гэты пазарэз трэба. Другі раз Аркадзь Сямёнавіч хацеў на людзях праявіць клопаты аб будаўніках. «Слухай, Фенько,—сказаў брыгадзіру,—што трэба тваёй брыгадзе, каб работа ішла хутчэй? Гарыць план па ўпраўленню...»—«Машына дошак дзюймовак»—адказаў той. «Слухайце, што ён гаворыць, што вам трэба?»—папытаў, не зразумеўшы, у рабочых. Тыя адказалі ледзь не хорам: «Машыну дошак-дзюймовак!»—«Што вы, як граі заладзілі: дзюймоўкі, дзюймоўкі... Вы скажыце, тоўстая гэта дошка ці тонкая!»—закіпяціўся Аркадзь Сямёнавіч.

І вось да гэтага начальніка давялося ісці Радзіну хадайнічаць за Шульчанку.

— Што вы з ім носіцеся, як курыца з яйкам! Тут не дзіцячы сад, а салідная арганізацыя. Зноў будуць усюды памінаць дваццаць першае будаўнічае ўпраўленне. Мяне ўспамінаць! З-за гэтага рэцыдывіста! Мне вымовы ляпіць, а не табе!

— Ну, дапусцім, апошнюю вымову атрымалі за тое, што не падпісалі загад, каб ітэраўцы і рабочыя атрымалі прэміі. А самі яшчэ месяц назад палучылі сваю долю прэміі за здадзеныя аб'екты.

— Я падпішу той загад, сёння ж. А Шульчанку не вазьму!

— Шкада, што мы не зразумелі адзін аднаго, і давядзецца яшчэ ісці ў партком...—Радзін падняўся.

— Ну, чаго ты адразу ў партком? Мы ж і самі можам дагаварыцца...—схапіў яго Аркадзь Сямёнавіч за рукаў.—Раз вы просіце—я вам веру. Хай працуе. Можа ён і направу стаў людзь... э-э... чалавекам.

Шульчанка прыйшоў на работу ў сваю брыгаду. Не пазнаць было хлопца: і ў рабоце першы, і футбольную каманду арганізаваў, стаў яе капітанам. Праз некаторы час сам Мікалай Радзін рэкамендаваў яго ў члены ВЛКСМ.

Будавалі тады за лік сэканомленых матэрыялаў кароўнік падшэфнаму калгасу. Дык Шульчанка прапанаваў:

— Давайце зробім для калгаса футбольнае поле, валейбольную пляцоўку, турнік паставім, пару камплектаў гарадкоў завязем. А потым будзем снаборнічаць з сельскімі хлопцамі. І канцэрт маглі б ім паказаць. Паставім «Збянтэжанага Саўку» Родзевіча, а?

І паставілі. Героем вечара быў Шульчанка—Саўка. Вельмі ж у яго ўсё натуральна атрымлівалася! З таго часу калгаснікі запрошвалі сваіх шэфаў на дажынкі, на наваселлі...

Так і ў армію пайшоў Шульчанка—зусім інакшым чалавекам.

...— Мікалай Васільевіч. — падаў голас Валодзя Александровіч.—Усё!

— Выканаў? Ну-к, зазірнем у твае паперкі...—Радзін надзеў акуляры.— Гм... Памылак у цябе больш, чым я чакаў: «Инженер» у рускай мове праз «е» пішацца... «Гостиница» і «юность» праз адну «н»... У мяжным ліку трэба пісаць «доньи морей и океанов», а не «днища». Дніща ў караблёў, лодак... І гэтак, браце, далей... Але, дарагенькі, не трасі лыткамі... Падбярэм падручнікі і будзем займацца. А мне, думаеш, лёгка было ў трыццаць пяць гадоў пайсці ў пяты клас вячэрняй школы? Сеў за парту, а калені над бараду. І смешна, і грэшна, і няёмка... Азірнуўся—не, не я адзін такі. І старэй за мяне ёсць дзядзькі, і вышэй. Так і васьмігодку скончыў, і ў тэхнікум паступіў... Пасля трох з палавой курсаў запрасілі мяне на пасаду інжынера на тэхніцы бяспекі ў наша ўпраўленне. Ну і во... Тружусь, як кажуць па-руску...

— У вас жа яшчэ усякіх нагрузак многа, па грамадскай лініі... Я не справіўся б! Хлопцы казалі, што ў вас грамат ноўна за гэтага «Будаўніка».

— Я не за граматы працую рэдактарам... Трэба! Хочацца бліжэй да вытворчасці быць. І цяпер я пра розныя прафесіі, участкі работы ведаю з першых рук, усе сакрэты спецыяльнасцяў для мяне не сакрэты. Мураваў, цеслярыў, бетанаваў... Ведаеш жа, колькі ўсякіх работ у комплекснай брыгадзе. І слесарам у аддзеле галоўнага механіка працаваў...

— Як пагляджу, дык у вас усё робіцца з нейкім прыцэлам...—уздыхнуў чамусьці Валодзя.

— Прыцэл, як ты кажаш, ці мэту трэба заўсёды мець перад сабою. Калі, зразумела, не рабіць кар'еру, дзеля кар'еры... Мэта ёсць—і жыць цікавей... Дый сам ты гэта скора па сабе адчуеш. Ну, а цяпер вазьмі заданне на дом...

Развіталіся позна вечарам амаль сябрамі.

РАДЗІН чакае кожную суботу і пядзелю, як нашу нябесную. Па нагрузцы яны мо цяжэйшыя ў яго, чым іншыя дні тыдня. Але лічыцца—выхадныя...

А пачынае «засядаць» над кнігамі і чарцяжамі яшчэ з вечара ў пятніцу. «Борт у аўтамашыны... Тут ёсць пра што падумаць... Толькі трэба, каб рашотка агароджы адкідвалася ўніз і наглуха прышплінтоўвалася спадыспаду... Тады гэтыя шарнірна-панельныя рыштаванні лёгка будзе перавозіць, выкарыстоўваць шмат разоў. Эканомія сродкаў можа атрымацца немалая...»—не пакідаюць думкі пра адно.

— Коля, клаўся б ты... А то скора і ног не пацягнеш...—падышла паціху жонка.

— Заўтра субота, трошкі пазней устану... Тут якраз наклёўваецца адна штука—потым табе раскажу...

Жонка адыходзіць. Мо пакрыўдзілася, што не паслухаў? «Галоўнае, каб уніфіцыраваць дэталі, памеры... З чаго рабіць агароджу? З арматуры? Непрыгожа і цяжка... А калі з трубак? У капеечку ўляціць... Але лёгка, зручна, трывала... Цікава, а наколькі ўсё-такі даражэй будзе...» — зноў падлікі, падлікі...

Ён забірае настольную лямпу, на дыбачках перабіраецца на кухню. Хай спяць. За другім заходам забраў чарцяжы, алоўкі...

На твары яго блукала летуценная, дзіўнаватая ўсмешка. Ім авалодала ўжо натхненне. «Тры варыянты прыкіну... А параўнаць ужо потым можна будзе, лепшы ўзор і ўкаранім...»

ВАЛОДЗЯ АЛЕКСАНДРОВІЧ заскочыў у прарабскую, нахаду дажоўваючы кавалак. Брыгадзір Котаў і прараб Дабрыцкі аб нечым задумліва гутарылі, разглядваючы чарцяжы.

— Вы заняты... А я думаў...

— Дажуй спачатку і гавары ясней.—сказаў Дабрыцкі.

— Міхаіл Міхайлавіч, я хацеў, каб вы кінулі вокам на маю пісаніну. Ці добра тут усё са знакамі прыпынку...

— Што—запрог цябе Радзін? А што я казаў! Чалавекам будзеш...— скаліў зубы Грыша Котаў.

А Дабрыцкі тым часам прагледзеў Валодзева хатняе заданне. Гаварыў, як сам з сабою:

— Некалі Радзін прыставаў усё— «Пакажы ды раскажы...» Хацеў усё сам памацаць, пакаштаваць на зуб... Ну, што ж, пякенька, Валодзя. Дужкі толькі прапусціў у адным месцы, а ў другім двухкроп'е не паставіў. Спяшаешся, мабыць, няўважліва робіш. Колькі ўжо з табою Радзін займаецца?

— Скора тры месяцы. Ганяе да сёмага поту.

— А як ты думаў? Узяўся за гуж, то... Радзін такі.

Пайшоў Валодзя ад іх задаволены.

Пасля абеду на аб'ект заявіўся Радзін.

— Котаў, ты куды глядзіш? Чаму такелажніцы працуюць без касак?— наваліўся ён на брыгадзіра.

— Ой, не вінаваты ён. Мы самі... Лета, душна, дык хочацца, каб...

— Кап, кап, а там і добра грукне па макаўцы. Каб я больш такога самавольства не бачыў. Інакш не буду дапускаць да работы. А табе, Котаў, запішу папярэджанне...

Дзяўчаты зашушукаліся: «Не з той нагі ўстаў...»—«О, ён заўсёды такі! Не дасць спуску нікому...»

Радзін хадзіў па аб'екце доўга, прыдзірліва аглядаў рабочыя месцы мулярыў, цесляроў, бетоншчыкаў. Агледзеў, ці правільна складваюцца матэрыялы... Спыніўся пад вежавым кранам, дастаў з кішэні штангель-цыркуль, замерыў дыяметр стропаў... Котаў паглядаў услед і перавяваўся: «Якога чорта...»

— Вось што... Працаваць гэтымі тросамі забараняю. Бачыш?—паказаў брыгадзіру на стропы.—Пасярэдзіне яны расцягнуліся і сталі намнога танчэй, чым з канцоў. Новыя ёсць?

Котаў памяўся, пераступіў з нагі на нагу.

— Ёсць, не хітры. Я ведаю, ты чалавек запаслівы. Замяніце!

Брыгадзір уздыхнуў і пайшоў да будкі-склада.

НЕЯК У КАНЦЫ лета Радзін захварэў. Сядзеў дома, на бюлетэні. Але не скажаш, каб адлежваўся—чытаў, думаў... Нехта нецярпліва пазваніў і раз, і другі. Адчыніў дзверы—Александровіч! Твар усхваляваны, расплываецца ад усмешкі.

— Віншуйце! Мікалай Васільевіч, ура! Здаў уступныя экзамены ў тэхнікум! Залічылі!—і пайшоў на нако! выстукваць лязгінку—«Трай-ля-ля-лі, ля-ля-ляй-ля!»

Многа ў гэты дзень яны шчыра гаварылі, смяяліся, жартавалі. Валодзя адкрыў для сябе ў Радзіне яшчэ адну рысу: любіць ён усё жывое, прыроду. Поўная кватэра усякіх вазонаў, рыбкі ў прыгожым акварыуме. А якія цікавыя гісторыі расказвае ён пра гэтых рыбак ці кактусаў! У Мексіцы нават гарэлку з кактусаў гоняць—кактусоўку. Не ўцерпеў Валодзя, гмыкнуў, а Радзін уважліва паглядзеў—як рэагуе на такія факты Александровіч?

Успомнілася Валодзю адна гісторыя, расказаў яе знаёмы арматурнічык. Вязаў некалі той з Радзіным арматуру пад градзірню на Мінскім мясакамбінаце. У абедзенны перапынак Радзін, як звычайна, засеў за кнігу. І раптам падхапіўся, палез у густое хітраспляценне рабрыстых прантоў—аж на дно градзірні. «Які на яго крут уссеў?—дзівіліся з Радзіна рабочыя. — Яшчэ шыю зломіць...» А Радзін злавіў нешта на дне і, чухаючы набітае калена, выбраўся наверх. Яшчарка! Панёс яе падалей ад градзірні, выпусціў з берэта пад яблыні, што раслі на камбінатаўскім двары. І ў далоні папляскаў, і нагою прытупнуў: «А ту-ту! Жыві!» А рабочым, падыпоўны і бянтэжачыся, сказаў:

— Бетанаваць заўтра будзем дно градзірні. Нашто ж жывую істоту замуроўваць навечна?

Валодзя адагнаў успаміны, дастаў з кішэні загорнутага ў бліскучы цэлафан драўлянага зубра.

— Хай гэта вам будзе... На памяць!—і засаромеўся.

— Дзякую, Валодзя... А я табе падручнікі з першага курса аддам, канспекты. Спатрэбяцца!

У БУДТРЭСЦЕ № 5 ацанілі агароджу, прыдуманую Радзіным, як вынаходніцтва, і накіравалі чарцяжы ў Маскву.

Што яшчэ? За тры гады работы Мікалая Радзіна інжынерам па тэхніцы бяспекі ва ўпраўленні не зарэгістравана ніводнага няшчаснага выпадку, ніводнай сур'ёзнай траўмы.

Кажуць, што цяпер Мікалай Васільевіч мае ўжо новага пацыента, выводзіць у людзі. Узводзіць яшчэ адны рыштаванні, каб перарабіць, перавыхаваць чалавека...

БУДЗЕМ ЗНАЁМЫ:

Анатоль ШУШКО

Вось чатыры вершы, падпісаныя незнаёмым прозвішчам — Анатоль Шушко. Хто ён, аўтар гэтых вершаў?

Яму—семнаццаць гадоў. Жыве ён у вёсцы Сташаны на Піншчыне. Сёлета скончыў школу і збіраецца паступаць на філфак БДУ.

У яго, як кажуць, усё яшчэ наперадзе. Але, мяркуючы па вершах (не толькі па тых, што сёння друкуюцца, але і па тых, якія ён дасылаў у рэдакцыю), у яго ўжо ёсць і пэўны набытак. Ён ведае ўжо і радасць натхнення, і задавальненне ад удач, калі жыццё і паэзія яднаюцца ў пластычным вобразе. У яго вершах, мабыць, невыпадкова конь Каліноўскага «гарачаю падковай» выкрасае «барвовы агонь» з камянёў дарогі, на хмельным палескім вяселлі «ў дзявочых мяккіх хустках схаваўшы твар, кум п'яны, плача»; ён шукае адкрыццё «народнай сцяжынцы ў жыцці», сваё радаслоўе выводзіць ад трывушчых продкоў...

Зусім лёгка паказаць і ягоныя пралікі, але над усім прабіваюцца — і з гэтым, мабыць, пагодзіцца кожны, хто прачытае сёння ўпершыню вершы маладога паэта — нясмелымі, але выразнымі ігеньчыкамі рысы асабістасці, уласнага светаадчування. І можна, не памыліўшыся, сказаць: у душы гэтага юнака жыве паэзія.

Так, у вершах Анатоля Шушко ўдачы суседнічаюць з няўдачамі. І гэта зразумела для яго ўзросту і літаратурнага вопыту. Ідэйні школьнік, ён толькі пачынае яшчэ акрэсліваць сваё месца ў жыцці, у часе, у паэзіі. Толькі-толькі... Наперадзе — тая, што не кожнаму па сілах, дарога: да творчых удач і радасцей трэба ісці праз шуканні, расчараванні, пакуты, трэба гартаваць волю і характар, прывыкаць да перагрузак сэрца і розуму. На гэтай дарозе можна збочыць і збіцца, дазволіўшы сабе расслабленасць і палёгку, можна здрадзіць у пошуку лёгкага поспеху, пайсці вузкай сцяжынкай, адасобленай ад нашых агульных клопатаў і спраў, ад часу, ад грамадства.

Але хочацца верыць, што малады паэт, чыё прозвішча дасёння было невядома чытачам, выбера шлях самы цяжкі і адказны, і толькі на гэтым шляху ён знойдзе сябе, здабудзе нямала творчых радасцей. Пра гэта мы пісалі Анатолю з рэдакцыі. Пра гэта мы яшчэ раз нагадваем яму зараз, віншуючы з першай публікацыяй і жадаючы поспеху на яго творчай дарозе.

Варлен БЕЧЫК, Мікола ГІЛЬ.

КАМЯНІ

Вы—нібы здані над зямлёю
Далёкіх прадзедаў глухіх,
З іх невыказнаю тугою,
З глухой жальбой і болем іх.

О, камяні!—нямыя жорны
Імхом зарослай цішыні,
Няўжо і дух іх непакорны
У вас, у чэрствых, не пранік?

Няўжо гарачаю падковай
Конь Каліноўскага парой
З вас больш не высеча барвовы
Агонь?.. Няўжо...
Няўжо спакой!?.

О, камяні! Якая сіла
І хто вас можа абудзіць?
Вы, як пагаслыя свяцілы...
Няўжо навек, няўжо не жыць!?.

ПАЛЕСКІЯ ВЯСЕЛЛІ

І палазы рыпяць нацята,
І сіні лёд, і вецер хлёсткі,
Зямля дрыжыць,
нібы вібратар —
Звон бомаў узрывае вёску.

І вусны ловяць снег на вуснах,
Ужо салодкі і гарачы,
І у дзявочых, мяккіх хустках
Схаваўшы твар,
кум п'яны плача...

Вяселлі, хмельныя вяселлі!
Па ўсім Палессі гоман, гоман!
І ў гэтай снежнай каруселі
Твар маладой такі знаёмы...

АБ АДКРЫЦЦЯХ

Імкнемся да адкрыцця,
Часцей усяго не знаходзім,
Яно у крывінках жыцця
Такое няўлоўнае ходзіць.

Адчайна шукаем, але
Зрабіць адкрыццё не проста,
Як зайцу быць крышку смялей
Ці карліку большым ростам.

Таму, каб пазбегнуць няўдач,
Мы часта у памяць вяртаем
Маленства, дзе нават плач
Па-новаму адкрываем.

Дзе ўсё, як шчаслівы сон,
Дзе матчына песня — сімвал
Далёкіх і блізкіх часоў,
Выток іх чароўнай сілы.

І можа таму заўжды,
Калі ўсё ж і зробім адкрыццё,
Знаходзім яго сляды
На роўнай сцяжынцы ў жыцё.

ДЗЯДЫ

Прысвячаецца майму дзеду К. К. ШУШКО.

Нашы дужыя продкі,
Прадзеды і дзяды,
Адкуль былі яны родам,
Дзе іх маленства сады?
Дзе іх выток бурлівы?
Што прывяло сюды?..
«Сташаны —
будзеш шчаслівы —
Кажуць з усмешкай дзяды. —
Сташаны — сабе быць панам,
Панам жа ў вочы хрэн.
Прыгожы куток — Сташаны,
Дубком маладым акрэп»...

Туман — вартаўнік ссівелы,
Бы дзеда майго барада,
Рукою пяшчотнай белай
Па майскіх правёў садах...
Адкуль жа вы родам,
прадзеды?
Дзе ваш выток жыцця? —
Маленства з надзеяй,
з радасцю
Імкнецца да адкрыцця.
Сташанам крыху больш сотні,
Ну, акурат, ваш век...
Дзед мой — вясковы плотнік,
(Цудоўны быў чалавек!)
Сказаў мне аднойчы: «Ўнучак,
Ты бачыш світаннем сны?
Над прыпяцкай стромістай
кручай
Празрыстыя ходзяць яны.
Ты ўсё зразумець павінен,
Бо й сны вырашаюць лёс
Пад небам адзіным — сінім —
Жывем і смяемся да слёз...»

Ах, дзеду, мой слаўны дзеду,
Хачу зразумець, хачу.
Ды, толькі мой родны, дзе ты?
«Куды ты адплыў?» — крычу...

Нашы трывушчыя продкі,
Прадзеды і дзяды,
Як і мы, з Беларусі родам,
Дзе белыя звоняць сады...

ТРЫВАЛАЕ КАРЭННЕ

СЫМОН БЛАТУН ішоў у паэзію сваім, непрывычным шляхам. Здавалася, аднагодкі апярэджвалі яго — у іх выходзілі кніжка за кніжкай, а ён, пачаўшы разам з імі, усё яшчэ сваёй кнігі не меў. Першая яго кніга—«Раўнавага» — выйшла нядаўна... І высветлілася — малады паэт не адстаў ад пакалення. Не, ён меў свой погляд на жыццё, на рэчы і з'явы. Гэта быў погляд паэта, асоба якога мае выразную чалавечую, духоўную адметнасць. Удумлівасць і непасрэднасць, шчырае захапленне людзьмі і светам—гэтыя рысы паэзіі С. Блатуна мелі апірышча на асабісты вопыт. Пасля выхаду першай кнігі С. Блатуна адразу стала ясна, што ў літаратуру прыйшоў не пачатковец, а паэт сапраўдны, арганічны ў сваім жыццялюбстве, унутрана засяроджаны, крэўна звязаны са сваім народам, з яго труднай гісторыяй і сённяшнім мэтаімкнёным працоўным будням.

Працаваў паэт натхнёна і плённа. У перыёдыцы паяўляліся новыя яго творы, ён гаварыў пра цікавыя задумы... І нечакана—раптоўная смерць.

І пра гэту, другую кнігу паэта, якую мы зараз трымаем у руках, даводзіцца гаварыць, як пра апошнюю. Чытаеш і перачытваеш гэту кнігу з асаблівым пачуццём. Здаецца, вось побач з табой ён сам, аўтар, і ты чуеш яго адметны голас—голас равесніка, сучасніка, удзельніка добрых людскіх спраў, добрага знаўцы душы чалавечай. А разам з тым—поўнішся шкадаваннем, не можаш не думаць пра лёс Сымона Блатуна, з асаблівым пачуццём перачытваеш радкі, што нечакана ўспрымаюцца ў рэзкім светацені:

І скажуць: «Быў яшчэ ён
малады...».
Паўстану я ў нагосьці прад
вачыма.
Зязюлямі падлічаць мне гады
Суцішана трывожныя жанчыны.

І скажуць так: «Ляжаў ён,
як жывы...» —
Упершыню спагадліва і шчыра.
Цішэй вады, ніжэй травы...
Бывайце, гоні, рэчкі, паплавы.—
Я адлятаю ў свой далёкі вырай.

Не ведаю, чытаў гэтыя радкі сам паэт каму-небудзь ці не. Мне асабіста не чытаў. Таму не бярусь гадаць, якое б уражанне зрабіў гэты верш раней. Але цяпер... Гэтыя няхітрыя радкі, у якіх няма кідкіх параўнанняў, метафараў, асаблівай вытанчанасці формы, — балюча б'юць у душу.

Паэзія Сымона Блатуна вабіць строгай прастатой выслову, прастатой, за якой тоіцца і жыццёвая складанасць, і ўнутраная напоўненасць. Сам паэт гаварыў пра сябе: «Я ніколі не іграў на сцэне, а тым больш ніколі—у жыцці».

І сапраўды, мы не знойдзем у вершах Сымона Блатуна ні таннага фальшу, ні самалюбавання. Душой і сэрцам паэт сярод сваіх землякоў:

Корань мой—у палескай глебе,
Корань мой—у духмяным хлебе,
Корань мой—у бацькоўскай хаце,
Корань мой—у сэрцы маці.

Гэта—не дэкларацыя. Гэта—вызначэнне радаслоўя. Ва ўсім, што пісаў паэт, беспамылкова пазнаеш, адкуль ён, на чым узрос, што ўзяў у душу яшчэ ў маленстве, з чым ідзе ў паэзію. Ён памятае сваё радаслоўе, сваё дзяцінства і таму ў яго поглядзе на свет ёсць узяты ад гэтага радаслоўя вопыт, апасродкаваны вопытам ураженняй душы і шчырага сэрца. Вось радкі:

Абоймы шарыкавых ручак.
Турбуе моладзь прадаўца.
Мы ж пёры нітамі прынручвалі
Да абструганага дубца.
І на шпалеры мы пісалі,
І кляксай пстрыкала пяро...
Я свой алфавіт вывеў сажай
З нарчоў смалістых —
дымных дроў.

Звычайная, здавалася б, згадка пра мінулае, пра маленства. Але якім пранізлівым святлом засвяцілася раптам будзённасць, за звычайнай сцэнкай праявілася нешта больш важнае: разуменне жыццёвых каштоўнасцей, боль памяці, складанасць чалавечых дачыненняў з светам.

Паэту дарагі і блізкі наш сённяшні дзень. Ён можа глыбока—на поўныя грудзі—удыхнуць жыццёвую святочнасць:

Галавы палае фанел рыжы,
На вятры трапеча, зіхаціць.
Вы эірніце — па вадзе на лыжах
Дзеўчына, як ластаўка, ляціць.

Стройная смуглянка-чарацінка
З сонцам, з морам выбегла
дружыць...
З пырскамі цалуецца дзяўчынка,
Ломячы крутыя віражы.

Тут усё асветлена радасцю, сардэчнай цеплынёй, чыста і тонка выяўлена ў слове і вобразе жыццялюбствам. Тое ж жыццялюбства можа праявіцца і больш складана—праз тужлівую развагу, нялёгкі одум. Мне хочацца цалкам прывесці верш «Здзічэлы сад».

Я кідаю балючы пагляд —
Сад здзічэлы, здзічэлы сад...
Дзе твае паясы яркa-белыя
І, як ядры, антонаўкі, бэры?
Ці ж не ўчора яшчэ, не ўчора
Гнуў у лук ты тугія падпоры?
Падаў яблык — дык быў жа
выбух!

Сёння ж ты, бы са строю
выбыў
У лісці стала менш аксаміту,—
Быццам шротам яно пабіта.
Заскарузлым голлем зарос,
Лёгкі ветрык цябе атрос.

І не тыя плады твае ўжо —
Зараджай хоць ты імі ружжо...
Сад здзічэлы...
Глухі, таямнічы...
Без мяне ты вярнуўся да дзічак.

Які светлы, які шчыры, жыццялюбівы гэты верш. Як хораша яднаюцца ў ім сум па незваротнасці часу (жыццё ідзе, усё мяняецца) і думка аб плодным плёне жыцця. І апошні радок: «Без мяне ты вярнуўся да дзічак...»—не декор сабе, а хутчэй за ўсё перакананасць у тым, што неабходна вярнуцца самому да недаробленага, кінутага на паўдарозе.

Асаблівае месца ў паэтычным набытку Сымона Блатуна займае невялічкая паэма «Бярвянае ляда», прысвечаная памяці ахвяр Хатыні. Гэта—адзін з лепшых твораў пра Хатынь у беларускай паэзіі.

Пачынаецца паэма мірным малюнкам: «Дзядзька шыльдачкі прыбіваў на хатах. Малатком: стук-стук-стук! На вуглу адной—іржавая лапата, а на гэтай багор—іржавы крук, бо ў хаце мужчына дужы. А вось тут — вядро. Удава, без мужа...» Якая дакладная па сваёй жыццёвай праўдзівасці і трапнасці карціна! Яркія, выразныя мазкі, якімі аўтар малюе яе, дапамагаюць нам не толькі ўбачыць даваенную вёску, адчуць яе паўсядзённыя клопаты і трывогі, але нечым прымушаюць нас і насцярожыцца. Недзе падспудна пачынае гучаць трывожная нотка блізкай і немінучай бяды. Здаецца, самі радкі дыхаюць гарачынёй і спякотай. І вось яно: «Загарэліся, ўспыхнулі хаты... Ліжа полымя сквапна вуглы—вёдры, бочкі, багры... Дык чаму ж ніхто не бяжыць? Дрэвы стогнуць адно — жыць, жыць...»

Паэма напісана так сцісла, такая ў ёй кандэнсацыя думак і пачуццяў, што яе проста немагчыма не цытаваць. Праз бытавыя дэталі паэту ўдаецца гранічна наблізіць да чытача, паказаць буйным планам трагедыю не толькі самой Хатыні, але і драматызм людскіх лёсаў. Хаця герояў, апрача дзядзькі, што прыбівае на хатах шыльдачкі, ды печніка, у паэме больш няма і не называецца, тым не менш мы адчуваем іх прысутнасць. За тымі снапамі і цапамі, што гулялі па таку, нават за той прыкметай, што кранаць буслоў няможна, бо «прынясе ён галавешку гарачую і на хату кіне...»—мы бачым жывых людзей з іх характарамі, адносінамі да навакольнага свету. Аўтар паказвае нам увесь уклад жыцця нашай беларускай даваеннай вёскі. Які выразны гэты кантраст мірнага быцця людзейства-ральцікаў з варварствам фашысцкіх вылюдкаў. Чалавецтва не павінна гэта забыць і дараваць іх зверствы!

Мы ідзём!
Мы ідзём судзіць катаў.
Дзе хаваешся ты,
недабіты кат?
Чуеш, гнеўна гучыць набат?

Паэма славіць подзвіг нашага народа, яна напісана з вялікім напалам і з грамадзянскай сталасцю.

Светлым сыноўнім пачуццём і пяшчотай прасякнуты вершы С. Блатуна на школьную тэму. Сярод іх асабліва хочацца вылучыць адзін — прысвечаны памяці настаўніцы Ганны Сяргееўны Рослік верш «Ля дошкі школьнай». Паэт звяртаецца да былой сваёй настаўніцы не як вучань, а як дарослы. Ён гаворыць пра тое, што жыццёва важна для яго — раіцца, сумняваецца, правярае правільнасць шляху, з пачуццём высокай маральнай і грамадзянскай адказнасці вывярае свой шлях, «прамывае вочы» ў сваім разуменні і бачанні свету.

Сымон Блатун меў добрую душу і развітае паэтычнае ўяўленне, выразна бачыў дабро і зло, ведаў мэту. Можна толькі здагадвацца, як многа ён мог бы яшчэ зрабіць, якія цудоўныя напісаў бы творы. Але і тое, што ён паспеў ужо сказаць,— важкае сваім чалавечым і паэтычным зместам, хвалюючае, сапраўднае. Яно будзе доўга хваляваць усіх тых, хто любіць і шануе паэтычнае слова. Сымон Блатун меў падставы напісаць: «Ды веру я — не вымерзнуць карэнні, бо я — пачатак, і працяг — сам я!».

Васіль МАКАРЭВІЧ.

Сымон Блатун. «Радаслоўнае дрэва». Вершы. Выдавецтва «Беларусь». Мінск, 1970.

ПАРТРЭТ КАМПАЗІТАРА

Расце серыя невялікіх манаграфічных нарысаў «Нашы кампазітары», што на працягу апошніх гадоў выпускае ў свет выдавецтва «Беларусь». Нядаўна яна папоўнілася брашурай «Леў Абеліёвіч», якую напісала Н. Калеснікава.

Пісаць пра кампазітара Абеліёвіча цікава, але нялёгка. Яго творчасць высока прафесійная па музычных выяўленчых сродках і іх выкарыстанні, глыбокая па філасофскім абагульненні задумы, самабытная па асэнсаванні народных вытокаў. Гэта вымагае ад даследчыка-папулярызатара не толькі ўмення рабіць дакладны аналіз музычнай тэхналогіі і эстэтычнага асэнсавання вобразнага складу. Той, хто расказвае пра змястоўныя і эмацыянальныя творы Л. Абеліёвіча, якія ў большасці не маюць літаратурнай праграмы (сімфоніі, інструментальныя ансамблі і сольныя п'есы і да т. п.), павінен знаходзіць ім трапныя і зразумелыя шырокай аўдыторыі моўныя, па-мастацку апісальныя аналогіі. Пры дапамозе такіх тлумачэнняў складаная музыка кампазітара зможа набыць патрэбную «бачнасць», яе вобразы — даходлівасць. Інакш брашура не дапаможа шырокай аўдыторыі атрымаць цікавы і дакладны партрэт творцы.

Як жа адолела Н. Калеснікава гэтыя цяжкасці?

Скажам адразу: для даследчаных аматараў музыкі брашура, нягледзячы на пэўныя недахопы, будзе цікавай і каштоўнай, бо дапаможа ім арыентавацца ў складаным свеце музычных вобразаў гэтага кампазітара. Ужо ў невялікім, але змястоўным уступе Н. Калеснікава дае агульную правільную ацэнку творчасці Л. Абеліёвіча, падкрэслівае яе высокі грамадзянскі пафас і гуманізм, лірыка-псіхалагічную паглыбленасць і эмацыянальную строгасць вобразаў, увасобленых аўтарам.

Акрамя ўступу і такога ж невялікага заключэння, у брашуры ёсць раздзелаў — «Гады навучання», «Да творчай сталасці», «Гады вакальнай лірыкі», «Сімфонія маладосці», «Музыка барацьбы», «Новыя творы і задумы». Пры ўсёй умоўнасці такога падзелу творчай біяграфіі кампазітара, у брашуры засяроджана ўвага чытача на найбольш яркіх старонках музыкі ці тэндэнцыях у мастацкіх пошуках, якія звязаны з пэўнымі гадамі дзейнасці Л. Абеліёвіча. І хоць раздзелы па сваіх мастацкіх вартасцях не аднолькавыя, творчы шлях кампазітара разглядаецца ў іх дастаткова дакладна па фактах і наслядоўнасці выкладання падзей. Праўда, па першым раздзеле цяжка зразумець абставіны, пры якіх Л. Абеліёвіч, не маючы, як піша Н. Калеснікава, ніякай прафесійнай падрыхтоўкі, стаў студэнтам Варшаўскай кансерваторыі, прычым па класах фартэпіяна і кампазіцыі адначасова. Тут чакаеш раскрыцця «сакрэтаў» псіхалогіі творчасці, а гэтага і няма.

Можна ўказаць на некаторыя іншыя ўпушчэнні і праліхі ў асобных раздзелах брашуры, але ўсё ж трэба адзначыць, што Н. Калеснікава напрацавала шмат. Навукова-аналітычны ўзровень брашуры даволі высокі. Трапныя заўвагі і назіранні зроблены тут наконт структуры, гарманічнага складу, мелодыкі, аркестроўкі твораў амаль усіх жанраў, у якіх піша кампазітар. Усё, пра што ідзе ў брашуры гаворка, падмацоўваецца многімі нотнымі прыкладамі. Ці дастаткова гэтых каштоўных якасцей, каб захапіцца музыкай, каб атрымаць яркі партрэт яе творцы?

Мне здаецца, не, не хапае, бо занадта вялікай атрымалася дыспрапорцыя паміж разглядам тэхналогіі творчасці і яе эмацыянальнай, мастацка-вобразнай выразнасці, дыспрапорцыя між тым, што напісаў кампазітар і як ён гэта зрабіў. Каб падмацаваць гэты дакор, прывяду толькі два прыклады.

Пра адзін з фрагментаў фіналу «Трыо для фартэпіяна, скрыпкі і віяланчэлі» Н. Калеснікава піша: «Напружанасць гэтага эпізоду ўзмацняецца яго роляй дамінантавага прадыкта асноўнага рэ мажора ў рэпрызе, дзе пасля кароткачасовага адступлення сцвярджаюцца светлыя, жыццярадасныя вобразы». Але ж не спецыялістам такое вызначэнне нічога не дае, скажу больш, перашкаджае разумець логіку эмацыянальнага развіцця музычнай будовы твора.

Другі прыклад. Вось старонка, дзе гаворка ідзе пра раманс «За жытнім полем». Аўтар піша: Арганныя пункты ў акордавым фартэпіянным суправаджэнні, мінорная субдамінанта ў мажорным ладзе падаюць мелодыі пэўную прывабнасць...»

Так, тэхналогія тут разгледжана дакладна, але яна «забіла» мастацтва; аўтар аналізу не знайшоў той паэтычнай, моўнай аналогіі, якая б дапамагла слухачу глыбей адчуць і зразумець прыгажосць музыкі.

Такія недахопы ўласцівы і некаторым іншым брашурам з серыі «Нашы кампазітары». На жаль, часта яшчэ музыказнаўцы, малюючы партрэт творцы музыкі, падмяняюць жывую размову пра адчуванне мастацкага вобраза музыкальнага твора спецыфічна тэхналагічным аналізам. Калі такі аналітычны ракурс дапамагае спецыялістам пазнаёміцца з музычнай канструкцыяй твора, вызначыць прафесійную падрыхтаванасць кампазітара, дык аматары музыкі атрымліваюць малую карысць ад чытання такой кніжкі. Дапамагчы палюбіць і зразумець музыку—перша абавязак аўтараў такіх нарысаў.

І. ІНІЧ.

Н. Калеснікава. «Леў Абеліёвіч». Выдавецтва «Беларусь». 1970.

«ЗНОЎ ДА ШЧАСЦЯ ЎЗДЫМАЮ РУКІ...»

«Мой добры голуб»—кніга выбраных твораў яўрэйскага паэта Хаіма Мальцінскага, які ўжо мае больш за сорак год творчага стажу. Зборнікі вершаў і паэм Х. Мальцінскага неаднаразова выходзілі ў перакладах на рускую і беларускую мову; ён—аўтар многіх кніг для дзяцей.

Талент Х. Мальцінскага чалавечны, светлы. Калі чытаеш зборнік «Мой добры голуб», то адчуваеш, як б'ецца трапяткое сэрца аўтара, поўнае любві і пашаны да людзей. Голас Х. Мальцінскага гучыць праўдзіва і ўпэўнена. Яму не ўласцівы гучныя дэкларацыі, напышлівыя, але пустыя словы. Затое словы паэта, пазбаўленыя прамалінейнай павучальнасці, пазбаўленыя дэкларацыйнасці, прывабліваюць вынашанасцю, душэўнай напоўненасцю.

Жыццё не абышло Х. Мальцінскага ні сваімі радасцямі, ні горам. «Бываў над асколкамі ў пекле атак, пазнаў я і крыўды пякучае смак»,—прызнаецца паэт, на долю якога выпалі нялёгкія выпрабаванні, сярод якіх самым цяжкім была вайна. У пяхотным страі прайшоў паэт пякельныя шляхі вайны ад Сталінграда да самага Берліна. Ён з гонарам адзначае: «Радзіма, твой да кронлі, твой сцяг праз дым пранёс з сынамі ўсімі поплеч».

Невымерныя страты перажыў паэт—фашысты расстралялі яго сям'ю, забілі маленькага сына. І яшчэ вайна пакінула памяць: «Драўляная цячэ ў маёй левай кроў, і мускулы на ёй са скуры новай...»

Так, зведана і перажыта многа. І, вядома, паэт не можа не гаварыць пра гэта—пра жахі вайны, пакуты людзей і зверствы фашысцкіх нелюдзяў. Напамінаюць паэту пра вайну «старыя пякучыя раны», часта «сніцца злое полымя сурова», «і боль і нянавісць сціскаюць ...грудзі». Але гэтыя выпрабаванні, пакуты не высушылі сэрца паэта. Наадварот, яны зрабілі яго больш чулым, яны паяднялі паэта з многімі людзьмі, з народам: «Імкнуся зразумець цяпер глыбей пакуты ўсе, усю жальбу людзей». І на самой справе, для вершаў Х. Мальцінскага характэрна абвостранае адчуванне людскога болю, чалавечых трывог, уменне прыняць у сэрца—як свае—клопаты многіх людзей. Вера ў дабро, у справядлівасць, у высокія грамадскія ідэалы, вера ў жыццё, асветленае ленінскай праўдай і хараством існага свету, пранізвае творы паэта, акрыляе іх памкненнем да вялікага чалавечага шчасця: «Я зноў да шчасця ўздымаю рукі».

Зычачы шчасця людзям, паэт заўсёды гатовы прыйсці ім на дапамогу, падтрымаць цёплым словам і добрай усмешкай:

Не долатам, не брусам—
сэрца плазам
Ты мусіш выкрасаць такія
сказы,
Каб і таму, хто стрэў свой
хмарны дзень,
Праз смутак бліснуў
радасці прамень.

(«Нам дораг творчы час...»
Пераклад Я. Семяжона).

І сапраўды, цяжка знайсці ў творах Х. Мальцінскага радкі халодныя, не прапушчаныя праз сэрца. Няхай не ўсе творы паэта з'яўляюцца бясспрэчнымі творчымі дасягненнямі, няхай не ўсе яны вызначаюцца значнасцю мастацкіх адкрыццяў (часам паэт, схільны да заглыбленага роздуму над жыццём, трапляе ў палон уяўнай глыбакадумнасці; часам гучаць у яго творах і сентыментальныя ноткі; часам збіваецца ён і на пратаптаныя сцяжынкі), але яму ніколі нельга адмовіць у шчырасці, у імкненні да дабра і чалавечнасці.

У паэзіі Х. Мальцінскага—свая тапальнасць. Яго слова нягучнае, сціплае, ён імкнецца гаварыць проста, стрымана, абагульняючая думка абапіраецца на тыя «прыватнасці», што складаюць змест і сэнс паўсядзённага жыцця. Але паэт, застаючыся ў сферы гэтай паўсядзённасці, умее знайсці ў ёй тое, што расхінае далягляды вершаў, выводзіць іх да галоўных праблем сучаснасці.

Варта адзначыць, што Х. Мальцінскі ўмее хораша пісаць пра прыроду. Зноў жа—адкрываючы ў «звычайнасці» яе багаты душэўны змест:

Страх незнаём вавёрачцы
малой.
Як шчыры бор, я ўвесь
прапах смалой.
Дзве кропелькі ў зялёнай
гамане
Даверліва глядзяць
у вочы мне.
Ці ёй здалося: я не госць
лясны—
Галінка абышла сасны,
Ускочыла на шоры мой
сурдут...

(«Страх незнаём вавёрачцы малой...» Пераклад Р. Барадуліна).

Вершы Х. Мальцінскага перакладалі многія беларускія паэты: М. Танк, Э. Агняцвет, Р. Барадулін, А. Звонак, Я. Семяжон, А. Зарыцкі, А. Бялевіч, Н. Гілевіч, Е. Лось, С. Гаўрусёў, А. Вярцінскі, П. Макаль, В. Вярба... Дзякуючы ім, творы Х. Мальцінскага гучаць па-беларуску натуральна, успрымаюцца як сапраўдная паэзія. Ды і сам паэт даўно трывала зросся з беларускай культурай. Ён любіць беларускую зямлю, яе народ і гэту любоў заўсёды носіць у сэрцы:

У бары беларускім
Ля празрыстае рэчкі,
Каля спелых жытоў,
Дзе блакітная даль,
Ведайце, я—
Не прышэлец сустрэчны,
Тут ляжыць мой
вялікі няўцямны жаль.
Але ёсць тут, паверце,
Маёй радасці многа,
Во з зямлёй гэтай зросся
Каранямі і сэрцам дрэва
старога.

(«Ведайце». Пераклад
В. Вярбы).

Ц. ЛІЯКУМОВІЧ.

Хаім Мальцінскі. «Мой добры голуб». Выбранае. Пераклады з яўрэйскай мовы. Выдавецтва «Беларусь». Мінск, 1970.

ПРА ТОЕ, ШТО ЗАЎСЁДЫ З ТАБОЙ

ТАКАЯ КНІГА выйшла ў нас упершыню. У гэтым плане можна прыгадаць, бадай, толькі «Слова аб роднай прыродзе», выпушчаную пару гадоў назад выдавецтвам «Народная асвета», у якой былі сабраны мастацкія творы нашых пісьменнікаў аб прыгажосці роднай зямлі. І вось — «Слова пра родны кут». У ёй беларускія пісьменнікі расказваюць пра свае родныя мясціны, пра родны бацькоўскі кут, дзе нарадзіліся, рабілі першыя крокі, спазнавалі свет і саміх сябе.

Гэты запаветны куточак — самы дарагі і любы сэрцу кожнага чалавека. Усё там — незабыўнае, і дзе б пасля чалавек ні жыў, што б ні рабіў, а жыве ў душы непарыўная сувязь з бацькоўскім краем, пачуццё замілаванасці да яго. Інакш і быць не можа, бо без гэтай любві, без гэтага душэўнага набытку чалавек адчуваў бы сябе збедненым, самотным і беспрытульным. З гадамі паняцце Радзімы рассоўваецца далёка-далёка за небасхіл маленства, але вялікае пачуццё прыналежнасці да гэтай зямлі, да гэтага народа нараджаецца менавіта там, пад тым небасхілам, хоць ён і канчаўся напачатку за не вельмі далёкімі ваколіцамі роднай вёскі.

На VI з'ездзе пісьменнікаў Беларусі, які адбыўся не так даўно, выступаў народны паэт рэспублікі, лаўрэат Ленінскай прэміі Пятрусь Броўка. Гаворачы аб любві да Радзімы, аб тым, што творчасць літаратара натхняецца гэтай любоўю, ён, між іншым, заўважаў, што кожны з іх павінен мець у душы родны кут, і прызнаваўся, што калі піша прыродаапісальныя вершы, дык перад ім заўсёды паўстаюць родныя Пуцілкавічы на Ушаччыне з цудоўным борам і маленькай рэчулкай, якая прасякае і бор, і зялёныя сенажаці, і маляўнічыя ўзгоркі, і гаі, і пятлястыя пясчаныя дарожкі паміж іх, а калі прыходзіць лірыка кахання, дык успамінаюцца маладыя хлопцы і дзяўчаты, з якімі праходзіла ягонае юнацтва.

Гэтыя словы паэта міжволі прыгадваліся мне, калі я чытаў кнігу «Слова пра родны кут».

Пісьменнікі расказваюць пра свой бацькоўскі кут... Насцярожвала, што апавяданні іх могуць аказацца падобнымі адно на адно, што аўтары саб'юцца на шаблон, што сама задума кнігі падштурхне іх да гэтага: маўляў, родны кут — перш за ўсё ўспаміны дзяцінства, а, значыць, і гаворка пойдзе найперш пра гэта. На шчасце, кніжка атрымалася змястоўнай і разнастайнай, аўтары яе знайшлі адметныя ключы, каб прыадчыніць дзверы ў краіну свайго маленства і юнацтва, ва ўсёй красе і багацці паказаць свой бацькоўскі кут, яго прыроду і людзей.

Узнёслы, паэтычны расказ Кастуся Кірэенкі пра родную вёску Гайшын на Магілёўшчыне, за якую для паэта «няма нічога ў свеце дарагжэй», не эблытаеш з апавяданнем Алеся Якімовіча — спакойным, разважлівым, нават крышачку самотным — пра сваё Чурылава на Уздзеншчыне. Нібы сам пабываеш у мястэчку Пясочнае Капыльскага раёна, чытаючы апавяданне Анатоля Астрэйкі «Я чыстыя слаўлю пачуцці к Радзіме», альбо пагамоніш з жыхарамі Караваева, Дукор, Рудзенска, Русаковіч, Мар'інай Горкі, перагарнуўшы старонкі расказа Макара Паслядовіча «Дзякуй вам, землякі». Па-свойму запрашаюць нас у падарожжа Тарас Хадкевіч і Данута Бічэль-Загнетава. Адзін—на Верхнядзвіншчыну, у вёску Шайцерава (у кнізе яна чамусьці — Шайцарава), другая — у Біскупцы на Гродзеншчыне. Цікавую, захапляючую вандроўку па рацэ свайго маленства Бярозе абяцае чытачам Мікола Ваданосаў, кліча на Прыдняпроўе Хведар Жычка, на любую сэрцу Ушаччыну — Рыгор Барадулін...

Кніга, паўтараем, атрымалася змястоўнай і цікавай. Але ёсць у яе і яшчэ адна, можа быць, найбольшая вартасць. Чытаючы яе, кожны з нас не-не ды заяртаецца ў думках да свайго роднага кута, вучыцца глядзець на яго іншымі вачыма, убачыць у ім неадкрытую дасюль для сябе прыгажосць і прывабнасць. У гэтым, нам думаецца, і заключаецца галоўная каштоўнасць кнігі, асабліва калі ўлічыць, што «Слова пра родны кут» адрасавана дзецям сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту. Бо, зноў падкрэслім, з любві да бацькоўскага краю пачынаецца любоў да Радзімы — вялікае грамадзянскае пачуццё.

У невялікай прадмоўцы да кнігі гаворыцца: «Для кожнага пісьменніка гэта вельмі блізкая і асабістая тэма, і натуральна, кожны расказ гучыць як хвалюючая споведзь, дзе публіцыстыка знітавана з лірызмам, дзе праз прыватны лёс чалавека, вёскі, горада відаць большае — лёс народа, краіны».

Усё гэта сказана зусім слушна, за выключэннем аднаго: тычыцца сказанае, на вялікі жаль, не кожнага апавядання.

Напрыклад, слова «Пра стары Мінск» Яўгена Рамановіча, нам здаецца, пазбаўлена менавіта гэтага пачуцця блізкасці і асабістасці і таму не хвалюе. Нестае гэтага пачуцця і апавяданню Уладзіміра Калесніка «Наша Брэстчына» — відаць, па той прычыне, што яго «родны кут» аказаўся занадта неакрэсленым: ад Івацэвіч да Белавежы. Занадта публіцыстычна-адцягнены, газетны, з мноствам лічбаў расказ Івана Мураўейкі «Ля Арэсы, ціхае ракі...» Апавяданне Анатоля Вялюгіна «Пад заветнай сасной» напісана па-вялюгінаўску густа і паэтычна, але яно гучыць не нова: гэта кавалак — пра дзяцінства — з аўтабіяграфіі паэта ў кнізе «Пяцьдзесят чатыры дарогі».

І яшчэ адно. Кніга выдадзена, калі можна так сказаць, занадта бедна: папера нейкая шэрая, шрыфт сляпы, вокладка мяккая. У кнізе шмат фотаздымкаў (аўтар — Ю. Іваноў), яны ўвогуле цікавыя, але пададзены няўдала. Акрамя таго, фотаздымкі безадрасныя. Відаць, было б лепш, калі б яны дапаўнялі канкрэтны тэкст.

М. ГІЛЬ.

«Слова пра родны кут». Складальнік Ул. Жыжэнка. Выдавецтва «Беларусь». Мінск, 1970.

ДЗЕНЬ СЁНЯШНІ ПРОЗЫ

Выдавецтва «Знание» выпусціла брашуру доктара філалагічных навук Ф. Куляшова «Сучасная беларуская проза». У брашуры разглядаюцца лепшыя набыткі беларускай прозы апошніх гадоў, робіцца спроба ў папулярнай форме акрэсліць шляхі развіцця нашай прозы, паказаць яе тэматыку і праблематыку.

У полі зроку аўтара брашуры—творы беларускіх празаікаў за два апошнія дзесяцігоддзі.

Значнае месца адводзіць аўтар «ваенна-мастацкаму эпасу», творам пра Вялікую Айчынную вайну. Згадваючы ранейшыя набыткі нашай ваеннай прозы, пачынаючы з твораў Кузьмы Чорнага, Ф. Куляшоў засяродзіў галоўную ўвагу на тых, якія ён лічыць этапнымі ў беларускай прозе пяцідзесятых-шасцідзесятых гадоў.

Найбольш поўна разглядаюцца ў брашуры «Векапомныя дні» М. Лынькова, «Мінскі напрамак» І. Мележа, «Трывожнае шчасце» І. Шамякіна, а ўслед за імі—дылогія А. Адамовіча «Вайна пад стрэхамі», ваенныя аповесці В. Быкава, «Тартак» І. Пташнікава, «Птушкі і гнёзды» Я. Брыля, творы І. Навуменкі і Б. Сачанкі.

Не абыходзіць увагай аўтар брашуры і творчасць іншых аўтараў. Гаворачы пра жанравае багацце, псіхалагічную заглыбленасць, ідэйна-мастацкую ўзброенасць твораў пра вайну, Ф. Куляшоў спасылаецца і на творчасць М. Лупсякова, А. Асіпенкі, А. Карпюка, Л. Арабей, А. Алешкі, гаворыць ён і пра мастацкія пралікі, няўдачы асобных аўтараў.

У раздзеле «Старонкі гераічнага мінулага» разглядаюцца творы, прысвечаныя ленінскай тэме, а таксама творы пра Кастрычнік і грамадзянскую вайну («Хлеб» і «Матрос з Алега», «Лёс майго земляка» І. Шамякіна, «Вецер веку» І. Гурскага, «Сэрца камунара» П. Ткачова, апавяданні В. Хомчанкі і інш.). Значнае месца адведзена «Палескай хроніцы» І. Мележа і раману М. Лобака «Гарадок Устронь». Адзначана праца У. Караткевіча ў гістарычным жанры («Нельга забыць», «Каласы пад сярпом тваім»).

Зразумела, важнае месца адведзена ў брашуры творам пра сучаснасць. Ф. Куляшоў палічыў мэтазгодным вылучыць тут «Снежныя зімы» І. Шамякіна, «Апошні адпачынак» А. Адамовіча, «Серадзібор» П. Пестрака, раманы У. Карпава і аповесці А. Савіцкага. Думаецца, раздзел гэты атрымаўся найменш удалы ў брашуры. Ф. Куляшоў разглядае асобныя творы абасоблена, перанасычае старонкі брашуры пералічэннямі імён і твораў, часам збіваецца на пераказ зместу, называе зусім выпадковыя, слабыя рэчы, абмяжоўваецца бегглымі, агульнымі заўвагамі, накшталт: «Новае асэнсаванне грамадскіх і маральных праблем, якія ўстаюць перад людзьмі сучаснай вёскі, знаходзім у...» (ідзе пералік); «З тэмай вёскі вельмі цесна звязана творчасць» (пералік) і г. д.

У цэлым жа брашура, разлічаная на шырокія колы чытачоў, дае пэўнае ўяўленне пра шляхі развіцця і сучасны этап беларускай мастацкай прозы.

П. ВАЛКАВЕЦ,
настаўнік.

Ф. Куляшоў. «Сучасная беларуская проза». На рускай мове. Выдавецтва «Знание». Масква, 1970.

ПРАБЛЕМЫ, МЕРКАВАННІ, РОЗДУМ

А. ЧАРНЯЎСКАЯ

ЦІШЫНЯ, ПОЎНАЯ

ЁН ПРЫЙШОЎ на камісію без перакладчыка. Падаў дакументы, насцярожана гледзячы мне ў твар. Залеўскі А. А., слесар-рамонтнік, чалавек, які не чуе і не гаворыць.

Ці можа ён працаваць са станкамі, у цэху, дзе па пралётах снуюць мотакары, а над галовамі краны носяць грузы?

Яшчэ год назад я не ведала, ці магу даць на гэта свой дазвол урача. Яшчэ год назад, калі да мяне прыйшла глуханямая жанчына па прозвішчы Ушакова, я жахнулася: без слыху працаваць на станку! Як можна, у каго праходзіла камісію, хто дазволіў! Задумаецца ж, не заўважыць... І вось ужо дзесяткі страшных малюнкаў узнікаюць ва ўяўленні: Ушакова, збітая мотакарам; Ушакова з рукой, расціснутай штампам; цяжкія пліты, якія наогул ніколі не падалі, абавязкова павінны ўпасці, таму што ў цэху працуе Ушакова,—бо яна ж не пачуе, не заўважыць, не адскочыць своечасова ўбок. Прайшло 5—6 мінут, пакуль я перажывала ўсе гэтыя ўяўляемыя жахі. Прайшло б і больш, калі б не ўмяшалася Людміла Канстанцінаўна Парфянюк, інструктар- перакладчык Мінскага электратэхнічнага завода, якая працуе з глуханямымі рабочымі. «Не трэба так палохацца, доктар. Яна працуе на станку ўжо паўгода, на іншых заводах глухія працуюць па шмат гадоў і ні з кім нічога не здаралася. Любы рабочы з добрым слыхам можа павучыцца ў іх уважлівасці і асцярожнасці. Вы толькі вылечыце яе ад прастуды».

Потым Ушакова некалькі разоў прыходзіла да мяне на прыём. Прыгожая, заўсёды з густам апранутая, ветлівая і мілая жанчына. З ёю сапраўды нічога не здарылася, толькі хварэе яна часта.

Таму, аглядаючы Залеўскага, я ўжо не думала аб тым, ці зможа ён працаваць у цэху. Зможа, вядома. А ён, відаць, хваляваўся, таму што, калі я напісала «годны», раптам павесялеў, усміхнуўся, штосьці пачаў «расказваць» жэстамі. Мне вельмі хацелася ведаць, аб чым жа ён хоча расказаць, таму што ў яго пантаміме хтосьці страляў (пры гэтым ён паказаў след ад ранення на назе), хтосьці няньчыў маленькае дзіця, і хтосьці быў узнагароджаны ордэнамі. У гэты час увайшла Людміла Канстанцінаўна. Зрэшты, яна заўсёды паяўляецца там, дзе ёсць яе падапечныя, яна ведае, што ім без яе цяжка.

Відаць, яна была стомленая ў той дзень, бо калі я папрасіла перакласці маналог Залеўскага, яна адмахнулася: «Ох, і надакучыў мне гэты «балбатун». Яму дай волю, ён цэлы дзень будзе гаварыць».

Дарэчы я зусім выпадкова даведалася, што Людміла Канстанцінаўна сама амаль не чуе, задаўшы ёй пытанне ў момант, калі яна на мяне не глядзела. Гаворачы з ёю, заўважыць гэта немагчыма, яна дасканала «чытае» з губ. Мне вельмі хацелася даведацца, што ж расказваў нам Залеўскі, і назаўтра Людміла Канстанцінаўна «пераклала» мне яго пантаміму: «Ён усё вайну ўспамінае. У партызанах быў. Глухога ж у бой не пусціш. Рабіў, што умеў. Рамантаваў зброю, рабіў бомбы. Быў паранены, узнагароджаны. А цяпер выдатны слесар-рамонтнік, бацька дваіх дзяцей. Вось толькі любіць «пагаварыць».

Увогуле ж, яны не вельмі гаваркія, мае глухія пацыенты. Саромеюцца. Хоць многія з іх умеюць размаўляць. Цяпер прызвычаіліся, прыходзяць на прыём адны. Вельмі цярплівыя і старанныя. Я не памятаю, каб хто з іх праяўляў прыкметы раздражнення, чакаючы прыёму, якой бы доўгай ні была чарга. Бывае, не адразу разумеюць, што ад іх патрабуецца. Прыходзяць зноў і зноў, цярпліва чакаюць ля дзвярэй кабінета, пакуль не зробяць усё, што патрэбна. Такія ж і ў рабоце. Вельмі пунктуальныя і акуратныя.

Другі цэх, інструментальны аддзел. Тут працуюць слесары-інструментальшчыкі, рабочыя высокай кваліфікацыі. Майстры. Робяць яны штампы. Работа цяжкая, яна патрабуе кемлівасці, творчага мыслення.

Вікенцій Іванавіч Кандэр і Анатоль Сяргеевіч Іваноў працуюць на гэтым участку некалькі год. Абодва з дзяцінства не чуюць, не гавораць. У ролі перакладчыка — мой пацыент Анатоль Сяргеевіч Іваноў. Пішу яму свае пытанні, ён перакладае. Мае субяседнікі здзіўлены: чым заслужылі асаблівую ўвагу? Жывуць, як усе. Працуюць, ходзяць у кіно, займаюцца спортам, гадуюць дзяцей. Дзеці чуюць, ходзяць у школы, у дзіцячыя сады.

Успамінаю размову з выпадковым знаёмым у цягніку: «Навошта сляпым, глухім жыць у вялікім горадзе? Яны ж усё роўна не могуць карыстацца яго перавагамі. Няхай бы арганізавалі для іх паселішча дзенебудзь за горадам. Плялі б кошыкі, шылі тапачкі. Толькі кватэры дарэмна займаюць».

Агідная жорсткасць фізічна здаровага, «паўнацэннага» чалавека. І чаму абавязкова — кошыкі і тапачкі?

А вось у канструктарскім бюро завода працуе некалькі глуханямых канструктараў. Сярод іх Уладзімір Аляксандравіч Чысцякоў, вядучы канструктар, які робіць самую складаную інжынерную работу. Аўтар раду станкоў для мінскіх трактарнага, матэрнага, Горкаўскага аўтазавода. Там жа працуе Георгій Ліснеўскі, ударнік камуністычнай працы, таленавіты інжынер, які карыстаецца ўсеагульнай пашанай.

Сур'ёзны фізічны недахоп гэтых людзей кампенсуецца найвялікшай маральнай паўнацэннасцю, упартасцю, велізарным жаданнем быць карыснымі. Яны ўмеюць рабіць усё, што дадзена нам, фізічна здаровым людзям. І чым цяжэй ім гэта даецца, тым больш каштоўныя іх веды, іх уменне, імкненне знайсці сваё месца ў жыцці.

У таварыстве глухіх мне паказалі выразкі з мінскіх газет за 1969 год, у якіх было апісана падарожжа слесара Мінскага мотавелазавода Уладзіміра Ярца, які за 158 дзён праехаў на мотаролеры з Мінска ва Уладзівасток цераз Крым, Карпаты, Каўказ, Сярэднюю Азію. Аб адным толькі не ўспаміналася ў гэтых заметках, што падарожнік — глуханямы.

Так часта бывае: нязвыклае здаецца непраўдападобным. Глухі вадзіцель — неверагодна! Акезваецца, магчыма. У некаторых гарадах — Маскве, Ленінградзе, Бранску, Чэлябінску — арганізаваны доследныя курсы глухіх шафёраў для навучання ваджэнню асабістых машын. Калі эксперымент будзе паспяховым, аматарскія правы змогуць атрымаць усе глухія, якія жадаюць мець машыны. Хочацца, каб у іх гэта атрымалася, як атрымліваецца ўсё, за што яны бяруцца.

Тэатральны калектыў, якім многа год кіраваў заслужаны артыст БССР А. Трэпель, заваяваў другое месца сярод самадзейных тэатраў, атрымаў званне народнага; танцавальная група, сем артыстаў якой маюць званне артыстаў народнага ансамбля танца; КВН, спартыўныя секцыі. Немагчымае аказваецца магчымым, тое, што здаецца не пад сілу, — ажыццяўляецца.

Аб гэтым з гордасцю расказвае старшыня абласнога аддзела таварыства глухіх Уладзімір Лявонавіч Парфянюк. Пра сябе расказваць не хоча. Сёе-тое аб ім даведаліся ад яго жонкі Людмілы Канстанцінаўны. Аглух у дзяцінстве. Скончыў школу глухіх дзяцей, потым — тэхнікум. Шмат год працаваў канструктарам у СКБ, быў абраны старшынёй абласнога аддзялення глухіх. Пра работу сваю, пра таварыства Уладзімір Лявонавіч гаворыць з захапленнем. Дарэчы, размаўляе ён дасканала. Каля дзвюх гадзін слухаю яго расказ: «Вы ведаеце, што ў царскай Расіі глуханямыя лічыліся душэўна хворымі? — Далей ідзе невялікі экскурс у гісторыю (Уладзімір Лявонавіч піша аб гэтым кнігу).— Так, сто гадоў назад больш за 4000 глухіх, што жывуць цяпер у Мінскай вобласці, былі б выкінуты з жыцця, а цяпер сярод іх толькі 600 непісьменных — усё гэта людзі старога ўзросту.

Вельмі многа зроблена для глухіх у Беларусі: дзіцячыя сады, інтэрнаты, школы, вялікае вучэбна-вытворчае прадпрыемства ў Мінску, школа трэнераў пры фізкультурным інстытуце. І ўсё ж работа з глухімі — яшчэ неўзнятая цаліна.

Мы навучаем глухіх пісьменнасці, даём адукацыю, займаемся працаўладкаваннем. За сродкі таварыства пабудавалі інстытут слыху і мовы. Але... многае яшчэ трэба зрабіць.

Больш за ўсё я мару аб тым часе, калі не будзе глухіх і калі мы ліквідуем наша таварыства. А пакуль у нашых інструктараў-перакладчыкаў яшчэ вельмі многа работы. Інструктар — гэта і нянька, і выхавацель, і прадстаўнік таварыства, ад яго работы вельмі ў многім залежыць дабрабыт глухіх.

Успамінаю нястомную Людмілу Канстанцінаўну. «Доктар, запоўніце Іванову курортную карту, а то ў яго жонка пуцёўку атрымала, яму без яе будзе цяжка».

«Доктар, папрасіце начальніка цэха, каб ён адпусціў глухую дзяўчыну на міжрэспубліканскія спаборніцтвы па шахматах. Ну і што ж, што канец месяца! Кожны месяц бывае канец месяца, а спаборніцтвы — рэдка».

«Выбачайце, трэба бегчы. Адна мая падапечная ляжыць у бальніцы, ёй хадзіць не дазваляюць, а яна не слухае. Вельмі ўжо ўпартая, урачы справіцца не могуць. Трэба з ёю пагаварыць».

Дзе толькі я ні сустракаю Людмілу Канстанцінаўну: у паліклініцы, у заўкоме, у кабінеце начальніка цэха, — словам, усюды, дзе яна хоць штосьці можа зрабіць для сваіх падапечных.

А Уладзімір Лявонавіч працягвае: «У нас зусім маленькі штат. А добра б таварыству мець сваіх прадстаўнікоў у грамадскіх, навуковых арганізацыях, у Міністэрстве аховы здароўя, каб інструктарам не прыходзілася прасіць за кожнага глухога паасобку. На гэта траціцца вельмі шмат часу і сіл. На многіх прадпрыемствах наогул няма інструктараў. Хацелася б, каб адміністрацыя гэтых заводаў больш чула, больш уважліва адносілася да глухіх рабочых, па магчымасці старалася дапамагчы ім».

Многа расказвае Уладзімір Лявонавіч пра старшыню Рэспубліканскага таварыства глухіх, Героя Савецкага Саюза Мікалая Піліпавіча Шарко: «Ён кіруе таварыствам з 1950 года. Калі б не ён, наўрад ці пайшоў бы я з СКБ. А ён сказаў: хто ж будзе працаваць, калі самі глухія не захочуць нічога для сябе зрабіць?» І я зразумеў, што не магу адмовіцца. Раней я лічыў, што працаваць у нашым таварыстве павінны толькі глухія. Шарко раіў браць і тых, хто чуе. Цяпер я пераканаўся, што ён меў рацыю. Без іх мы не здолелі б справіцца з адной з асноўных нашых задач — навучыць глухіх гаварыць. Раней наша арганізацыя называлася таварыствам глуханямых, але цяпер мы нават з назвы гэта вызначэнне выключылі, бо нам хочацца, каб сярод нас не было нямых. І дапамагчы нам дабіцца гэтага могуць толькі тыя людзі, якія гавораць. Толькі ў кантакце з імі мы можам чагосьці дасягнуць, толькі разам з імі мы можам выхоўваць нашых дзяцей».

Нармальныя дзеці ў глухіх бацькоў. Праблема. Наогул, яна вырашана. Яслі, дзіцячыя сады прадастаўляюцца ім у першую чаргу. У школе яны нічым не адрозніваюцца ад дзяцей, якія жывуць у нармальных умовах.

Глухія дзеці... Як растуць яны, што бачаць у сваім замкнутым свеце — свеце цішыні?

«Ведаеце, свету абсалютнай цішыні няма, таму што не бывае абсалютнай глухаты, — расказвае сурдапедагог Мінскага дзіцячага дома для глухіх дзяцей, аспірантка Маскоўскага інстытута дэфекталогіі Еўлалія Васільеўна Суханава. — Здольнасць чуць, напрыклад, гул самалёта, барабанны бой захоўваецца ў кожнага глухога — гэта так званы астатачны слых. У адных ён захоўваецца ў большай, у другіх — у меншай ступені. Мы стараемся па магчымасці яго выкарыстаць, займаючыся з дзецьмі ў мікрафонным класе праз сістэму мікрафон-навушнікі. Дзеці атрымліваюць уяўленне аб гуку, могуць чуць педагога, сябе. Але гэта не першы этап навучання. Мы пачынаем выхоўваць дзяцей з трохгадовага ўзросту, калі яны яшчэ не падазраюць аб тым, што не чуюць. Яны яшчэ вельмі бездапаможныя, не ўмеюць сканцэнтроўвацца, не могуць зафіксаваць увагу на пэўным прадмеце. Пачынаем з таго, што выпрацоўваем у іх увагу, вучым глядзець на таго, хто гаворыць. Па-

АДНОЙЧЫ ЛЕТНІМ ДНЁМ...

Здавалася, што навальніца грукоча яшчэ далёка. І раптам хлынуў моцны лівень. Я скокнуў пад страху канюшні, стаю, асцерагаюся, азіраюся. Пад страхою стаяў ужо дзед Кузьма з унукам. Я ведаў яго — заядлы нытач мясцовай бібліятэкі, жартаўнік і выдумшчык. Здавалася, дзед ніколі і хвілінкі не маўчыць. А гэта стаіць прыціхлы, задуменна паглядае на паветраныя пухіры на лужах. Маўчу і я...

І раптам аглушальна трэснуў гром. Кузьмоў унук, Вася, аж скалануўся, прыліп да дзеда.

— Ну што ты, дурненькі... — пагладзіў плячо хлапчука Кузьма. — Гэта ж Ілья-прарок на нябесным іпадроме трэніруецца. Новыя калёсы аб'язджае — фаэтон, па-божаму, называецца. Мабыць, да алімпійскіх гульняў рыхтуецца.

Над галавою святлела, хмара сплывала далей. Гром пагрукаў і прыціх зусім. Бліснула сонца...

— Во, патрэніраваўся і пайшоў распрагаць, — сказаў Кузьма.

— Ужо распрог! — затузаў Вася дзеда. — Во, дугу зняў! — паказаў хлапчук на вясёлку.

«І хто з іх большы казачнік?» — падумаў я.

— Э-э, заспаў, заспаў... — сказала гаспадыня. — Гайшла ўжо наша Цясюшка ў поле, малачка набіраць. Разам з сонейкам пайшла...

З малым я прыехаў у вёску позна, і ён доўга не мог заснуць, усё хацеў паглядзець на жывую карову. І цяпер ён скрывіўся — вось-вось расплачацца.

— Гасцінчык вам пакінула Цясюшка... — гаспадыня падала талерку смятаны і гарлач яшчэ цёплага малака. — Угаворвалі мы са старым Цясюшку пачакаць вас, ды, бачыце, не згадзілася яна...

Малы плакаў ужо наўзрыд.

— Не плач, скора мы пойдзем да статку разам, даіць, — гаспадыня суцешвала малога...

— Цётка, а чаму яна называецца ў вас Цясюшка?— спытаў хлапчук, ідучы на луг да кароў.

— Ніякага імя не прыдумалі, звалі — «Цёсь! Цёсь!» От і Цясюшка...

Карова згледзела нас яшчэ здалёк падняла галаву, натапырыла вушы. «Цёсь! Цёсь!» — паклікала гаспадыня, і яна адразу патрусіла да нас. Прыпынілася каля невялікай рачулкі, цмокнула вады, і зноў прыпусціла да нас. Стала як укопаная, узяла з рук цёткі Насці кавалачак хлеба, пачала жаваць і насцярожліва разглядаць незнаёмых. Харошая Цясюшка, у чорныя лапінкі, а на ілбе зорачка. Відаць, мы спадабаліся ёй, бо далася пачухаць за вушамі.

Цётка прысела з даёнкай каля каровы, пачала даіць. Але нешта Цясюшцы не спадабалася. Прыўзняла нагу, каб не перакуліць пасудзіны, і адышлася.

ступова пераходзім да артыкуляцыйных рухаў і пісьмовай мовы. Адначасова з авалоданнем пісьмовай мовай пачынаецца работа па чытанні з губ. На другім годзе навучання, калі дзіця ведае ўсе літары, пачынаем карыстацца кнігамі. І, нарэшце, наступны этап — самастойнае скарыстанне слова ў мове. Наша асноўная мэта — выпрацаваць у дзіцяці патрэбу гаварыць».

Слухаю Еўлалію Васільеўну і думаю аб тым, якую неверагодна цяжкую і карпатлівую работу праводзяць гэтыя педагогі. Навучыць бачыць, навучыць гаварыць, адкрыць свет кожнаму дзіцяці паасобку! — калектыўнае навучанне тут амаль немагчыма.

Але навучыць дзіця гаварыць— гэта яшчэ не ўсё. Маленькая істота вырасце. Якім стане гэты чалавек—

ГУКАЎ

добрым ці злым, цікаўным ці лянівым, ці будзе ён адчуваць і разумець хараство навакольнага свету? Як прывіць яму звычкі культурнага чалавека, каб ён не адчуваў сябе адшчапенцам? Тут вельмі многа часу ўдзяляюць маляванню, лепцы, аплікацыі. І пастаянныя абавязковыя музычныя заняткі. Вядома, што калі адсутнічае адзін аналізатар, узмацняюць сваю работу другія наяўныя органы пачуцця: зрок, нюх, абвастраецца тактыльная адчувальнасць. Паспрабуйце заплюшчыць вочы і заткнуць вушы, і няхай хтосьці стукне ў пакоі палкай аб падлогу. Ці зможаце вы сказаць, дзе ўдарылі — справа, злева, ззаду ад вас? Відаць, вам гэта будзе цяжка. А глухому дзіцяці гэта не цяжка, яго гэтаму навучылі. Ён не чуе гукаў, але ён ведае вібрацыйнае гучанне свету.

Выхаванцы дзіцячага дома танцуюць пад музыку, дасканала адчуваюць рытм, тэмп яе. Яны чытаюць вершы, спяваюць песні. І ўсё дзякуючы каласальнай працы калектыву сурдапедагогаў і выхавацеляў дзіцячага дома, які ўзначальвае Аляксандра Андрэеўна Піваварава.

МНЕ НЕ давялося ўбачыць выхаванцаў рэспубліканскага дзіцячага дома—лета, яны раз'ехаліся да бацькоў. Але я пабывала на абласным аглядзе мастацкай самадзейнасці глухіх дзяцей. Вялікая зала, дзіцячая аўдыторыя. Тут і зусім малюсенькія дзеткі з лялькамі і зайцамі—дзіцячы сад, і школьнікі ўсіх узростаў, ад сарамлівых першакласнікаў да ўпэўненых у сабе выпускнікоў. Ну і, вядома, педагогі, выхавацелі.

Спачатку крыху дзіўна ад незвычайнай сітуацыі: вельмі многа дзяцей—і цішыня ў зале. Углядаюся ў рады: ну ўсё ў парадку, вельмі ажыўленая жэстыкуляцыя. Дзеці як дзеці. На сцэне ідзе звычайная мастацкая самадзейнасць: вершы, акрабатычныя нумары, лялечны тэатр, масавыя танцы.

А вось гэта ўжо цікава: танцуюць двое малышоў 8—9 год. На сцэне яны здаюцца зусім маленькімі. І так за іх страшна—толькі б не збіліся, яны ж не чуюць! Не, усё дасканала—лёгка, весела, свабодна. Толькі ў дзяўчынкі ўвесь час пашавельваюцца губы—відаць, лічыць колькасць танцавальных рухаў.

Потым хор. Звычайны хор, які выконвае кантату. Можна было б забыць, што спяваюць глухаватыя дзеці, калі б адначасова група хлопчыкаў не выконвала балетна-гімнастычны нумар для гледачоў, якія гэтага хору не чуюць.

Добрая самадзейнасць у Кобрынскай школе. Побач са мною жанчына, не адрываючыся, глядзіць на сцэну. Вельмі хвалюецца, час ад часу тузае мяне за рукаў: «Не, вы на майго сыночка гляньце, вось ён, другі з краю». Паслухмяна гляджу. Звычайны хлопчык, як усе. А для яе ён, вядома самы лепшы. Можа таму, што яна перажыла ўвесь жах нараджэння глухога дзіцяці, прайшла праз боль выхавання яго, нямога, сярод трох здаровых сыноў. І цяпер, калі яна прыехала, каб забраць свайго хлопчыка, гаворачага, які навучыўся гаварыць, пісаць, скончыў 8 класаў Кобрынскай школы, кожнае яго з'яўленне на сцэне здаецца ёй цудам, аб чым восем год назад не адважвалася нават марыць.

Пачуўшы нашу размову, побач падсела жанчына—Енісава Нона Аркадзьеўна з Брэста. Яна бясконца ўдзячная калектыву Кобрынскай школы, яе дырэктару Аляксею Іванавічу Грабенчуку за сваю адзінаццацігадовую Таню. Пасля перанесенага менегіта дзяўчынка амаль не чула, зусім перастала гаварыць. Вельмі многа перажыла, многа выплакала слёз маці, пакуль рашылася аддаць сямігадовую дачку ў школу для глухіх дзяцей. Цяпер дзяўчынка чуе настолькі добра, што яе можна перавесці ў звычайную школу, ды Таня не хоча: гэтая школа стала ёй родным домам.

«Родны дом» — так называецца фільм пра Кобрынскую школу. 320 дзяцей жывуць і вучацца тут. Вельмі добры будынак, вялікі прысядзібны ўчастак, цяпліцы. Круглы год тут ядуць вырашчаную ўласнымі рукамі гародніну. Шмат фруктовых дрэў, вінаград. Жывы куток (нутрыі, трусы, марскія свінкі). Майстэрні—сталярная, швейная.

Настаўнікі паціху дапаўняюць мне тое, чаго няма ў фільме: кожны год на аўтобусе дзеці ездзяць на экскурсіі. Пабывалі ў Карпатах, Волгаградзе, Маскве, Ульянаўску. Пастаянныя шэфскія канцэрты ў калгасах, у доме інвалідаў. Вельмі многа займаюцца спортам—па лыжах трымаюць першае месца ў раёне. А наогул, нічога асаблівага—звычайныя дзеці.

Вось калі яны прыязджаюць першы раз, часамі становіцца страшнавата. Многія гаварыць зусім не ўмеюць. Кожнаму трэба паказаць, што гэта—хлеб, а гэта—паркан. Імён сваіх зусім не ведаюць.

Аднойчы быў такі выпадак. Прывезлі бацькі навічкоў, у кішэньках пакінулі запіскі з імем і прозвішчам. У двух хлопчыкаў запіскі згубіліся. Вядома толькі, што адзін—Толя, а другі—Антон. А вось хто Толя, а хто Антон—не ясна. Назвалі наўгад і, вядома, пераблыталі. Так і пражылі паўгода. Дзеці да сваіх імён прывыклі, ды і выхавацелі пра гэты інцындэнт забыліся. І вось да Антона прыязджае бацька. Прыводзяць да яго дзіця, той жахнуўся: «Гэта не мой сын! Усё яшчэ не разумеючы, у чым справа, вядуць у групу. І раптам да прыехаўшага кідаецца «Толя» з крыкам «Тата!»Бацька заплакаў—ці то ад таго, што рад быў бачыць сына, ці то таму, што гэта было першае слова, якое ён пачуў ад хлопчыка за сем год яго жыцця.

Ідуць апошнія кадры фільма. Дзень «апошняга званка». Радасныя, шчаслівыя выпускнікі ідуць у вялікае, шумнае жыццё.

І рэдасна за іх. Ад таго, што няма і ніколі не будзе для іх страшнага, адзінокага свету цішыні.

ВІНШУЕМ З УЗНАГАРОДАЙ!

Указамі Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларускай ССР вялікая група работнікаў устаноў і прадпрыемстваў культуры, дзеячоў літаратуры і мастацтва, работнікаў кінематаграфіі за заслугі ў развіцці савецкай культуры, літаратуры, мастацтва, кінематаграфіі, актыўны ўдзел у камуністычным выхаванні працоўных і паспяховае выкананне пяцігадовага плана ўзнагароджана ордэнамі і медалямі.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР Ф. А. Сурганаў ад імя Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР 30 ліпеня ўручыў ордэны і медалі ўзнагароджаным.

Ордэны Леніна ўручаны кампазітару, заслужанаму дзеячу мастацтваў Беларускай ССР Ю. Семяняку, народнаму артысту БССР, рэжысёру кінастудыі «Беларусьфільм» Л. Голубу.

Ордэнаў Кастрычніцкай Рэвалюцыі ўдастоены скульптар, народны мастак Беларускай ССР З. Азгур, пісьменнікі П. Броўка, П. Пестрак, народны артыст СССР, артыст Беларускага дзяржаўнага тэатра імя Янкі Купалы Л. Рахленка, кампазітар, народны артыст СССР Р. Шырма, народны артыст СССР, рэжысёр кінастудыі «Беларусьфільм» У. Корш-Саблін.

Ордэны Працоўнага Чырвонага Сцяга ўручаны заслужанаму дзеячу мастацтваў БССР, рэжысёру кінастудыі «Беларусьфільм» І. Вейнярові чу, пісьменніку А. Асіпенку, загадчыку кафедры Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі імя А. В. Луначарскага М. Браценнікаву, кампазітару, заслужанаму дзеячу мастацтваў БССР Я. Глебаву, загадчыку аддзела Палаца культуры Беларускага рэспубліканскага савета прафсаюзаў Р. Гутковіч, загадчыцы бібліятэкі заўкома прафсаюза Мінскага дзяржаўнага падшыпнікавага завода № 11 Г. Калюжнай, дырэктару Цэнтральнай Мінскай гарадской бібліятэкі імя Янкі Купалы А. Костылевай, пісьменнікам А. Кулакоўскаму і Р. Сабаленку, прарэктару Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі імя А. В. Луначарскага К. Сцепанцэвіч, пісьменніку Т. Хадкевічу, народнаму мастаку БССР В. Цвірко, мастацкаму кіраўніку народнага ансамбля танца «Лявоніха» Палаца культуры Мінскага трактарнага завода М. Чысцякову, мастаку, заслужанаму дзеячу мастацтваў БССР А. Шыбнёву, пісьменніку А. Якімовічу, народнаму артысту БССР, артысту Дзяржаўнага рускага драматычнага тэатра імя Горкага Р. Янкоўскаму.

Ордэны «Знак Пашаны» атрымалі дырэктар кінастудыі «Беларусьфільм» У. Іваноўскі, мастак кінастудыі «Беларусьфільм» Я. Ігнацьеў, заслужаны дзеяч мастацтваў БССР, аператар кінастудыі «Беларусьфільм» Р. Масальскі, рэжысёр кінастудыі «Беларусьфільм» Б. Сцяпанаў, дырэктар Палаца культуры Мінскага камвольнага камбіната імя 50-годдзя КП Беларусі Б. Аліеў, скульптар А. Анікейчык, дырэктар Палаца культуры Беларускага рэспубліканскага савета прафсаюзаў В. Барысевіч, пісьменнік Р. Барадулін, заслужаны артыст БССР, саліст Дзяржаўнага народнага аркестра БССР В. Бурковіч, кампазітар, заслужаны дзеяч мастацтваў БССР Г. Вагнер, заслужаны артыст БССР, канцэртмайстар аркестра Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета БССР Л. Гарэлік, пісьменніца А. Васілевіч, мастак, заслужаны дзеяч культуры БССР В. Грамыка дырэктар Беларускага рэспубліканскага тэатра юнага гледача імя 50-годдзя камсамола Беларусі А. Зайдэль-Вольскі, кампазітар, заслужаны дзеяч мастацтваў БССР І. Кузняцоў, заслужаная артыстка БССР, артыстка Дзяржаўнага рускага драматычнага тэатра імя Горкага І. Лакштанава, пісьменніца Е. Лось, кампазітар І. Лучанок, пісьменнікі Г. Папоў, І. Пташнікаў, Б. Сачанка, народная артыстка БССР, салістка Беларускага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Т. Шымко.

Медалем «За працоўную доблесць» узнагароджаны рэжысёр кінастудыі «Беларусьфільм» Ю. Лысятаў, артыстка кінастудыі «Беларусьфільм» Л. Румянцава, мантажніца кінастудыі «Беларусьфільм» А. Шэмет, салістка Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Л. Бржазоўская, заслужаны артыст БССР, саліст ансамбля танца БССР С. Вуячыч, мастак Я. Красоўскі, загадчык аддзела Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя У. І. Леніна Л. Апацкая, салістка танцавальнай групы Дзяржаўнага народнага хору Беларускай ССР В. Панова.

Медалем «За працоўную адзнаку» ўзнагароджаны слесар Мінскага завода «Кінадэталь» У. Камінскі, дырэктар кінатэатра «Піянер» г. Мінска Ф. Люцко, аператар кінастудыі «Беларусьфільм» Ю. Марухін, галоўны хаваўнік фондаў Дзяржаўнага музея БССР Р. Доўнар-Запольская, саліст Дзяржаўнай акадэмічнай харавой капэлы БССР І. Кідуль, картанажніца вытворчага камбіната Мастацкага фонду БССР А. Шэлест.

VII МІЖНАРОДНЫ

30 жніўня вечарам у Вялікім Крамлёўскім палацы былі аб'яўлены вынікі конкурсаў VII Маскоўскага Міжнароднага кінафестывалю. Журы поўнаметражных мастацкіх фільмаў прысудзіла залатыя прызы: фільму «Прызнанне камісара паліцыі пракурору рэспублікі» (Італія, рэжысёр Д. Дамі ані); фільму «Сёння жыць, памерці заўтра» (Японія, рэжысёр Капето Сіндо); рэжысёру А. Вайдзе (ПНР), за рэжысуру; фільму «Белая птушка з чорнай меткай» (СССР, рэжысёр Ю. Ільенка).

Спецыяльныя прызы прысуджаны: фільму рэжысёра К. Вольфа «Гойя» (ГДР); фільму рэжысёра М. Актавія Гамеса «Дні вады» (Куба).

Сярэбраныя прызы прысуджаны: фільму «Эмітай» пісьменніка і рэжысёра С. Усмана (Сенегал); фільму «Ключ» (ЧССР); фільму «У сям'і» (Бразілія).

Журы прысудзіла таксама: прыз за лепшае выкананне жаночай ролі ў фільме рэжысёра І. Хейфіца «Салют, Марыя!» (СССР) Адзе Рогаўцавай; прыз за выкананне жаночай ролі І. Анрэус у фільме «Дні вады» (Куба); прыз за лепшае выкананне мужчынскай ролі — акцёру Д. Ольбрыхскаму (ПНР); прыз за выкананне мужчынскай ролі акцёру Р. Харысу ў фільме «Кромвель» (Вялікабрытанія).

Дыпломы калектыву акцёраў прысуджаны выканаўцам асноўных роляў у фільме «Зяць» (МНР) і выканаўцы ролі гераіні ў дзяцінстве Кім Зунг ў фільме «Дзяўчына Нюн» (ДРВ).

Журы конкурсу кароткаметражных фільмаў прыняло рашэнне прысудзіць прызы наступным фільмам: фільму «Анджэла Дэвіс — партрэт рэвалюцыянеркі» (Францыя), аўтар фільма Іаланда Дзю Люар; фільму «Стальная сцяна Вінь-Ліць» (ДРВ), рэжысёр Нгок Куінь і фільму «Паляўнічыя ў гарах Дак-Шао» (Рэспубліка Паўднёвы В'етнам), рэжысёр Чан Тхэ Зан; фільму «Як, навошта і чаму забілі генерала» (Куба), рэжысёр Санц'яга Альварэс; фільму «Гарачы вецер свабоды» (СССР), аўтары-аператары В. Камароў, Л. Лебедзеў; фільму «Толькі пачатак» (ЗША), аўтарам фільма «Група кінахронікі» (Нью-Йорк).

На конкурсе III Міжнароднага фестывалю дзіцячых фільмаў журы прысудзіла Залаты прыз савецкаму фільму «Увага, чарапаха!»

Рад прызоў і ўзнагарод прысуджаны таксама фільмам розных краін міжнародныя і савецкімі грамадскімі арганізацыямі.

— Вось так заўсёды: трошкі не ў нораў — і ходу. Але не выбіла вядро ні разу...

Вечарам мы разам з усімі чакалі Цясюшку з поля. І вось паказаўся статак. Над каровамі вісела невялікае воблачка пылу. Лысухі, стракаткі і Цясюшка ішлі запаволена, самазадаволена і трошкі з ганарком. Каля кожнага двара іх чакалі дарослыя і дзеці. І наша цётка Насця трымала ў руках лустачку хлеба, пасыпанага крупінкамі солі. Па твары яе можна было зразумець, што яна не сярдуе на сваю карову. Радасна мыкнула і Цясюшка і, перш, чым зайсці ў вадротцы, глэмнула з рук гаспадыні хлеб-соль.

Так заўсёды сустракаюць дарагіх гасцей — хлебам і соллю...



У суседа цераз вуліцу паўз плот выстраіліся чарэшні. А ўрадлівыя! Паспеюць — лісця не відно.

Суседскі хлапчук угаварыў майго знаёмага, Пецьку, залезці на гэтыя спакуслівыя дрэвы. Поспех аперацыі забяспечаны — стары Міхей працаваў у другую змену, а дома больш нікога не было, паразыходзіліся.

Хлапчукі спачатку елі ягады, не злазячы з дрэў, пляваліся адзін у аднаго костачкамі. Потым напакавалі кішэні і саскочылі на дарогу, пайшлі сцежкаю на другую вуліцу. Тыц — а там ідзе Міхей!

Таварыш-хаўрусник ламануў у бок, прыспешыў хаду, а потым даў і добрага дзёру. У Міхея адразу закрапася падазрэнне, ён павярнуў за хлапчукамі і таксама наддаў ходу. Пецька спачатку таксама было пабег, а потым запаволіў хаду. Ён ведаў, што Міхей добры чалавек, да таго ж яшчэ хворы.

— А-а, гэта ты... — толькі і сказаў Міхей, дагнаўшы і пазнаўшы Пецьку. І больш нічога не сказаў, нават адтапыраныя кішэні не памацаў, павярнуў назад.

Пецька пастаяў-пастаяў і паволі пайшоў следам зз ім. Ішоў і ўсё больш запавольваў хаду, а тады вывернуў і вытрас з кішэні чарэшні.

— Ты што ж гэта? Нарваў, то ўжо еш... — азірнуўся на яго Міхей.

— Ай, ад іх толькі аскома... — адказаў Пецька і з палёгкаю ўздыхнуў.

Вышывальшчыка

Дожджык быў светлы, вясёлы і цёплы. Нават хмарка, з якое ён сыпаў, была ўся ў сонечных аконцах. І з гэтых аконцаў струменіліся праз дождж залатыя праменні.

Чародка стрыжоў не зважала на дождж, а кружылася і падымалася ўсё вышай і вышай, нібы хацела дасягнуць тых сонечных аконцаў. Птушкі імкліва-прыгожа сягалі то пад дождж, то пад цёплыя праменні, сюд-туд, сюд-туд, быццам вышывалі неба крыжыкамі.

Павел САКОВІЧ.

ТЭАТР

ШЧАСЛІВЫ ДЭБЮТ

МЫ ПАВЕДАМІЛІ ЎЖО, ШТО НА ГАСТРОЛЯХ У ВІЦЕБСКУ ДЗЯРЖАЎНЫ РУСКІ ТЭАТР БССР ІМЯ М. ГОРКАГА ПАКАЗАЎ ПРЭМ'ЕРУ — СПЕКТАКЛЬ «ДЗЕЦІ ВАНЮШЫНА». У ГАЗЕЦЕ «ВІЦЕБСКІ РАБОЧЫ» ГАЛОЎНЫ РЭЖЫСЁР ДЗЯРЖАЎНАГА ТЭАТРА ІМЯ Я. КОЛАСА ЛАЎРЭАТ ДЗЯРЖАЎНАЙ ПРЭМІІ БССР С. КАЗІМІРОЎСКІ ВЫСТУПІЎ З РЭЦЭНЗІЯЙ НА ГЭТЫ СПЕКТАКЛЬ. ВОДГУК ПРАФЕСІЯНАЛА-ПРАКТЫКА ПРА РАБОТУ КАЛЕГ ЗАЎСЁДЫ БЫВАЕ ЦІКАВЫМ ДЛЯ ГРАМАДСКАСЦІ, ЛІЧЫМ, ШТО І ГЭТАЯ РЭЦЭНЗІЯ З ТАКІХ ВОДГУКАЎ.

П'еса «Дзеці Ванюшына» напісана роўна семдзесят год назад. Чаму ж мы з такой напружанай увагай глядзім яе сёння, у чым прычына поспеху рэжысёра-пастаноўшчыка В. А. Маланкіна і ўсяго творчага калектыву Дзяржаўнага рускага тэатра БССР імя М. Горкага?

У самой п'есе А. Найдзёнава няма, здавалася б, нічога новага, нічога нечаканага. Крушэнне патрыярхальнага ўкладу жыцця, згубная ўлада грошай, нікчэмнасць абывацельскага існавання, ханжаства, крывадушнасць, распуста, падман, душэўная спустошанасць і маральнае разлажэнне членаў знешне «прыстойных» буржуазных сем'яў — як гэта нам знаёма па выдатных узорах рускай класічнай драматургіі ад Астроўскага да Горкага. Але своеасаблівасць п'есы «Дзеці Ванюшына» ў тым і заключаецца, што, паявіўшыся на рубяжы двух стагоддзяў, адначасова з горкаўскімі «Мяшчанамі», яна з'явілася выдатным сінтэзам лепшых рэалістычных традыцый мінулага з мяцежным духам, які нараджаўся, з прадчуваннем ачышчальнай рэвалюцыйнай навальніцы. І хоць рэжысёр сядома і падкрэслена захоўвае гістарычна-канкрэтную дакладнасць таго, што адбываецца, а мастак спектакля разгортвае перад намі ледзь не выстаўку прадметаў быту і ўжытку таго часу, у спектаклі ўсё прасякнута страсным сучасным успрыманнем жыцця. Імкнучыся глыбей раскрыць чалавечыя характары, артысты іграюць насельнікаў дома Ванюшыных не проста як выкапняў далёкага мінулага. Не. Гэта жывыя людзі, знявечаныя і няшчасныя, пазбаўленыя маральных і сацыяльных ідэалаў, эгаісты і карысталюбцы, якія заалагічна ненавідзяць адзін аднаго. І раптам узнікае адчуванне, што ўжо не такія яны музейныя, гэтыя людзі, што ёсць падобныя на іх недзе, побач з намі, што хамства і абывацельшчына жывучыя, што ваяўнічае мяшчанства і пошласць і сёння перашкаджаюць нам жыць. І мы яшчэ больш пільна пачынаем узірацца ў змяіны клубок падзей з жыцця дзяцей Ванюшына.

І колькі б трагічна ні ўсклікаў стары Ванюшын, звяртаючыся да дзяцей сваіх: «Чаму вы такія?», яму не пазбегнуць адказнасці за тэй лад жыцця, якому ён служыў, аддаючы яму ў ахвяру і сябе, і сваіх дзяцей.

Духоўнае прасвятленне старога Ванюшына і яго самагубства—гэта не эфектны сюжэтны ход пад заслону, а шырокае драматургічнае абагульненне жыцця. Іменна гэты фінал вывеў п'есу ў рад выдатных сацыяльных драм свайго часу. Вось чаму ўзнікла пачуццё незадаволенасці фіналам спектакля мінчан, калі яны выбралі іншы фінал, напісаны аўтарам праз шэсць год.

Адмова аўтара ад самагубства Ванюшына была ўступкай таму спаду грамадскага гучання мастацтва, якое наступіла пасля паражэння першай рускай рэвалюцыі.

Артыст К. Шышкін, які так тонка і паслядоўна выстройвае ў ролі Ванюшына свой трагічны шлях разумення жыцця, у фінале раптам аказваецца гэтакім бездапаможным дзядком, які, як клікуша, павучае сваіх дамачадцаў і пагражае ім. Нам здаецца, што для гэтага спектакля кананічны фінал п'есы быў бы і больш правільным і больш уражлівым. Але хоць рашэнне фіналу спектакля застаецца спрэчным, гэта ніколькі не зніжае значнасці творчай удачы тэатра ў цэлым. Пры ўсёй яркасці рашэння асобных вобразаў спектакль атрымаўся ансамблевым, стылістычна адзіным, дынамічным і эмацыянальна насычаным.

У добрым спектаклі заўсёды многа акцёрскіх удач. Гэта ў першую чаргу адносіцца да выканаўцы цэнтральнай ролі. Без меладраматычнага надрыву, без націску і знешняга эфекту, глыбока, пранікнёна, псіхалагічна дакладна раскрывае артыст складаны і супярэчлівы ўнутраны свет свайго героя. У адрозненне ад сваіх дзяцей Ванюшын чалавек цэльны, моцны. Гэта натура самабытная, глыбока нацыянальная. Але для яго быццам спыніўся бег часу. Ён мог бы, як горкаўскі Булычоў, усклікнуць: «Не на той вуліцы я нарадзіўся». І артыст К. Шышкін не шкадуе свайго героя, ён і не судзіць яго збоку, ён проста жыве яго думкамі і яго пачуццямі.

Роля Ванюшына—дэбют народнага артыста РСФСР Шышкіна ў новым для яго калектыве. Можна смела сказаць: дэбют шчаслівы, шматабяцаючы.

Другая найбольш значная ўдача спектакля—вобраз Клаўдзіі, старэйшай дачкі Ванюшына, у выкананні заслужанай артысткі рэспублікі І. Лакштанавай. Смелае і вострае пластычнае рашэнне ролі ў спалучэнні з амаль анатамічным даследаваннем унутранай сутнасці вобраза пакідае незабыўнае ўражанне. Здавалася б, усё зломлена ў душы гэтай жанчыны, але як псіхалагічна дакладна, натуральна і па-свойму чалавечна актрыса раскрывае цяжкі лёс сваёй гераіні.

У тым і вартасць спектакля і заслуга занятых у ім акцёраў, што яны стварылі пераканаўчыя вобразы людзей, якія з'яўляюцца адзін для аднаго адначасова і катамі, і ахвярамі. Катамі па законах таго свету, дзе чалавек чалавеку воўк, і ахвярамі таго сацыяльнага ладу, якому спектакль мінчан выносіць бязлітасны прыгавор.

Наўрад ці можна ў межах газетнай рэцэнзіі прааналізаваць усе акцёрскія работы ў гэтым спектаклі. Перэлічэнне выканаўцаў і адзначаная ацэнка іх работы была б неадпаведная таму вялікаму ўкладу, які акцёры ўнеслі ў гэты спектакль. Можа, на прэм'еры не ўсе выканаўцы дасягнулі яшчэ той глыбіні і шматграннасці, якія закладзены ў п'есе, можа, дарэмна так «педаліруюць» і крыху спрашчаюць свае задачы выканаўцы роляў Красавіна і Шчоткіна. Але ўсе без выключэння выканаўцы могуць аднесці ўдзел у гэтым спектаклі ў свой творчы актыў. Артысты іграюць свежа, тэмпераментна, мэтанакіравана. У гэтым залог жыцця спектакля і яго далейшага мастацкага ўдасканалення.

С. КАЗІМІРОЎСКІ.

З пошты ЛіМа

РАДАСЦЬ

Хачу ад душы падзякаваць артыстам Дзяржаўнага акадэмічнага тэатра оперы і балета Беларускай ССР за цудоўны канцэрт, які яны далі ў Маскоўскім Доме ветэранаў сцэны імя Яблачкінай. Гэта быў сапраўдны канцэрт у строгім, класічным сэнсе слова, які вызначаўся адзінствам стылю і высокай якасцю выканання.

Вечар адкрыла народная артыстка СССР Л. Александроўская. Яна вельмі цёпла прывітала ветэранаў сцэны і расказала пра творчае жыццё беларускага операнага тэатра. А потым пачаліся выступленні артыстаў (у асноўным моладзі, якія глыбока пас ўсхваляваў).

Парадавалі цудоўнымі галасамі, выразнасцю выканання артысты І. Шыкунова, В. Садоўскай, І. Адзінцова, В. Ганчарэнка. Фігара — як часта бачым мы гэты класічны вобраз у выглядзе нейкага бліскучага героя, які пастаўляе напаказ сваю спрытнасць, гаварыцца ўменнем заблытаць і разблытаць інтрыгу. У выкананні ж В. Ганчарэнкі Фігара — чалавек з народа, разумны, кемлівы, вясёлы, без усялякай бравады і фанабэрыстасці. Калі ўся партыя праводзіцца на тым жа ўзроўні, што і арыя, якую мы чулі ў канцэрце, можна навіншаваць і выканаўцу, і тэатр.

Аўдыторыя Дома ветэранаў сцэны — патрабавальная. І ўсе мы былі зачараваны сапраўды высокім майстэрствам і адухоўленым выкананнем беларускімі артыстамі кожнага нумара праграмы.

Тры балетныя мініяцюры («Мелодыя» Глюка ў выкананні Н. Давыдзенка і Я. Паўловіча, танец Кошачкі і Ката са «Спячай прыгажуні» Чайкоўскага ў выкананні Р. Красоўскай і Я. Батвініка, «Пастараль» Бізэ ў выкананні В. Лапо і В. Сяркісьяна) былі сапраўднымі маленькімі шэдэўрамі харэаграфічнага мастацтва. Ні залішняй акрабатыкі, ні эксцентрыкі, ва ўсім — добры густ і мастацкая праўда.

Хочацца адзначыць таксама тонкае музычнае суправаджэнне С. Арловай і В. Крыштопенкі.

Жадаючы дарагім беларускім сябрам далейшых поспехаў, верым, што майстэрства іх год ад году будзе расці. Інакш не можа быць, калі выбраны правільны шлях.

Уладзімір ТОРСКІ,
заслужаны артыст РСФСР.

БЫЎ ТАКІ ФІЛЬМ

З АРХІЎНЫХ ПАЛІЦ

...Канец дваццатых гадоў. У маленькім гарадку Заходняй Беларусі горда сцю мясцовых улад была турма, абсталяваная па апошнім слове тэхнікі. У ёй ідзе допыт беларускага селяніна Панаса, які прыйшоў у гэты горад на заработкі. Але ён выпадкова арыштаваны паліцыяй разам з удзельнікамі забастоўкі-пратэсту супраць фашысцкага рэжыму, беспрацоўя, палітычных правакацый.

Першае пытанне традыцыйнае: «Ты камуніст?» Панас адмоўна ківае галавою. Тады следчы пачынае чытаць яму пракламацыю, знойдзеную ў арыштаванага рабочага. Тэкст яе — гэта вытрымкі з розных артыкулаў У. І. Леніна. Панас чуе зразумелыя, праўдзівыя словы, вельмі падобныя да тых, што неаднаразова прыходзілі яму ў галаву, і ён ківае галавой: так, так, так...

Чытанне перарываецца і гучыць пытанне: «Дык ты, значыцца, камуніст?» Селянін адказвае, што не. Чытанне працягваецца. Панас зноў здзіўлена і адабральна пачынае ківаць галавой. Словы выклікалі ў памяці перажытае ім самім — як біўся над сваёй палоскай, як за падатні давялося апошні хлеб вывезці. Але ўсё роўна ён працягваў верыць у дапамогу бога, у літасць кулака Платона Тарасевіча, да якога ў парабкі падаўся са сваім конікам — адзіным кармільцам. Конь не вытрымаў непасільнай працы, здох. А Панас вось вытрымаў. Кінуўся ў горад працу шукаць, а замест гэтага ў турме чамусьці апынуўся...

«Дзівосная сцэна!» — так высока ацаніла гэтыя кадры з беларускага мастацкага фільма «Шчасце» (вытворчасць 1932 года) газета «Звязда» 11 санавіка 1935 года ў юбілейным нумары, прысвечаным дзесяцігоддзю кінематаграфіі рэспублікі. У карціне шмат недахопаў, у ёй ёсць схематызм... — гаворыцца ў артыкуле. — Але ўсё ж выдатны вобраз беларускага селяніна Панаса, які там, у Заходняй Беларусі, спрабуе знайсці сваё хоць самае маленькае шчасцейка, і не знаходзіць яго...»

Часопіс «Искусство и революция» (№№ 3—4 за 1932 год) фільм «Шчасце» ставіць у рад тых беларускіх карцін, якія вылучаюцца сваёй палітычнай актуальнасцю і завостранасцю, якія малююць у яркіх мастацкіх вобразах барацьбу за Савецкую Беларусь, мабілізуюць шырокія працоўныя масы на выкананне задач сацыялістычнага будаўніцтва.

На жаліці жаль, негатыў і копіі фільма «Шчасце» загінулі ў час Вялікай Айчыннай вайны.

Мне пашчасціла знайсці кадр з карціны. У ролі Панаса мы бачым артыста С. Панчэўнага. У стварэнні фільма ўдзельнічалі драматург М. Таўбе, двойчы лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР, заслужаны дзеяч мастацтваў БССР рэжысёр А. Файнцімер, які пазней сумесна з У. Корш-Саблінным паставіў «Канстанціна Заслонава», а самастойна «Паручніка Кіжэ», «Балтыйцаў», «Катоўскага», «Авадзеня». Аператарам быў Сяргей Чванаў, адзін са стваральнікаў папулярных фільмаў «Палескія рабінзоны», «Салавей», «Вялікая сям'я», «Качубей», «Усё застаецца людзям». Адну з галоўных роляў у «Шчасці» выконвала выдатны тэатральны рэжысёр, а тады папулярная беларуская актрыса Любоў Мазалеўская. Ролю агента паліцыі выканаў будучы народны артыст СССР, лаўрэат Ленінскай прэміі Міналай Чаркасаў.

Вядома яшчэ, што здымкі фільма «Шчасце» вяліся на Случчыне.

Фільмы, як людзі: альбо зарана старэюць, гінуць, як салдаты на вайне, або застаюцца ў летапісе мастацтва. І ў «Шчасця» свая незвычайная біяграфія і цікавы, павучальны лёс.

І. РЭЗНІК.

ВЕСТКІ З БАЛГАРЫІ

«СЛАВЯНСКІ ФАЛЬКЛОР»

Ва ўсіх славянскіх, дый не толькі славянскіх, народаў вывучэнне народнай творчасці мае даўнюю традыцыю. І трэба сказаць, што фальклор у асноўным ужо сабраны і даследаваны. Але вучоныя і даследчыкі зноў і зноў вяртаюцца да народнай творчасці як да крыніцы паходжання ўсіх літаратур, крыніцы бессмяротнага духу народаў.

Дасюль яшчэ не было даследавання, у якім бы фальклор славянскіх народаў разглядаўся ў параўнаўчым аспекце, у якім было б столькі ілюстратыўных прыкладаў з народнай творчасці ўсіх славян, ва ўсіх жанрах. І гэты прабел запаўняе кніга «Славянскі фальклор» Пвятаны Романскай (выдавецтва «Наука и изкуство», Сафія, 1970 г.).

У гэтай грунтоўнай працы прадстаўлены ўзоры усіх жанраў вуснай народнай творчасці: песні, казкі, легенды і паданні, прымаўкі, драматычныя творы і да т. п. Да кнігі прыкладзена бібліяграфія, у якой можна знайсці шмат імёнаў беларускіх даследчыкаў фальклору і назву іх прац. Чытач можа сам параўноўваць узоры творчасці славянскіх народаў усіх жанраў ад старажытнасці да сённяшніх дзён. Сярод песень тут знойдзеш беларускія «калядкі», «шчадроўкі», «вясняўкі», купальскія, жніўныя і іншыя песні. Шмат прадстаўлена ўзораў беларускіх казак. І ўсё гэта — на мове тых народаў, пра творчасць якіх расказваецца.

Кніга карыстаецца ў Балгарыі вялікай папулярнасцю, асабліва ў студэнтаў, навуковых і культурных работнікаў. Яна выйшла ўжо другім выданнем.

ПОСПЕХ БЕЛАРУСКАГА ЦЫРКА

Некалькі гадоў назад балгарскі цырк гасціў у Мінску. Сёлета ў Сафіі пасляхова прайшлі гастролі калектыву беларускага цырка. Усе газеты былі запоўнены добразычлівымі водгукамі прафесіянальных крытыкаў і гледачоў. «Народна культура», напрыклад, пісала 5-га чэрвеня: «У нас у гасцях цырк «Беларусь»... На арэне ўвесь час пануюць дзёрзкасць і мужнасць, грацыя і прыгажосць». Далей у артыкуле гаворыцца пра ўсіх выканаўцаў, а пра клоуна — так: «Мы ідзём у цырк і дзеля смеху. І з задавальненнем можам адзначыць, што малады клоун Свірыдэнка сапраўды творыць смех, валодае гэтай няўлоўнай матэрыяй з віртуознасцю. Усё, што ён паказвае, адносіцца да лепшых нумароў класічнай цыркавой клаунады. Свірыдэнка не таворыць ні слова, а ўмее так многа сказаць гледачам! Ён жангліруе, парадзіруе, танцуе, выконвае складаныя гімнастычныя трукі, каскады... І яго клоун жывы, чалавечны, абаяльны».

Кульмінацыяй беларускай праграмы з'яўляецца ілюзіённы атракцыён Юрыя Аверына. «Майстэрствам» ашукаць гледачоў, гэта значыць прымусіць іх паверыць у рэальнасць зусім неверагодных метамарфоз, валодае ён у дасканаласці. Артыстычная абаяльнасць Ю. Аверына, захапляючая кампазіцыя яго нумароў, мастацкае афармленне іх — усё гэта ператварыла ілюзіённы атракцыён у мажорны фінал усёй праграмы цырка «Беларусь». Гэта было сапраўднае свята дружбы нашых народаў».

Г. ВЫЛЧАЎ.

ЯНЫ ПРЫНЯТЫ Ў САЮЗ МАСТАКОЎ

Э. АГУНОВІЧ. Нарадзіўся ў 1938 годзе ў горадзе Рэчыца Гомельскай вобласці. У 1966 годзе скончыў Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут. У рэспубліканскіх мастацкіх выстаўках удзельнічае з 1966 г.

Прыняты ў Саюз мастакоў за афармленне кніг «Тарас на Парнасе», «Прыгоды дзеда Міхеда» А. Астрэйкі, «Сымон-музыка» Я. Коласа, «Глыбокая плынь» І. Шамякіна.

У. БАСАЛЫГА. Нарадзіўся ў 1940 годзе ў Слуцку. Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут скончыў у 1967 годзе. У рэспубліканскіх мастацкіх выстаўках удзельнічае з 1963 г.

Прыняты ў Саюз мастакоў за афармленне (у сааўтарстве з братам М. Басалыгам) кніг: «Энеіда навыварат» І. Катлярэўскага ,«Мая іліяда» У. Караткевіча, «Сцяг брыгады» А. Куляшова, «Акно» П. Макаля.

М. БАСАЛЫГА. Нарадзіўся ў 1942 годзе ў Слуцку. Скончыў Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут у 1970 г. У рэспубліканскіх мастацкіх выстаўках удзельнічае з 1963 г.

Прыняты ў Саюз мастакоў за афармленне (у сааўтарстве з братам У. Басалыгам) кніг: «Энеіда навыварат» І. Катлярэўскага, «Мая іліяда» У. Караткевіча, «Сцяг брыгады» А. Куляшова, «Акно» П. Макаля.

А. БЕЛАВУСАЎ. Нарадзіўся ў 1945 годзе ў Слуцку. Беларускі дзяржаўны універсітэт скончыў у 1966 г.

Прыняты ў Саюз мастакоў за шэраг мастацтвазнаўчых і крытычных артыкулаў, надрукаваных у газеце «Літаратура і мастацтва», часопісах «Нёман» і «Полымя».

У. БУЛЫГА. Нарадзіўся ў 1936 годзе ў вёсцы Канюшчы Мінскай вобласці. Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут скончыў у 1967 г. У рэспубліканскіх выстаўках удзельнічае з 1968 г.

Прыняты ў Саюз мастакоў за скульптурныя работы «Арсеналец», «Юнацтва», «Партрэт камсамольскага паэта А. Пархацкага», помнік загінуўшым воінам і партызанам у саўгасе «Шацк» Пухавіцкага раёна.

М. ГАНЧАРОЎ. Нарадзіўся ў 1939 годзе ў вёсцы Заполле Віцебскага раёна. Маскоўскі паліграфічны інстытут скончыў у 1959 годзе.

Прыняты ў Саюз мастакоў за манаграфію пра мастака К. Касмачова і шэраг мастацтвазнаўчых і крытычных артыкулаў, надрукаваных у рэспубліканскіх выданнях.

І. ГРЫГАРОВІЧ. Нарадзіўся ў 1936 годзе ў Мінску. Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут скончыў у 1965 г. У рэспубліканскіх мастацкіх выстаўках удзельнічае з 1961 г.

Прыняты ў Саюз мастакоў за карціны: «У заўтра», «Бібліятэка», «Партрэт акадэміка Камарова».

Л. ДАВІДЗЕНКА. Нарадзіўся ў 1941 годзе ў Мінску. Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут скончыў у 1967 годзе. У рэспубліканскіх мастацкіх выстаўках удзельнічае з 1970 г.

Прыняты ў Саюз мастакоў за скульптурныя работы: «Сяброўкі», «Галава гімнасткі», праект « помніка ахвярам курлоўскага расстрэлу ў Мінску (у сааўтарстве з Л. Зільберам).

У. ДЗЯМЕНЦЬЕЎ. Нарадзіўся ў 1926 годзе ў горадзе Нова-Украінка, Кіраваградскай вобласці. Усесаюзны дзяржаўны інстытут кінематаграфіі скончыў у 1962 г.

Прыняты ў Саюз мастакоў за афармленне кінафільмаў «Трэцяя ракета», «Саша-Сашанька», «Я, Францыск Скарына», «Каханая», «Праз могілкі», «Іван Макаравіч».

Л. ЗІЛЬБЕР. Нарадзіўся ў 1941 годзе ў Віцебску. Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут скончыў у 1967 г. У рэспубліканскіх мастацкіх выстаўках удзельнічае з 1970 г.

Прыняты ў Саюз мастакоў за скульптурныя работы «Рабфак», «Двое», «Мацярынства», праект « помніка ахвярам курлоўскага расстрэлу ў Мінску (у сааўтарстве з Л. Давідзенкам).

Г. ІВАКІН. Нарадзіўся ў 1930 годзе ў Бабруйску. Беларускі дзяржаўны тэатральна мастацкі інстытут скончыў у 1966 г.

Прыняты ў Саюз мастакоў за афармленне спектакляў «Юнацтва бацькоў» у народным тэатры Дома культуры Мінскага аўтазавода, «Босая птушка» ў Гродзенскім абласным драматычным тэатры, «Два клёны» ў Тэатры юнага гледача ў Мінску.

І. КАПЯЛЯН. Нарадзіўся ў 1936 годзе ў Бабруйску. Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут скончыў у 1966 г. У рэспубліканскіх мастацкіх выстаўках удзельнічае з 1962 г.

Прыняты ў Саюз мастакоў за жывапісныя і графічныя работы «Агеньчык», «Трывога», «Пралог», плакат «Першыя дэкрэты Савецкай улады».

А. КРАЎЧУК. Нарадзіўся ў 1936 годзе ў Брэсце. Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут скончыў у 1966 г.

Прыняты ў Саюз мастакоў за афармленне балета «Спячая прыгажуня», оперы «Травіята» ў Беларускім дзяржаўным акадэмічным тэатры оперы і балета, аперэты «Пяе жаваранак» у Беларускім дзяржаўным тэатры музычнай камедыі, камедыі «Аднуль грэх» у Беларускім дзяржаўным акадэмічным тэатры імя Я. Купалы.

М. ЛАЗАВЫ. Нарадзіўся ў 1940 годзе ў горадзе Эліста. Маскоўскае вышэйшае мастацка-прамысловае вучылішча скончыў у 1967 г. У рэспубліканскіх выстаўках удзельнічае з 1967 г.

Прыняты ў Саюз мастакоў за серыю графічных лістоў «Песні грамадзянскай вайны», экслібрысы Барышава, Судлянкова, Мінаева, Раманава, Талыбава, Ягорава, Гапана, Марцінкоўскага, Гляноўскага, Стрэльцеса.

М. ПЛУЖНІК. Нарадзіўся ў 1914 годзе ў вёсцы Шасцерня Днепрапятроўскай вобласці. Нікалаеўскі мастацкі тэхнікум скончыў у 1935 г. У рэспубліканскіх мастацкіх выстаўках удзельнічае з 1951 г.

Прыняты ў Саюз мастакоў за карціны «На Нёмане», «Возера Белае», «Нёман. Цішыня», «Сакавік», «Вясна», «Ля сівога Нёмана», «Гродна. Азотна-тукавы завод».

В. ШМАТАЎ. Нарадзіўся ў 1936 годзе ў пасёлку Каморын Гомельскай вобласці. Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут скончыў у 1962 г. Кандыдат мастацтвазнаўства.

Прыняты ў Саюз мастакоў за манаграфію пра мастака М. Філіповіча і шэраг мастацтвазнаўчых і крытычных артыкулаў, надрукаваных у рэспубліканскіх і цэнтральных выданнях.

М. ЯКУНІН. Нарадзіўся ў 1924 годзе ў вёсцы Ябланавец Тамбоўскай вобласці. У 1957 г. скончыў Саратаўскае мастацкае вучылішча.

Прыняты ў Саюз мастакоў за афармленне спектакляў «Навальніца», «Казкі старога Арбата» ў Гродзенскім абласным драматычным тэатры.

КАНЦЭРТЫ НА СЕНАЖАЦЯХ

Быў суботнік. Работнікі культустаноў райцэнтра працавалі на сенажацях Грэбеньскага аддзялення саўгаса «Жыткавічы», дапамагалі рабочым нарыхтоўваць кармы для жывёлы.

І вось наступіў абедзенны перапынак. Людзі разгаркулі пакункі, сілкуюцца, перакідваюцца жартамі. Члены агітбрыгады раённага Дома культуры пад кіраўніцтвам загадчыцы аўтаклуба Галіны Тарасюк рашылі наладзіць хлебаробам культурны, вясёлы адпачынак. Метадыст Дома культуры Валянціна Катвіцкая аб'яўляе: «Пачынаем канцэрт мастацкай самадзейнасці. Беларускі народны танец «Радасць» выконваюць Галіна Тарасюк і Вячаслаў Зелін». Хораша танцуюць яны на зялёным дыване. Гледачы ўзнагародзілі іх бурнымі апладысментамі. Баяніст Леанід Марголін зайграў малдаванскі танец «Псок». Тарасюк і Зелін па-майстэрску выканалі і гэты танец.

Надвячоркам члены агітбрыгады заехалі на сенажаць, што непадалёк ад вёскі Найда.

І. НОВІКАЎ.

ВІНШУЕМ З ЮБІЛЕЕМ!

...І ТАЛЕНТУ НЕ ЗАЙМАЦЬ

ЗАСЛУЖАНАМУ ДЗЕЯЧУ КУЛЬТУРЫ БССР АДАМУ ЧОПЧЫЦУ — ПЯЦЬДЗЕСЯТ

Жыве ў Гродне чараўнік. Але скажыце яму самому, што ён чараўнік, мабыць, пабачыце іранічную ўсмешку. Затое многія, з кім яму даводзіцца працаваць, такім яго ўспрымаюць. Пагаварыце пра Адама Сідаравіча Чопчыца ў Гродзенскім музычна-педагагічным вучылішчы, дзе ён выкладае харавыя дысцыпліны амаль дванаццаць гадоў, і вы даведаецеся, што па падручніках, якія склаў гэты педагог, вучацца нотнай грамаце і спевам тысячы школьнікаў Беларусі, што ягонымі метадычнымі распрацоўкамі выкладання музыкі ў агульнаадукацыйнай школе карыстаюцца ўсе настаўнікі. Вам скажуць у вучылішчы і тое, што ён арганізаваў узорны метадычны кабінет для студэнтаў і педагогаў і кіруе педагагічнай практыкай будучых выкладчыкаў спеваў і музыкі. Многія яго выхаванцы ўзначальваюць гурткі мастацкай самадзейнасці і называюць сябе «вучнямі Чопчыца». Акрамя гэтага, вам нагадаюць, што да прыезду ў Гродна педагог А. Чопчыц быў дырэктарам школы ў Ганцавічах і адначасова закончыў завочнае аддзяленне педагагічнага інстытута. Потым ён быў запрошаны на работу ў Пінскае педагагічнае вучылішча і зноў адначасова стаў студэнтам — цяпер ужо харавога аддзялення Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі. У Пінску ж Адам Чопчыц арганізаваў вядомы ў рэспубліцы хор палескай песні, для якога ў тутэйшых вёсках запісаў безліч народных мелодый. Вянок гэтых запісаў у апрацоўках Адама Сідаравіча выйшаў з друку ў выдавецтве «Беларусь».

Да гэтых звестак у Гродзенскім абласным упраўленні культуры вам дададуць, што А. Чопчыц усе гады ўзначальвае журы розных аглядаў і фестываляў, кіруе ў вобласці святамі песні, з'яўляецца стваральнікам праграм наказаў мастацкай самадзейнасці Гродзеншчыны ў Мінску. Што датычыць дзейнасці ансамбля «Нёман», дык пад кіраўніцтвам Адама Сідаравіча гэты калектыў выступаў перад дэлегатамі XXIII з'езда КПСС у Маскве і ўдзельнікамі юбілейных урачыстасцей, прысвечаных 50-годдзю Кампартыі Беларусі і Беларускай ССР, на Выстаўцы дасягненняў народнай гаспадаркі і ў Зорным гарадку касманаўтаў, перад працоўнымі Адзсы, Кішынёва і ў гарадах Польскай Народнай Рэспублікі...

Так, дзейнасць Адама Чопчыца на дзіва шматбаковая, і ўмее ён адначасова натхнёна займацца некалькімі справамі. І ўсё ж найбольш ярка плён яго творчай працы раскрываецца ў мастацкіх здзяйсненнях ансамбля «Нёман». Калі мы чытаем у водгуках на канцэрты гэтага ансамбля, што яго мастацтва «сапраўды народнае па сутнасці сваёй, па духу, па характары, манеры выканання; яно ярка нацыянальнае непаўторнасцю налярыту, зместам рэпертуару, афармленнем праграмы» (Ніл Гілевіч), дык ведаем, што адна з асноўных прычын такой высокай ацэнкі — непаўторнасць таленту кіраўніка «Нёмана».

Мастак патрабавальны, нават прыдзірлівы да сябе і да іншых, ва ўзаемаадносінах з самадзейнымі артыстамі — вельмі чулы іх сябра. І не толькі тады, калі іх аб'ядноўвае агульная мэта ў мастацтве. Калі трэба каму палепшыць жыллёвыя ўмовы, атрымаць путёўку ў санаторый, уладкаваць дзіця ў яслі або навучальную ўстанову — Адам Сідаравіч першы памочнік і дарадца. А колькі энергіі аддае мастацкі кіраўнік «Нёмана», каб забяспечыць рэпетыцыі і канцэртныя падарожжы! Кожны ж удзельнік яго ансамбля з'яўляецца рабочым, служачым або навучэнцам.

Цудоўныя арганізатарскія здольнасці, вялікая чалавечая абаяльнасць Адама Чопчыца захапляюць прафесіянальных паэтаў і кампазітараў Беларусі, і яны ахвотна ствараюць для «нёманцаў» арыгінальны рэпертуар. Больш таго, часам прэм'ера песні ў Гродне бывае найвялікшым святам аўтара.

Многа можна і трэба расказаць пра Адама Сідаравіча, але яму другога жніўня споўнілася ўсяго 50 гадоў, і наперадзе яшчэ столькі здзяйсненняў! Ён літаральна пераноўнены планамі і творчымі задумамі — смелымі, арыгінальнымі, здольнымі захапіць кожнага. Няхай і наступныя гады жыцця Адама Чопчыца даюць беларускаму мастацтву такі ж плён, як і да гэтых дзён. Энергіі і таленту юбіляру не займаць.

І. НІСНЕВІЧ.

На Заходняй Дзвіне.

Фота Э. ТРЫГУБОВІЧА.

Жэня ЯНІШЧЫЦ

Ёсць на свеце дзень барвовы—
вечаровы—
Пасля тлуму і грымот,
і мітусні,
Калі словы заціхаюць.
А дубровы
Выступаюць у зялёнай цішыні.

Ёсць на свеце дзень барвовы—
вечаровы,
Дзень надзеі і няпройдзеных
арбіт,
Калі глухнуць надаеўшыя
размовы
Пра хваробу, пра надвор'е
і пра быт.

Ёсць на свеце дзень барвовы—
вечаровы,
Дзень пакаяння і дзень,
які баліць
За учынкі, за напісаныя словы,
Што ні вырваць, ні спаліць
і не забіць.

Ёсць на свеце дзень барвовы—
вечаровы,
Дзе забыты і нягоды,
і радня,
Калі час збліжае нас
не выпадкова
Да наступнага ўзыходзячага
дня...

Ёсць на свеце дзень цікавы —
вечаровы...

МАІМ СЯБРАМ

Калі не мне—дык кожны міг
Сябрам маім хай праясніцца,
Каб потым мне, як да крыніцы,
Прыйсці ў спакотны дзень да іх.

Калі не мне заўжды любіць —
Сябрам у гэтым хай
пашчасціць.
Каб потым я сваё няшчасце
Змагла пароўну падзяліць.

Калі не мне мой голас чуць,
Калі не мне ісці па травах —
Сябры мае хай злева й справа
Замоўкнуць песні не дадуць.

І ў горы з сонцам папалам,
І ў вечных пошуках, і ў быце,
Калі не мне—маім сябрам
Глыбей у сэрца зазірніце.

●

Назад, назад вяртае
ноч мяне,
Вяртае ў час, вяртае без
прынукі,
Дзе ў цішыні перапляліся рукі,
Нібы галлё густое па вясне.

(Назад, назад вяртае
ноч мяне...)

І я іду, бягу па той зямлі,
Па тых слядах, што толькі
напалову
Забылі нашу шчырую размову
І багуном, і цёрнам прараслі.

(Па тых слядах іду,
па той зямлі...)

Па тых вятрах лячу,
што праляцелі,
Па тых барах, якіх даўно няма,
Па памяці, якой была сама
У час вясны і шумных
летуценняў.

(Па тых вятрах лячу,
што праляцелі...)

Ды ўжо прашу я ў дня,
што наступае,
Ахоўнага і яснага крыла,
Дзе на краі палескага сяла
Мяне яшчэ камусьці не хапае.

(Хай пралятае ноч,
хай пралятае —
Я знаю сувязь змроку і святла!)

●

Я абяцаю вам зямлю
І ў дождж, і ў бездараж,
і ў буру,
І ў дзень, загадкавы і хмуры,
І ў дзень, які сама люблю.

Любіце гэты дзіўны дзень,
Сатканы з мужнасці і з волі,
І з той дарогі, што ніколі
Ў чужы прастор не павядзе.

Завіце гэты дзіўны дзень,
Сатканы з розных траў гаючых.
І з верасоў, і з руж калючых.
Ідзіце ў гэты дзіўны дзень —

Там гул вятроў, там бег ласёў,
Там водар з лепшага настою,
Я абяцаю вам усё —
Апроч здранцвелага спакою.

●

Без тостаў святкую сваю
перамогу
Над першай памылкай
першаю здрадай.
Без памяці вешу вясноваму
рада,
Што будзіць далёкую ў сэрцы
дарогу.
Яшчэ толькі раніца мною
пражыта.
Наперадзе поўдзень
і вечар салодкі.
Упалі загоны зялёнай
паводкай
На чуйныя грудзі зямлі
старажытнай.
І фарбы змяніліся ўжо
невыразна
На шэра-малінавым полі
змяркання.
Зайшлася надоўга над возерам
кзня
І слухаюць каню драчы
без адказу.
Ці бачу, ці чую, ці можа мне
сніцца
Дажыннае свята і ўсмешка
матулі?
І новыя спевы душу захліснулі
У краі, якому іду пакланіцца.

ЁН БЫЎ У ПОШУКУ

Малады, поўны няўрымслівых пошукаў, захоплены справай да самазабыцця, улюбёны ў Янку Купалу, у літаратуру, у тэатр, у роднае слова... Такі быў Мікола Дзяшкевіч—навуковы супрацоўнік музея Янкі Купалы, верны сын Ленінскага камсамола.

На вялікі жаль, даводзіцца гаварыць пра яго ў прошлым часе.

Наш дарагі Мікола загінуў. Загінуў трагічна, ратуючы тапельца. Загінуў на бацькоўскай зямлі, у Панямонні, куды прыехаў пагасцяваць.

Пражыта зусім мала. Толькі дваццаць чатыры. А зроблена даволі шмат, калі ўлічыць няспынныя пошукі ім сваёй дарогі ў жыцці. Марыў аб тэатры, не пераадолеў конкурснага бар'еру. Паступіў на бібліятэчны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута, а жыў тэатрам.

Музей захапіў яго моцна, хоць мара пра тэатр не пакідала юнака. Яшчэ светлыя ў памяці ўсхваляваныя Міколавы эсэ і артыкулы, што з'яўляліся на старонках рэспубліканскага друку ў дні юбілею тэатра імя Янкі Купалы. А зусім нядаўна ў «Звяздзе» — разважлівае, заклапочанае выступленне пра маладую змену тэатра імя Якуба Коласа.

Яго любілі, шанавалі ў абодвух нашых дзяржаўных нацыянальных тэатрах як свайго найлепшага друга...

Яго любілі, паважалі ў Літаратурным музеі Янкі Купалы.

Мы цешыліся кожнай яго ўдачай. А іх было шмат. Пачынаючы ад даследавання «Янка Купала і развіццё бібліятэчнай справы ў Беларусі», і канчаючы апошнім, прынятым да друку ў часопісе «Полымя», грунтоўным артыкулам «Радаводная Янкі Купалы». Мы цешыліся кожнай Міколавай экскурсіяй, бо яна была заўсёды актам творчасці. Пра гэта— шматлікія запісы ў кнізе водгукаў музея.

Жыццялюбам застанецца Мікола ў памяці шматлікіх гасцей Дома Купалы, якім даводзілася слухаць яго натхнёныя словы пра паэта, у памяці многіх тысяч юных тэлегледачоў, для якіх ён рэгулярна выступаў як вядучы школьнага цыкла перадач пра беларускую літаратуру.

Не, не верыцца, што мы не пачуем Міколавага ўзрушанага голасу, не ўбачым яго прамяністых вачэй — светлых, як вада Нёмана, на берагах якога прайшло яго маленства.

Бывай, наш дарагі, незабыўны Мікола.

Ул. ЮРЭВІЧ, Т. ТАРАСАВА, Я. РАМАНОЎСКАЯ, Л. КОПАЦЬ, Ж. ДАПКЮНАС, А. ЕСАКОЎ, П. МІХАЛАП, навуковыя супрацоўнікі Літаратурнага музея Я. Купалы.

СТАРЫ ГАНЧАР

Зараз ганчара рэдка стрэнеш на Беларусі. Трэба доўга ляцець над блакітным зялёным азёр, імчаць машынамі, ды яшчэ ў дадатак колькі кіламетраў ісці пехатою, каб апынуцца недзе ў такім куту...

На двары, што парос муравою, ля штабеляў дроў узнікае пажылы палавек, крыху падазрона глядзіць, а, даведаўшыся, што ты цікавішся, як гэта гаршкі робяцца, з нейкай радасцю, нават хваляваннем вядзе да гумна, дзе ляжаць горы гаршкоў, да вялікай печы-горана. А потым, нібы ты яго вучань, пачынае вымешваць гліну. Спачатку — босымі нагамі на падлозе ў вялікай кухні, што адначасова і майстэрня—вакол дзесяткі белаватых гарлачкоў, жбаноў, місак, якія сохнуць на доўгіх дошках, чакаючы абпалу. Босыя ногі з падкасанымі штанінамі хутка пераступаюць на гліне, пакідаючы глыбокія ямкі ад пятаў.

— Не тая ўжо сіла,—апраўдваецца Антон Такарэўскі. — Ганчар, як каваль, сілу павінен мець. А я пажыў ужо, многа чаго было...

Ногі працуюць, а твар спакойны, позірк пранікнёны, разумны.

— Няма ўвагі нам, ганчарам. Раней мы былі жаданыя ў кожнай вёсцы, на кожным рынку. Многа тут работы—з імі, гаршкамі,—ён прыбраў гліну з падлогі на доўгую шырокую лаву, адрывае ад яе на ладнаму кавалку і, падсыпаўшы дробненькага пясочку, як гаспадыня, вымешвае цеста рукамі на шырокім стале; месіць энергічна, спрытна, у гэтым ёсць нешта няўлоўна-прыгожае.

— Тут адразу і не навучышся. Некалі гады два вучыўся, а потым усё жыццё. Гліну трэба добра размяць, каб яна была без камякоў. Лепш каб падсохла на двары, а тады ліцуў вады—яна і разышлася. І гліну не кожную бяры. Ведаць трэба, якая добрая. Аднойчы экскаватар для завода браў—дык ён усё падрад, а я папрасіў у адным месцы. Знаю—добрая там гліна. І не першы пласт бралі, знялі зверху многа, а потым—з-пад нізу.

На стол кладуцца ў рад усё новыя катанкі. Майстар адрывае ад іх па невялікім кавалку («Трэба, каб акурат хапіла на жбан ці на місу, не болей і не мецей») і хутка-хутка разразае туды-сюды тоненькім дроцікам, па канцах якога прыкручаны палачкі, зноў вымешвае і кладзе, нарэшце, недалёка ад ганчарнага круга. Карычневыя кавалкі акуратныя, з прыемным матавым бляскам, як шакалад, хочацца дакрануцца да іх, пакаштаваць.

І вось майстар—за кругам. Ён умошчваецца за ім нават з нейкай урачыстасцю. Лава ў тым месцы, дзе ён сядзіць, адпаліравана да бляску, яна вышэй, чым звычайнае крэсла, бо ногі майстра—зноў босыя—павінны ледзь датыкацца да ніжняга масіўнага драўлянага махавіка, на адным валу з якім знаходзіцца зверху невялічкі ганчарны круг. Мяккі дотык да махавіка пальцамі ног, і круг з кавалкам гліны пачынае вярцецца. Шпарчэй, шпарчэй. Майстар акунае рукі ў ваду, дакранаецца да кавалка гліны, акругляе яго, зноў макае рукі ў ваду, і тады пачынаецца тое здзіўляючае, якое захапляе амаль неверагоднасцю. Гліна ажыла ў руках ганчара, паслухмяна ляпчыцца да яго тонкіх чулых пальцаў. Вось ён, жывы круг, падаўся ў бакі, выцягнуўся ўгору, расце аднекуль знізу, па ім прабягае знізу ўверх вострая хваля, пашыраючы яго. Яшчэ адна хваля—да сярэдзіны, яна акруглілася, набыла прыгожы абрыс. Гарлавіна раптам звузілася, верхні венчык адвярнуўся. Глякі. Круг спыняецца. Майстар наклейвае ручку, падразае гляк знізу тонкім дроцікам, ласкава абхоплівае далонямі, здымае і ставіць на дошку.

Адкуль гэтыя чыстыя, дакладныя і нават вытанчаныя формы? Адкуль такія адпрацаваныя рухі, прыёмы?

— Раней у нас тут стаяў другі ганчарны круг. З братам рабілі. А ганчары па нашай вуліцы праз аднаго жылі. Кожны меў сваю печ. Некалі на кірмаш збярэцца цэлы абоз, фурманак з дзесяць...

У вачах майстра летуценная цеплыня. І да гэтага часу вабіць яго рамантыка падарожжа. Не, не на машыне, што грукоча, узнімае воблакі пылу—нават не разгледзіш ні дрэва, ні вёскі, ні поля. Паволі крочылі коні па звілістай ціхай дарозе, рыпелі поўныя вазы, ухутаныя посцілкамі, колы каціліся па глыбокіх калянах. Духмяна кружылі галаву маладыя сасновыя лясочкі, густым водарам несла ад свежых пакосаў, шапацела на палосках збажына. Калі яны праязджалі, людзі спыняілі на хвіліну работу: «Ганчары едуць». А ноччу, калі прачыналіся, бачылі над сабой зоркі, побач мірна пасвіліся коні, гарэла спаквала невялічкае вогнішча.

Можа, не самае галоўнае ў мастацтве навучыцца розным прыёмам. І, мабыць, не ўсё вырашае дасканаласць і вытанчанасць. Нават калі табе самому падабаецца тое, што ты зрабіў,—гэта не будзе сапраўдная творчасць. Стары хваляваўся, яму было балюча і горка і за сябе, і за сваё майстэрства.

А ён, гэты майстар, — рамантык, жыве ўспамінамі.

Мастацтва, якому ён аддаў сябе цалкам, красавала на нашай зямлі два тысячагоддзі. У гэта нават цяжка паверыць. Але археолагі пацвярджаюць: такі ўзрост налічвае першая славянская кераміка на Піншчыне. Мы хадзілі разам са старым хударлявым археолагам па цемнаватых залах Пінскага музея, ён гаварыў пра розныя археалагічныя рэчы, а я дзівіўся здабытай

«ВЫ ТВОРЫЦЕ ЦУДЫ...»

«Мне вельмі хочацца мець Вашу прыгажосць у сваім доме і пакінуць сваім дочкам добрую і светлую памяць аб залатых руках беларускіх людзей...»

В. Субоціна (Варонежская вобласць).

«Убачыла Ваш ручнік і ўлюбілася ў беларускі ручнічок, пакуль яго не будзе ў маёй украінскай хаце, не будзе і шчасця...»

М. Думанава (Харкаўская вобласць).

«Вы творыце цуды. А вашы рукі расказалі пра працу, ласку і жаночую долю. Дазвольце па рускаму звычаю пакланіцца Вам да зямлі».

Н. Прудніцкая (Свярдлоўская вобласць).

Бясконцым патокам ідуць такія пісьмы з ўсіх куткоў краіны, ў адрас Пінскай фабрыкі мастацкіх вырабаў. Праца самадзейных мастакоў і майстроў гэтай фабрыкі атрымала заслужаную ацэнку. Каля 30 дыпломаў Усесаюзнай і больш за 20 дыпломаў Рэспубліканскай выстаўкі-конкурсу твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і народнай творчасці атрымалі яны ў мінулым годзе.

Сярод дыпламантаў — ганчар П. Гмыр, майстар бераснцяных і саламяных спраў П. Пашко, бондар П. Корсак, ткачыха М. Данілюк, інкрустатар Л. Прэлоўская, разьбяр па дрэве А. Ступак, майстры пераробнага ткацкага А. Данілевіч, О. Лукашэвіч, П. Новік і многія іншыя.

Асобна хочацца сказаць пра Праскоўю Калініпкаўну Новік, якая, працуючы трыма колерамі — белым, зялёным і чырвоным (колеры Дзяржаўнага флага БССР), умее перадаць дзіўную прыгажосць палескіх ручнікоў, слава якіх даўно распаўсюдзілася за межамі нашай рэспублікі.

У. БАРАВІКОЎ.

З ЭМБЛЕМАЙ «ПАЛЫМНЕЮЧЫ ФАКЕЛ...»

У 1961 годзе ў школе № 4 г. Слоніма быў адкрыт гісторыка-краязнаўчы куток. Яго экспазіцыю складалі некалькі дзесяткаў фатаграфій і дакументаў ды дзесятак-другі рэчыўных экспанатаў. А ўжо праз дзевяць гадоў стваральнік і кіраўнік школьнага музея настаўнік гісторыі Аляксандр Сямёнавіч Жукоўскі быў удастоены залатога медаля ВДНГ. Музей гарадской школы карыстаецца прызнаннем ў рэспубліцы. У выдавецтве «Народная асвета» сёлета выходзіць брашура «Музей баявой і рэвалюцыйнай славы». У ёй абагулены вопыт работы юных краязнаўцаў 4-й Слонімскай школы. А нядаўна ў рашэнні гыканкома Слонімскага гарадскога Савета дэпутатаў працоўных былі запісаны такія радкі: «За вялікую работу па ўвекавечанні памяці воінаў, якія загінулі ў барацьбе за Савецкую ўладу, і поспехі па ваенна-патрыятычным выхаванні моладзі прысвоіць школьнаму музею званне народнага і ў далейшым называць «Народны музей рэвалюцыйнай і баявой славы СШ № 4 г. Слоніма».

Цяпер у школьным музеі звыш трох тысяч экспанатаў асноўнага фонду.

Палымнеючы факел — эмблема школьнага музея — ярка і выразна адлюстроўвае напрамак работы юных краязнаўцаў. Чырвоныя следапыты ў паходзе. Пошук невядомых герояў працягваецца.

М. РЫЛЬКО.

з зямлі кераміцы, што стварылі беларускія майстры аж два тысячагоддзі назад—у антычныя часы! Яна мела амаль дакладна тыя ж дасканалыя формы, што і сёння.

Мне ўвесь час не даюць спакою гэтыя дзве тысячы гадоў—уражвае ўстойлівасць аднойчы знойдзеных ганчарных форм. Дзяржавы ўтвараліся і знікалі, агнём абпальвалі зямлю варожыя нашэсці, блукала з чорнай касой чума і халера. А ганчар, скінуўшы з сябе цяжкую кальчугу, здымаў плеценыя са скур пасталы і ўрачыста, быццам на трон, усаджваўся за ганчарны варштат. Мяккі дотык пальцаў ног да масіўнага драўлянага махавіка, і круг з глінай пачынаў круціцца. Усё шпарчэй, шпарчэй!... А побач сядзеў сын, а потым унук...

— Не магу без гэтай работы. Жонка крычыць—на што табе ўсё гэта, беражы сябе, хопіць працаваць, семдзесят гадоў ужо! А я не магу спыніцца. Не параблю—быццам хворы. Выгоднейшая ёсць справа—печы, напрыклад, класці. А я, паверце,—не магу...

Ціха, амаль пячутна круціцца ганчарны круг. Круціцца, як успаміны пра тыя дзве тысячы гадоў, што жывуць на гэтай зямлі славяне, круціцца, як сама мастацкая дасканаласць, што нараджае, як прырода, адну прыгажосць за адной. Круціцца, як папрок нам, электроннамашынізаваным, якія за грукатам і інтэлектуальнымі спрэчкамі не вельмі шкадуюць такі рэлікт, як ручное ганчарства.

Віктар ГОВАР.

Пружаны.

НАРАЧ... Свіцязь... Наваполацк... Не аднаму з маладых літаратараў і мастакоў, кампазітараў і артыстаў, скульптараў і кінематаграфістаў яны напамінаюць цікавыя творчыя сустрэчы, гарачыя дыскусіі.

Тры адрасы—месцы былых семінараў творчай моладзі рэспублікі. Цяпер такія шматдзённыя сустрэчы сталі традыцыяй. Зацікаўлены ў іх і мы, камсамольскія работнікі, і творчыя арганізацыі, саюзы, аб'яднанні, бо мэта ў нас адна — камуністычнае выхаванне маладой творчай інтэлігенцыі.

Прайшло амаль два гады з часу апошняга семінара творчай моладзі. За гэты час многае зроблена маладымі майстрамі літаратуры і мастацтва. Не вузенькія тэмы, не дробязныя пачуцці, а яснасць грамадзянскай пазіцыі, пафас барацьбы і сцвярджэння ідэалаў камунізма — вось што вылучае большасць сённяшніх твораў маладых. Гэтыя творы актыўна дапамагаюць у вялікай справе камуністычнага выхавання.

Па ініцыятыве камсамола рэспублікі прайшлі конкурсы прозы і паэзіі, фестываль маладых выканаўцаў камсамольскай песні, адбылася выстаўка твораў маладых мастакоў, скульптараў, архітэктараў, прагляды і абмеркаванні новых кінафільмаў. Камсамол заўсёды быў надзвычай уважлівы да творчай інтэлігенцыі, яе работы. Гэта ўвага праяўляецца і ў тым, што ЦК камсамола рэспублікі рэгулярна праводзіць конкурсы на лепшыя творы літаратуры і мастацтва аб камсамоле і моладзі. Сёння сярод лаўрэатаў прэміі Ленінскага камсамола Беларусі — пісьменнікі Аркадзь Куляшоў, Іван Навуменка, Алесь Савіцкі, мастакі Наталля і Георгій Паплаўскія, Май Данцыг, аўтары мемарыяльнага комплексу «Хатынь», кампазітар Ігар Лучанок, кінематаграфісты Леў Голуб, Кастусь Губарэвіч і многія іншыя.

У той жа час трэба прама сказаць, што камсамол занепакоены абыякавасцю некаторых маладых аўтараў да вялікіх праблем часу, праблем духоўнага жыцця моладзі. Спадзеючыся на свой талент, яны перастаюць сур'ёзна працаваць над сабой, рана вычэрпваюць запас жыццёвых назіранняў, асабістага вопыту, рана трацяць творчую актыўнасць.

У барацьбе за выкананне гістарычных рашэнняў XXIV з'езда КПСС і праграмы новай пяцігодкі фарміруюцца высокія маральныя якасці савецкага чалавека. Даследаванне яго духоўнага свету — сутнасць літаратуры і мастацтва сацыялістычнага рэалізму, неабходная ўмова пранікнення ў глыбіні жыцця, а значыць—і эфектыўнага ўздзеяння на падрастаючае пакаленне. Вось тут супадаюць задачы, пастаўленыя жыццём перад камсамолам і творчай інтэлігенцыяй. Нельга не сказаць, каб творчая моладзь не імкнулася як мага глыбей працаваць над вобразам нашага сучасніка. Але не заўсёды яна дамагаецца таго, чаго шукае, не заўсёды знаходзіць тое, што трэба. Дае сябе ведаць слабае пранікненне ў жыццё, адсутнасць фактычнага матэрыялу, няўменне разабрацца ў складаных сітуацыях, канфліктах. Уласнае жыццё, асабліва маладое, не заўсёды з'яўляецца дастатковым фундаментам для глыбокай творчасці.

ЛЯЦЕЦЬ У ВЫШЫНЮ

ПАСУСТРАЧ IV РЭСПУБЛІКАНСКАМУ СЕМІНАРУ ТВОРЧАЙ МОЛАДЗІ

На ўдарных камсамольскіх будоўлях Беларусі сёння працуе звыш 20 тысяч маладых будаўнікоў і мантажнікаў. Ім не заўсёды лёгка. У іх жыцці нямала канфліктаў маральных і сацыяльных. У барацьбе з цяжкасцямі, у сутыкненні характараў, пёсаў гартуецца камсамольская сталь. І як хораша было б пераліць гэтую сталь у мастацкія творы!

А хіба не цікава для творчага работніка бліжэй пазнаёміцца з калгасам імя Жданава Лунінецкага раёна? Каля 200 камсамольцаў працуе ў гаспадарцы. Далёка за межамі раёна ідзе пра іх добрая слава. Тут, здаецца мне, хопіць матэрыялу і для нарысіста і для раманіста. Трэба толькі пажыць з гэтымі людзьмі, адчуць іх будні, іх душы.

А колькі яшчэ такіх адрасоў можа даць маладому творчаму работніку жыццё! Колькі багатых душ можна раскрыць перад творцам!..

Вось Уладзімір Платонаў — наш малады сучаснік. У 26 гадоў—доктар навук. У 28—прафесар, член карэспандэнт АН БССР. Выключнасць? Не! У рэспубліцы кожны трэці вучоны—малады чалавек ва ўзросце да 30 гадоў.

Або — маладыя інжынеры завода імя Арджанікідзе. Колькі творчых пошукаў, энтузіязму ўклалі яны ў стварэнне айчыннай вылічальнай тэхнікі!

Нездарма, не выпадкова Леанід Ляонаў гаварыў: «Цяперашні літаратар павінен пайсці зранку за сваім героем у лабараторыю, у цэх, на саўгаснае поле». Гэтыя словы цалкам адносяцца не толькі да літаратараў, да ўсёй маладой творчай плыні.

Расціць сапраўдных гаспадароў жыцця, барацьбітоў-патрыётаў, стваральнікаў новага свету—агульная задача камсамола і мастацтва. Расціць у духу калектывізму і таварыскасці—асновы новых грамадскіх адносін. Абапіраючыся на гэтыя якасці грамадства і чалавека, партыя ўзняла да жыцця невычэрпныя сілы народа. Калектывізм нарадзіў шэраг палымяных герояў — будаўнікоў сацыялізма і камунізма. Калектывізм вытрымаў жорсткі экзамен мінулай вайны. Ён добра служыць нам сёння і як яшчэ паслужыць у будучым!

Гэта, безумоўна, складаная тэма для маладой творчай інтэлігенцыі. Але нам вельмі патрэбны творы мастацтва, якія б раскрывалі рост чалавечай асобы, яго калектывізм, дысцыплінаванасць, грамадзянскую мужнасць, адказнасць перад грамадствам, актыўнасць. Для маладых мастакоў няма больш пачэснай задачы, як ствараць вобраз сапраўднага героя нашага часу.

Маладому пісьменніку, мастаку хочацца падказаць і яшчэ адзін вельмі ўдзячны для творчасці пласт жыцця —будні нашай армейскай моладзі, якая са зброяй у руках абараняе заваёвы сацыялізма, справу міру.

Чацвёрты Рэспубліканскі семінар творчай моладзі, які адбудзецца ў пачатку верасня на славутай Аршаншчыне, з увагай аднясецца да гэтых і многіх іншых праблем нашай сучаснасці, нашай літаратуры і мастацтва. Дванаццаць дзён пройдуць у творчых дыскусіях, у сустрэчах з вопытнымі мастакамі, у рабоце секцый, у цікавых паходах. Яны, безумоўна, прынясуць немалую карысць удзельнікам семінара. А ўваходны білет на семінар своеасаблівы — першая кніга, першы музычны твор, першы фільм, першая роля акцёра або першая, хай яшчэ не да канца здзейсненая творчая задума і гатоўнасць прыняць самы актыўны ўдзел у гарачых дыскусіях.

Васіль ГРОДНІКАЎ,
загадчык аддзела прапаганды і культурна-масавай работы ЦК ЛКСМ Беларусі.

У ЛІТАРАТУРНЫХ АБ'ЯДНАННЯХ

ВЫ ЎСПОМНІЦЕ СВІЦЯЗЬ

Разнастайная літаратурная геаграфія нашай рэспублікі.

Скажыце «Узда» — у вашай памяці паўстануць імёны і біяграфіі тых, чые імёны ўвасабляюць сёння гонар нашай літаратуры... Полаччына... Мсціслаўшчына...

Што казаць, геаграфія нашай літаратуры разнастайная.

Няхай сёння будзе Навагрудчына, ці Наваградчына, як кажуць у нас. Яе ведаюць як зямлю, што ўскармліла геніяльнага Адама Міцкевіча. Успомніўшы Наваградчыну, вы ўспомніце легендарнае возера Свіцязь. Яшчэ ведаюць Наваградчыну як зямлю, апетую шчырымі словам тых, хто ўзгадаваўся на яе гонях. Пералік іх імёнаў заняў бы многа месца. Сёння я, шчыры прыхільнік і чытач нашых мясцовых паэтаў, рады сказаць ім добрае слова па дарозе да чытачоў «Ліма».

Іван КАЗАЧОНАК,
супрацоўнік Навагрудскага раёна.

Пятро АНДРЭЕЎ

ДУБУ АДАМА МІЦКЕВІЧА

Паклон табе, дубе, — музыка стары.
Дай сэрцам прыпасці да кроны,
Дай летапіс твой прачытаць на кары
І выслухаць шум твой зялёны.

Задумлівы сведка сівой старызны,
Ты вабіў і песціў паэта
І выкрасіў звонам пявучай струны
Гражыну, вядомую свету.

Тут ліры чароўныя гукі плылі,
Блукалі праменныя вочы.
Гарэў ён любоўю да гэтай зямлі
І слаўны ёй лёс напрарочыў.

Напевы твае і прынёманскіх ніў
У сэрцы насіў ён да скону,
І ў парках далёкіх з табой гаманіў,..
Слязой амываў тваю крону.

Панура і горда, і мудра, без слоў,
Старэючы разам з гадамі,
Не гас ты, стагнаў у абдымках вятроў
І плакаў па ім жалудамі.

Даўно ўжо злажыў свае крылы
пясняр.
І толькі чароўна і шчыра
Над светам лунае душы яго дар,
Гучыць бяссмяротная ліра.

Гасцей паважаных сцяжынка вядзе
У Шчорсы зімою і летам.
О, дубе-музыка, не крона гудзе, —
Гамонка самога паэта.

Самсон ПЯРЛОВІЧ

СЕНА

О, як скакаў я! Ды і ўсе, напэўна,
Скакалі ў торп духмяны травяны.
А ці падумаў хто, што тое сена
Жывыя рассцілала дываны?
А ці падумаў хто, што раніцою
І ў росны вечар дзесьці на лугах,
Яно, яшчэ не зрэзана касою,
Зусім не сніла аб сухіх стагах?
Травінкам, кветкам мроіліся толькі,
Калі зямлю ахутваў сіні чад,
Кароўкі божыя, спявачкі-пчолкі
І ногі цёплыя красунь-дзяўчат...

МЕСЯЦАВАЯ БАЛАДА

Мой свет канчаўся сінім небасхілам
На ветраковым зломаным крыле.
Мяне цікавасць без канца карціла
Пазнаць, пабачыць, ну, а што ж далей?

І басакогі хлапчучок няўлоўна
На ёлку ўзлазіў далі разглядаў.
А небасхіл стагамі белай воўны
Ўжо на суседні выган ападаў.
Я надвячоркам бег туды з-пад вёскі,
Насустрач мне гукалі пастухі:
«Глядзі, на Месяцы вунь пан Твардоўскі
Пакутуе за цяжкія грахі.
Душу прадаў ён д'яблу чорнай ноччу,
Кантракт сваёю падпісаў крывёй».
І мне здавалася — на бледным дыску вочы
Ад болю жмурыліся над зямлёй.
Дрожджы гадоў мяне цягнулі ўгору,
У гарызонце шлях мой патанаў,
І бурнапеннае пазнаў я мора,
І прыцягненне сэрца я спазнаў.
Два сэрцы пад нязгледжаным магнітам
Зрасталіся ў нязведаны спарыш,
А Месяц плыў і крышталём пабітым
Перасыпаў палёў начную ціш...
І раптам... Аж на край другога свету,
Размёўшы неба вогненным хвастом,
Рванулася пікастая ракета,
Зглушыла даль мільёнам капытоў.
Зямля ўсё больш гублялася ў тумане,
На прыцягненне ёй не стала сіл,
І ўчулі мы, здзіўлёныя зямляне, —
Прысела станцыя ў месяцавы пыл.
Прарок Ілья, хай грэх даруе цяжкі,
Па хмарах хоць грымеў ён шмат вякоў,
Са сваёй вогненнае каламажкі —
Не згледзеў калясніцы вось такой:
Сама спыняецца яна, калі адчуе,
Што перашкоды ёмка залягалі.
Тады ў аб'езд яе фурман скіруе.
Нябачнаю ляйчынаю з Зямлі.

ТАЁМКА

Піліп ПЕСТРАК

Апошнім часам я працую над раманам «Лесавічанка» — а заходнебеларускага жыцця. Прапаную чытачам «ДІМа» раздзел з рамана. У ім расказваецца пра падзеі, якія адбываюцца неўзабаве пасля вызвалення былой Заходняй Беларусі і ўз'яднання яе з Беларуссю Савецкай.

АЎТАР.

ГЭТА НЕ РАКА і не рэчка — гэта нястомная лясная ручаіна. Яна, нязначная для вока, прабіваецца праз баравыя сосны, дзе толькі трава-кругліца сцелецца кусцікамі, потым зноў ныра́е, хаваецца ў гушчары— то арэхавыя, то альховыя, уліваецца ў зараснікі маліны, ажыны і лапушыстай пякучай крапівы і там знікае. Яна прыціхла, стаілася, ледзь пабліскваючы цяністым бляскам там, дзе лісцястыя травы-ўюны расхінуліся над ёю, каб даць магчымасць сонечным праменьчыкам дакрануцца да патаемных, нябачных струменьчыкаў крынічнай плыні.

З травяных і ягадных гушчароў выглядаюць розныя кветкі, узгадаваныя ранкавымі росамі, якія, відаць, і далі ім колеры — то чырвона-макавыя, то ціха-васільковыя, то пушыста-белыя, то жоўтыя, як лотаць. Гэта колеры сонечнай вясёлкі. Гадуе іх не толькі вясна і лета. Залатая восень не хоча расставацца з імі. І калі тыя, што ўзраслі для вясны і лета, пачынаюць нікнуць, на іх месцы расцвітаюць асеннія ў сваёй неазнанай стракатасці. І ўвосень разам з імі чалавечае вока спыняецца найбольш на такіх спадарожніках упартай ручаіны, як клёны, ясені, грабы, вязы і рабіны з чырвонымі гронкамі. Усе яны кожны дзень абсыпаюць нястомную крынічную плынь залатым россыпам сваіх лісцяў. І цішыня лясная, блаславяючы, сочыць за ціхім неўміручым шолахам лясных таямніц...

Спытайцеся ў людзей, куды ўліваецца гэтая ручаіна, яны скажуць: «А бог яе ведае...» А як завецца— скажуць: «Таёмка»...

Такая вось Таёмка і суправаджае Лену Лесавічанку і рэдактара райгазеты Юрку Точаня. Юрка, яшчэ малады з чорнымі шорсткімі валасамі, якія не слухаюцца грэбеня, будзе пісаць карэспандэнцыі і нарысы пра тое, як насельніцтва ўспрымае ідэі калектывізацыі, — так любіць ён напышліва выказвацца. Сяло— першы іх прыпынак — ад райцэнтра за сорак кіламетраў. Юрка мае ў сваёй торбе геаграфічную карту Беларусі, і калі лясная дарога ўздоўж ручаіны пачынае здавацца бясконцай, Юрку кранае сумненне — а можа едзецца не так? І ён дастае карту, разгортвае. Нахіляе галаву да карты і Лена. Знаходзяць свой райцэнтр Лакі і пачынаюць кружыць вакол яго. Урэшце кідаецца ў вочы слова «Ракі». Значыць, едуць правільна.

Колы тарахцяць па карэннях пад навіссю старажытных дубоў. Дарога паступова спускала падарожных усё ніжэй і ніжэй. Яна рабілася ўжо чорнай, нават дзе-нідзе гразкай. Па баках праглядаўся больш альховы лес. Можна чакаць, што блізка — лясная лугавая даліна. Не — выехалі на невялікую гразкую грэблю, і конь ступіў на той прымітыўны мосцік, які ўсюды на грэблях складаецца нібы з выпадкова накіданых круглячкоў, з якіх аднаго або двух не хапае. Так яно было і тут. Не хапала аднаго бярвенца, і конь на момант спыніўся, нагнуўся, нюхнуў і, як разумны следапыт, вобмацкам пераступіў маставую праваліну. Вачам падарожных адкрылася вялікае сяло ў некалькі вуліц. Пад мосцікам бруілася іх спадарожніца-ручаінка, якая кіравалася ў долавыя хмызы. Уехалі ў шырокую пескавую вуліцу, узначаленую высокім плячыстым крыжам. Колы ўядаліся ў пясок, цяжка шаргацелі, і коник стараннa перабіраў нагамі. Падарожным трэба спыніцца перад сельсаветам. Узняліся на горку і ўбачылі, як у аддаленні над сялом высока віхрыўся чырвоны сцяг. Там сельсавет.

Пры набліжэнні Лена і Юрка ўбачылі нечаканае відовішча. Ля ганка сельсавета стаяў натоўп мужчын, жанчын і дзяцей. Мужчыны розных узростаў былі ў карычневых з валенага сукна куртках, у пакамечаных кепках і найбольш у лапцях. Жанчыны ў квяцістых хустках, у суконных, таксама карычневых камізэльках, з-пад якіх віднеліся саматканыя белыя сарочкі ў зборках вакол каўняра. Але самым адменным і нечаканым для Лены і Юркі было тое, што наперадзе натоўпу стаялі музыкі — два са скрыпкамі, адзін з флейтай, адзін з гармонікам і барабаншчык з бубнам. Як толькі фурманка стала набліжацца, ёй наперад ступіў мужчына год за сорак. Гэта быў старшыня сельсавета. Фурманка спынілася, і старшыня, зняўшы шапку, распачаў прывітальную прамову. Ён называў Лену і Юрку «дарагімі савецкімі гасцямі», гаварыў, што «народ чакаў вас даўно. І вось вы прыехалі да нас. Дзякуем». Старшыня пакланіўся, і тады грымнуў «аркестр». Лена з Юркам якраз злазілі з калёс, калі музыкі ўдарылі не што-небудзь, а «Інтэрнацыянал». Стаяў без шапкі старшыня, трымаючы кана за аброць, стаялі без шапак мужчыны. Лена збянтэжылася — што тут рабіць? Вядома, трэба выступіць з прамовай. Скончылася музыка, Лена падышла да натоўпу. Пры ёй стаяў старшыня ў афіцыйнай позе і ўсё без шапкі. Юрка астаўся пры фурманцы. Людзі, асабліва жанчыны, разглядалі Лену — шчуплую маладую жанчыну ў шэрай хустачцы з вузялком пад барадою. Паволна смялелі яе цёмна-шэрыя вочы. Галасок гаварыў пра панскую няволю, якой ужо няма, пра Савецкую ўладу, пра Чырвоную Армію, якая прынесла свабоду, пра школьніцтва, пра непісьменнасць. Закончыла Лена сваім не надта афіцыйным заклікам: «Няхай жыве наша народная Савецкая ўлада! Будзем разам будаваць наша новае сацыялістычнае жыццё! Без паноў, без буржуяў!»

Скончыла Лена і слухала аж да звону ў вушах гэтае галоснае «ўра», і музыкі зноў ударылі... «Варяга». Лена сумелася. Што за недарэчнасць? Яна падняла руку, музыкі сціхлі. Лена падышла да іх з усмешкай, падзякавала і сказала, што на сёння хопіць. Старшыня сельсавета зычна крыкнуў натоўпу: «Разыдзіся!» Лена аж ўздрыгнула — што гэта за выдумкі? — і пацягнула старшыню за рукаў у сельсавет.

У вялікай хаце з глінянай падлогай стаяў драўляны стол на крыжаках, а наакал, як прыбітыя да сцяны лавы. Там, дзе быў сямейны ложак-палок, паміж печчу і акном на вуліцу, стаяла на двух падкладках-паленах скрыня з жалезным прабоем, на якім вісеў замок: замест шафы для канцылярскіх прылад. Сцены, пабеленыя вапнай, пацямнелі ад пары, павуцінне заткала іконку ў кутку пад столлю так, што было не распазнаць, каму клалі паклоны гаспадары гэтай хаты.

Свой паходны чамаданчык, акованы на загібах бліскучастымі бляшкамі, Лена паставіла на покуць і села за стол. Старшыня з шэрымі вусамі назваў сваё прозвішча, імя і імя па бацьку — Крот Мікодым Антонавіч, потым пачасаў за вухам і, выняўшы з кішэні штаноў кісет з табакам, пачаў круціць папяросу.

— А вы, калі можна ведаць, як называецеся? — кашлянуўшы для смеласці, запытаўся старшыня.

Лена сказала:

— Будзеце называць мяне Алена Сцяпанаўна Лесавічанка.

— Лесавічанка? То вы, можа, з Палесся?

— Не. Ведаеце раку Нёман?

— Нёман ведаю, як не ведаць! У нямецкую вайну пераходзілі Нёман. Ох жа і біў па нас немец...

Пасля гутаркі старшыня ўстаў, узяў кій з таго месца, дзе некалі стаялі качэргі, і сказаў, што пойдзе праверыць, як падрыхтавана кватэра для Лены.

Калі старшыня выйшаў, Лена перанесла свой чамаданчык на стол, адкрыла яго. Там разам з іншымі рэчамі ляжала папка з тоўстым сшыткам і канверты з паперай. Раскладаючы рэчы, нечакана пачула скрабат за дзвярыма. Увайшоў старшыня. Выпрастаўся перад Ленай, як салдат, і прамовіў неяк нават урачыста:

—Пойдзем на кватэру. Вам трэба адпачыць. Сабірайцеся...

●

... Лена праз сон чуе гаманлівую гутарку і не можа ўсвядоміць, адкуль яна. Яе ўчора добра пачаставалі бульбай з квашанай капустай і малаком, палажылі ў ложак за загародкай. Напкалі сяннік свежай саломай, гаспадыня прынесла з каморы новую даматканую коўдру і посцілку ў розных колерах, дзве падушкі пад галаву. Прапанавалі спачатку — можа, госця захоча легчы ў каморы — там ложак з пярынамі, але Лена адмовілася.

Лена лыпнула вачыма і абудзілася. Вочы ўбачылі перад сабою печ, дзе пад столлю на тонкіх тычках віселі скруткі часнаку. І тут ад гаворкі, што даносілася з-за загародкі, ударыла па вушах жаночае, з рогатам, гуллівае: «Давай ожэнімося, коб ты лопнуў!» Гэта голас гаспадынінай дачкі, ужо дарослай, так што з першага погляду можна нават прызнаць за маладзіцу. У хаце жывуць толькі маці з дачкою. Відаць, прыйшоў нейкі хлапчына, і вось адкуль такі сакавіты выкрык. Лена глядзела на печ, на часнок і думала, колькі сілы, гарэзлівасці ў гэтым жаночым выкрыку. Хацелася глянуць на хлапчыну, басок якога глухавата гучаў за сцяною, але...

Пасля снядання прыйшоў Юрка Точань. Размахваючы партфелем, поўнай хадою дайшоў да стала, паціснуў Лене руку і сеў на лаву. Першым чынам расказаў, чаму сяло завецца Ракі. Гісторыя такая. Першымі пасяленцамі, жыхарамі пушчы ў гэтым месцы былі два браты. І абодва яны былі краўцамі, шылі людзям кажухі і курткі.

— Ну, то пры чым тут ракі?—перабіла Лена.

— Пачакай... На Палессі, аказваецца, ёсць такое павер'е, што ракі — гэта божыя краўцы. Вось так людзі і прозвалі гэтых братоў ракамі, а потым і сяло.

Лена смяялася. Абое былі ў добрым настроі. Юрка пасяліўся ў старшыні, які яму і расказаў пра гэтых божых краўцоў. Такім чынам, Юрка пачаў быць ужо нібы збіральнікам фальклору. Ён зараз пойдзе падслухоўваць гутаркі і песні, апісваць буслінія гнёзды на дрэвах і гумнах, хоць ведае, што свая газета такіх запісаў друкаваць не захоча. А галоўнае — Юрку трэба сачыць за тым, як будзе весціся праца на «тэму калектывізацыі». Гэта ж вялікая дзяржаўная работа, і на яго, Юрку Точаня, ускладзена адказнасць за яе выкананне тут. А Лена Лесавічанка, працаўнік райкома, дзеля чаго?» Толькі для агітацыі, — адказвае сам сабе Юрка — яна з Заходняй, усё тут ведае. Хоць і прынята ў партыю, але... асцярожна, бо партыя распушчана. Гэта не важна, што я толькі камсамолец, а яна...» Такія вось думкі снуюцца ў галаве Юркі, пасеяныя самім сакратаром райкома. І Юрка ходзіць гогалем — начальства!

Лена пачала гутарку аб плане работы ў гэтых Раках. З чаго пачаць? Тут людзі буднямі занятыя, трэба сход зрабіць у нядзелю. А нядзеля — заўтра.

— Так што ты, Юрка, падрыхтуйся выступіць, трэба ўмець адказаць на пытанні, бо пытанняў будзе многа. Калектывізацыя — гэта з'ява, ды яшчэ для тутэйшых людзей невядомая.

— Я яшчэ не думаў пра гэта. Не бойся, зробім. Толькі ты каб добра падчапіла гэтых вусатых дзядзькоў.

Юрка гатовы быў ужо інструктаваць Лену. Лена гэта адчула з першых слоў і перабіла:

— Толькі паменш газетчыны...

— Чаму — паменш? Як жа? Пішам газеты — для каго? Для народа! То чаму не можам гаварыць так, як пішам?

— Дзіўны ты, Юрка. Газетная мова — гэта мова афіцыйная, абавязковая. А тут трэба адштурхоўвацца ад канкрэтнага.

— Гэта мы знаем. Вучы вучонага, — махнуў рукою Юрка.

— Ну, калі знаеш...

Юрка нахмурыўся. Хацеў нешта сказаць, але за акном мільгануў цень. Нехта прайшоў, і хутка пачулася, як зарыпелі дзверы ў кухні.

— Я пайду ў сельсавет, — сказаў Юрка.

— У дзве гадзіны буду і я,—адказала Лена.

У хату ўвайшоў высакаваты, сярэдніх год чалавек у доўгім, гарадскога крою плашчы невядомага колеру. Ён стаў ля парога, не скідаў кепкі і не вымаў рук з кішэняў. Што за чалавек — стаіць і не вітаецца?

— Праходзьце, што ж вы сталі?

Ідучы да стала, чалавек прамовіў нібы сам сабе: «Не пазнала...» Ён стаў перад Ленай — усмешлівы, радасны, забубнеў: «турма... мама... паліто..:» Пачуўшы такое, Лена ўспыхнула, ускочыла на ногі, абняла госця:

— Косця? Коршак-Палескі!

А ў галаве яе мітусілася: «Гэта ж ён перадаў мне паліто ад мамы, калі выходзілі з турмы. Ой, Косця!»

Яна патрэсла яго ў сваіх абдымках, пасадзіла на лаву.

— Нашто ж ты так аброс барадою? Ты ж яшчэ не стары. Запусціўся тут у сваім Палессі. Дык Ракі — гэта тваё сяло?

— Маё, Лена Лесавічанка. Бачыш, сяло — як пушча: аброслае амшэлымі стрэхамі, буслінымі гнёздамі. Я пачуў ад старшыні, ад Мікодыма, што ты тут. І вось бачу цяпер. Тая самая. Толькі пастарэла.

— Ну, што ты хочаш — час...

— Пытаешся, чаму аброс барадою? — пачаў Коршак, на хвіліну задумаўся, махнуў рукою, быццам для рашучасці, і гаварыў далей: — Вось надышло жаданае вызваленне, трэба было б толькі радавацца, а тут напаткала мяне нядоля. Вось таму і затужыў. Хаджу, як сам не свой, і абрастаю барадою. Набрахаў на мяне тут адзін, напісаў пісьмо ў райком, што я прысвоіў мопраўскія грошы, калі працаваў членам акругкома партыі. Ёсць тут у нас такі, Дымша. Мы яго ў падполлі выключылі з партыі за тое, што ён выдаў дэфензіве партыйныя ячэйкі. Мы разам трапілі ў турму, і яго там выключылі з калектыву палітвязняў, як злоснага правакатара. Вас вывезлі ў цэнтральную турму, а яго пакінулі ў нашай, павятовай. Пайшоў працаваць у турэмную пякарню і шпікаваць. Вось як, дарагая Лесавічанка...

Лена ўвесь час слухала, не зморгнуўшы, пакуль не скончыў Косця.

— Адкуль ведаеш, што ён паслаў такое пісьмо ў райком?

— Яго братавая сказала, бачыла, як пісаў і чула, як, выпіўшы, пагражаў: не дарую... Яны між сабою кепска жывуць...

— Гэта трэба праверыць, Косця.

— Вось і дапамажы, Лена. На цябе адну надзея.

— Я ж толькі інструктар, Косця. Мала сяджу ў райкоме, усё на пасылках. Вось бачыш, прыслалі сюды —засноўваць калгасы... Спадзяюцца, што я тутэйшая, мяне паслухаюць...

— Аб гэтым не тужы, Лесавічанка. Тут у нас ёсць людзі са старога партыйнага актыву, мы табе паможам.

Лена з удзячнасцю паглядзела на Косцю.

— Вярнуся ў Лахі, пагавару з Ярмілавым, сакратаром райкома. Я не веру, Косця, што ты зрабіў такое злачынства.

— Лена, прашу цябе, памажы. Не магу я цярпець такога паклёпу, такой напрасліны.

— Добра, Косця, я ўсё ж такі ўжо член партыі. Думаецца, што Ярмілаў мне не адмовіць. Як толькі даведаюся пра ўсё, напішу.

— Ох, ох, парадавала, Лесавічанка... Палягчэла... Дзякую.

Коршак устаў, зашпіліў свой плашч. Лена таксама ўстала.

— Яшчэ адно, Косця. Пагалі ты сваю бараду.

— Ах ты!... — усміхнуўся Коршак і, хлопнуўшы кепкай па калене, амаль бягом накіраваўся да дзвярэй.

●

Так, гэта яна — школа. Яна і цяпер неяк вылучаецца ад усяго сяла. Не толькі таму, што стаіць на ўскраіне, крыху воддаль, але і сваім выглядам. Пачарнелыя ад часу шырачэзныя бярвенні былі абчэсаны на плаз і пагабляваны даўнімі майстрамі недзе, можа, у пачатку другой паловы мінулага стагоддзя.

Яна мае шырокі ганак, над якім трохкутнік страхі абаперты на двух чатырохкантовых слупах — вядома, ужо некалі рамантаваных, бо слупы на нейкую адцень святлейшыя за сцены. А сцены, амшэлыя, крануты дзірачкамі дрэваедаў і з іх сыплецца парахня. Пакрыўленым вокнам не хапае шкляных шыбак, і замест іх няўклюдна, абы-як, устаўлены дзе кардон, а дзе кавалачкі бітага шкла, счэпленыя драначкамі. Словам, школа — як крыўда стагоддзяў.

Сюды вось, у школу, прыйшлі праводзіць сход пасланнікі партыі, Савецкай улады, каб згуртаваць палескіх людзей у калгас. Прыйшоў Мікодым Крот, а з ім інструктар райкома Лена Лесавічанка і «не вучы вучонага» Юрка Точань. Побач з Ленай ішоў Косця Коршак, яшчэ не паголены. А з Юркам у пары крочыў ні то хлопец, ні то ўжо дарослы. Можа, яму было ўжо гадоў пад трыццаць, але на смуглявым, дзіўна птушыным твары разлівалася амаль дзіцячая ўсмешка, і карыя вочы з доўгімі вейкамі глядзелі па-дзіцячы. З-пад памятай кепкі вытыркаліся непадстрыжаныя валасы. Стаяла пацёртая куртка на ім, зашпіленая на адзін гузік, раз-поразу расшпілялася, і ён неяк клопатна яе зашпіляў, быццам баяўся, каб людзі не заўважылі такога недагляду ў вопратцы. Гэта быў Сымонка Жучок. Гэта ён сустракаў Лену Лесавічанку і Точаня ля сельсавета ў складзе аркестра з гармонікам у руках. У яго таксама турэмнае мінулае. Камсамолец Жучок быў вывесіў некалі чырвоны сцяг на скрыжаванні сваіх палескіх дарог і, вядома, трапіў у турму са сваёй песенькай, якую ён спяваў па-свойму. Гэта песенька камсамольская. Яна гаварыла на рускай мове: «Ким, бей по разрухе, строй жизнь в новом духе». Падабалася яна Жучку, але, у першую чаргу, мусіць, сваім матывам, бо з адным слоўцам у гэтай песні ён не разабраўся — ён яго не разумеў. Яму здавалася, што ў такім, напрыклад, слове, як «разруха», бог яго ведае, што крыецца. І ён пачаў спяваць песеньку па-свойму, як яму падыктавала натхненне. Жучок спяваў яе сам сабе: «Кіем бі праміж вухаў, строй жысць ў новым духу»... Чым жа, сапраўды, можна біць «праміж вухаў»? Вядома, толькі кіем. А што такое КІМ — ах, доля горкая, камсамолец Жучок не ведаў. Ніхто яму ў палескай глушы не растлумачыў. Так і ішоў праз свае пастушыя паляны і лясныя дарогі і сцежкі камсамолец Сымонка Жучок і цешыў сябе песенькай: «Кіем бі праміж вухаў, строй жысць у новым духу»... З ёю ён і прыйшоў у турму. Калі хлопцы, таварышы па камеры, пазнаёміліся з ім, і ён асвойтаўся з усімі, аднаго разу ўвечары, пасля паверкі, яны, ужо лежачы на сяннках, запыталіся ў Жучка: «А якія ты знаеш песні, Жучок? Праспявай нам хоць адну». Жучок доўга набіраў адвагі, вельмі саромеўся. Урэшце ўступіў намаганням хлопцаў і ўшпарыў сваім тэнаравым галаском: «Кіем бі праміж вухаў...» Хлопцы праслухалі спеў Жучка, і пасля ў камеры была нават доўгая цішыня. А потым раптам выбухнуў такі ўзрыў смеху, што аж галубы за кратамі залапаталі крыллямі і адляцелі. А Жучок глядзеў, як ашпараны, і думаў: «Чаго ж яны смяюцца? Хіба я не так спяваю? Я ж яе чуў ад таго разумнага таварыша, які хаваўся ў нас на гарышчы і вельмі кашляў. Маці лазіла да яго кожны дзень па драбіне са збанком, з якога тырчэла драўляная лыжка, а ў збанку быў крупнік з малаком. Маці яшчэ парыла яму нейкае зелле ад кашлю. А потым аднаго разу крыкнула на гарышча: «Паліцыя ў сяле», і той таварыш уцёк у лес... »Усё гэта пробегла ў галаве Жучка, і ён урэшце адважыўся спытацца: «А чаго вы смяецеся?» І тут хлопцы, спачуваючы яму, ахвотна растлумачылі песеньку. Даведаўся Жучок, што такое «КІМ» і што такое «разруха».

Нямала гадоў мінула з таго часу. Жучок вырас у мужчыну. Таварышы ў турме навучылі яго пісаць, а чытаць ён трошкі ўмеў, далі яму веды пра зямлю і пра неба, пра сваю краіну і пра барацьбу клясаў, і што павінен перамагчы на свеце і пераможа рабочы клас разам з бедным сялянствам. Сымонка Жучок ужо не Сымонка, а Сымон-гарманіст, паляўнічы і рыбак на ўсе Ракі. Працуе лесніком і хоча вучыцца на лясных курсах, якія маюць адкрыцца ў Лахах. Ідзе на сход, каб памачы стварыць пачаткі новага жыцця ў сваіх родных Раках. Вось дзе вынашаная песенька прыйшла на дапамогу: «Кім, бей по разрухе, строй жизнь в новом духе... трактором мы вспашем будущее наше». Усё зразумела цяпер для Сымона Жучка. Бог даў Сымочу Жучку жонку і двое дзетак. Але гэты несправядлівы бог выдзеліў яму вузкую палоску балотнай зямлі, на якой трэба садзіць бульбу на градах, як капусту, каб у разоры сцякала вада, бо інакш і бульбінкі не збярэш — усё вымакне.

Лены Лесавічанкі Жучок не ведае — у іншай турме яму даводзілася быць, але, відаць, расказаў яму пра яе Коршак, бо Сымон, ідучы, часам паварочвае галаву назад, каб глянуць на Лену. Точань гаворыць яму не толькі пра калгасы — ён палічыў патрэбным гаварыць пра адсталасць Палесся, пра яго дзікасць, абнадзейвае Сымона, што не пройдзе і года, як многае зменіцца на лепшае.

— Атрымаеце трактары, машыны і дзела пойдзе. Толькі арганізаванасць, толькі згуртаванасць...

Сымон маўчаў і толькі час ад часу ўскідваў вачыма на Юрку. Нешта яму, відаць, не падабалася ў яго гутарцы. Нашто, напрыклад, перадражнізаць, як у Раках людзі гавораць? Забіўся, памачыўся... Такі ўжо ён пан — гэты хлопец. Відаць, сам нядаўна з лапцёў вылез. Вось каб ён паглядзеў, як я птушак страляю, якія ў мяне вуды, кручкі і колькі скурак заечых вісіць на гарышчы, нябось бы, так не гаварыў...

У школе гуло, як у вуллі. За крыжаковымі сталамі і на саміх сталах густа сядзелі мужчыны і жанчыны. Апошніх было менш. Кідалася ў вочы немалая прысутнасць старых жанчын. Пры ўваходзе «начальства» ўсе прыціхлі, і пад прагнілай столлю перастала хвалявацца павуцінне. Адзін стол быў незаняты. З-за яго ўстаў і ступіў насустрач «начальству» Мікодым Крот. Лена і Юрка прывіталіся з усімі, і Юрка пачаў вымаць з свайго партфеля паперу, аловак, чарніліцу і дзве школьныя ручкі. Косця Коршак і Сымон Жучок прытуліліся да суседняга стала. Што першае кінулася ў вочы Лене, дык гэта тое, што ў маладых жанчын на галовах новыя хусткі, а ў старых, наадварот, як знарок старыя, пакамечаныя. Мужчыны, апрача маладых, былі барадатыя. У некаторых бароды былі такія купчастыя, што вочы выглядалі з іх, як з куста.

Крот пасля перашэптаў з Ленай адкрыў сход і пачаў гаварыць па-свойму, на «о» і на «са», дзе-нідзе ўстаўляючы рускія словы, якія ён здабыў на ваеннай службе:

— Ось у Росіі ёсць цяпер гэтыя колхозы. Гэта яшчэ Ленін іх заўёў, сказаў, каб разом ораці, сеяці, косіці, коб од того большая прыбыль була, каб кожны богаты буў. От, нашчо тыя колхозы! А хто не будзе слухаціса, будзе зазнаваціса, коса крывіці, то того по шапцы і за ворота. Нэхай поскачэ одзін. Ось у нас пан буў Копылянскі. Вы ж знаеце, колькі ў яго зямлі було — поўсвету. А цяпер будзе наша. Ось прыехалі товарышы совецкія, яны нам раскажуць. Ось товарыш начальніца з раёна, з Лахаў, яна нам раскажа. Толькі прошу добрэ слухаці, не пэрэбрэхваціса...

Лена павольна ўстала. Бачыла, як многа вачэй — мужчынскіх і жаночых — аглядалі яе. Нейкая адцень давер'я да яе відна была ў вачах жанчын. А вось мужчыны прыхоўвалі ўсмешкі пад вусамі. Іх позіркі гаварылі: «Ну, што можа сказаць гэтае дзяўчо— ці яно калі жала, капала, што яно можа ведаць?» Лена, як бы ўчуўшы такое, пачала:

— Вось мяне прыслаў райком партыі пагаварыць з вамі аб калгасах, як іх тут у вас арганізаваць. Вы, напэўна, думаеце, што я нічога не ведаю пра зямлю, што я на ёй не рабіла. Не, дарагія таварышы, я вырасла ў такой жа хаце, у якіх жывёце вы, на трох дзесяцінах зямлі і жаць умею, і капаць, і садзіць, і кудзелю прасці...

Нехта вохкнуў у натоўпе, і пасля паднялася рука. Лена прамовіла:

— Кажыце, я вас слухаю.

Старэнькая бабка трохі хрыплаватым голасам загаварыла:

— Ты ж такая маладзенькая, нысценькая, а мы, бачыце, як з пекла. Ну, як вам тут кудзелю прасці?

— Не, бабка, цяпер я не прасу. Цяпер іншымі справамі займаюся. Вось і да вас прыехала. А быў час, што і я так жыла, як і вы. І хлеба не хапала ў хаце, і ў заробкі да пана ў маёнтак хадзіла. Потым бацька аддаў мяне ў навуку. А потым трапіла ў панскую турму за палітыку і прабыла ў турме пяць гадоў — вось разам з вашым Косцем...

З кутка моладзь запляскала ў далоні, і ўся амшэлая школа ўздрыганулася ад іх.

— Ну, а цяпер пагаворым пра калгасы.

Лена пачала з таго, што нам, заходнікам, трэба выраўняцца з усходняй часткай Беларусі, якая ўжо больш дзесяці год жыве калгасным ладам, што і нам адставаць не трэба, што лягчэй тады будзе кіраваць усёй дзяржаўнай гаспадаркай і ісці яшчэ да лепшых дзён...

Скончыла Лена. Мікодым Крот устаў, спытаў:

— Можа, хто хоча чаго запытаціса?

Пасля нядоўгага маўчання з кутка пачуўся голас той жа бабкі:

— То па колькі дадуць цяпер тое зямлі на кожнага?

Моладзь выбухнула смехам, нават засмяяліся маладзіцы і ажывіліся твары старых. Хтосьці запытаў:

— А колькі б ты хацела, Дамяніса?

Дамяніса азірнулася, пазнала, хто гаварыў і плюнула:

— Цьфу! Усюды мяне напаткаеш. Ты салому маю аддай, што за хлявом забраў.

— Каб ты так дажыла да вечара, як я тваю салому браў. Гэта ж падумаці...

Крот застукаў па стале:

— Не тут вам сварыціса. Колі вам хочацца сварыціса, то ідзеце на двор і там...

— А ці ж я яго чапала?

Было зразумела для ўсіх, што для бабкі Дамянісі гутарка аб калгасах прайшла міма вушэй. Як гарох аб сцяну. Відаць, трэба ёй тлумачыць усё ад пачатку. За гэта ўзяўся Косця Коршак. Ён коратка і хутка выклаў ёй усё, як на далоні. Калі бабцы Дамянісі дайшло да свядомасці, што і яе валока зямлі пойдзе пад калгас, галасок на тонкай ноце завыў:

— Ого-о! Бачыш ты які! То ты мне даў гэтую зямельку, што хочаш адабраці?

Смех зноў страсянуў амшэлую школу.

— Смейцеся сабе, а я сваёй зямлі не дам! — закрычала бабка і, стукнуўшы пяшчыновым кіем аб падлогу, накіравалася да дзвярэй.

Як толькі яна выйшла, з натоўпу паднялася рука мужчыны. Мікодым кіўнуў галавою:

— Гавары, Мусей!

Мусей устаў, пачухаў патыліцу і пачаў:

— От, пана Копылянскага німа, уцёк, кажуць, у Румунію, а зямля яго ляжыць і чамусьці ніхто не робіць з ёю ніякага толку. Колькі было ў пана кароў, то наш камітэт пераздаваў людзям. От жа Кастусь быў старшынёю камітэта... А з панскай зямлёю так нічога і не робіцца...

Яго перапыніў Мікодым Крот:

— Чаго ты гарачку прэш з гэтай панскай зямлёю? Не думай, што пра яе ніхто не думае, а толькі ты адзін. Дадуць беззямельным і самым бедным. А так усю зямлю, што астанецца, пад калхоз. Ужэ паперы прыйшлі, хутка будзем надзяляці.

Пасыпаліся пытанні — як што здаваць у калгас, ці трэба будзе здаваць авечак, курэй, хтосьці гукнуў: «А як з катамі і з кошкамі — таксама здаваць?» А нехта падхапіў: «А з сабакамі?» Нехта заскочыў наперад і гаркнуў: «А хто будзе старшынёю калхоза?» Высокі мужчына з сіваватымі валасамі, падстрыжанымі «пад гаршчок», у расхрыстанай куртцы, наблізіўся да стала і з балючай мінай стаў выкладаць:

— У мяне двое коней і абое хворыя, так што я здаць не магу... Прашу запісаць...

У адказ яму крыкнула некалькі маладых галасоў:

— Ветэрынара з Лахаў прывязем, то падлечыць!

— Якія вы добрыя! — агрызнуўся дзядзька.

Ён хацеў гаварыць далей, але яго перабіў Юрка Точань:

— Вам жа сказалі пра ветэрынара...

Дзядзька насупіўся і адышоў.

Лена зразумела, што гэта, відаць, кулак. Калі гамана стала аціхаць, слова папрасіў Сымон Жучок. Голас у Сымона тэнарысты, пераліўны, і ён яго не шкадаваў для гэтых людзей, што паблісквалі вачыма ў нерашучасці і нецярплівасці — што ж тут будзе далей?

— Балото вы, балото, — пачэў Жучок. — Вы не разумееце, што Савецкая ўласць вам дабра хоча,— коб не было бядоты на свеце, коб кожны меў хлеб і да хлеба. А то ось Дамяніса мае валоку зямлі, а хоча, каб ёй яшчэ больш далі, а пра тое не думае, што ў нас у сяле ўсё больш адна бядота. А яна хоча сабе яшчэ больш, а пра беднату і не думае. То як? Можна з гэтым погадзіціса?! — ускрыкнуў Жучок і на момант змоўк, а потым адказаў: — «Не, з гэтым погадзіціса не можна, бо гэта пакрыўдзіць людзей, што ў беднасці. А іх, гэтых людзей, больш на свеце. Вось яно як!

Не мог прамаўчаць Жучок і пра таго дзядзьку, які казаў, што ў яго коні пахварэлі.

— У яго раптам коні пахварэлі. Чуеце? Калі тое было, каб у Апанаса Мядзведзя коні хварэлі? Праўда, у яго была колісь старая кабыла. Яна кашляла, а ён жа яе да ветэрынара не паўёў. Кабыла ў плузе ішла, на калені падала. А ён знай одно — пугаю і пугаю. Яна ўставала і цягнула плуга далей. А да ветэрынара не паўёў, дабіваў старую кабылку і дабіў, каб скуру здзерці. То ён цяпер накідае хваробу на здаровых коней, каб у калхоз не ўзялі. Думае, што яму павераць.

Апанас Мядзведзь хмурыў лоб, пазіраў зласлівае навокал і ўрэшце перабіў Жучка:

— А я з табою, галадранцам, у гэты калхоз і не пайду!

— Яшчэ невядома, ці цябе прымуць, каб ты і хацеў, — адказаў разгарачаны Жучок і тут жа звярнуўся да старшыні Мікодыма: — Дзядзька Мікодым! Запісвай мяне першага ў калхоз!

Косця Коршак жвава раскрыў папку з паперамі і першага запісаў Сымона Жучка. Запісаўшы, аглянуў усіх і спытаўся:

— Хто яшчэ? Запісвайцеся!

З двара пачуўся гудок машыны. Нехта прыехаў і хутка павінен увайсці. Вочы ўсіх наставіліся на дзверы. Увайшоў не хто іншы, а ўжо ўсім знаёмы старшыня Лахскага райвыканкома Сідарук Пракоп. Увайшоўшы, ён пакланіўся ўсяму сходу і павітаўся з членамі прэзідыума, з кожным паасобку. Мікодым Крот пачаў яму ўпаўголаса дакладваць аб сходзе, што вось пачынаецца запіс жадаючых уступіць у калгас.

— Спісу мала. Трэба, каб кожны падаў заяву.

— Кожны? — Крот пакачаў галавою. — Таварыш Сідарук, з гэтага нічога не выйдзе. У нас і паперы столькі няма, каб усіх задаволіці. А галоўнае, што пакуль адны будуць пісаць, то другія разыдуцца. А што б, скажам, адзін лісточак на дзесяць, дваццаць чалавек?

Сідарук цмокнуў губамі пад вусам і закруціў галавою:

— Сакратар Ярмілаў казаў, каб кожны паасобку.

Абодва звярнуліся да Лены. А Лена падумела, аглянула сход і адчула, што трэба каваць жалеза, пакуль яно гарачае, і далучылася да прапановы Мікодыма Крата. Сідарук кіўнуў галавою ў знак згоды і кінуў:

— Калі гінуць, дык разам.

Косця Коршак праверыў запас паперы. Запрошаны Сымон Жучок узброіўся нажом і пачаў разразаць яе на чацвярцінкі. Сідарук стаў у позу аратара і гаварыў:

— Вось я толькі што з Ракітніцы. Там большасць запісалася ў калгас. Чым вы горшыя за іх?

Седзячы з ім побач, Юрка Точань пачуў носам, што ад Сідарука папахвае хатнім, не зусім пахучым напіткам, выняў з бакавой кішэні пінжака запісную кніжачку і нешта запісаў. Запісваючы, не заўважыў, што пасля слоў Сідарука сяляне пасмялелі.

— Ну, раз нейкая там Ракітніца запісалася, то мы што — горшыя?

Сталі падыходзіць да стала, браць паперкі і прасіць Жучка напісаць заяву. Жучок нанізваў на заяву па дзесяць, пятнаццаць чалавек і даваў падпісвацца. Непісьменным казаў паставіць побач са сваім прозвішчам тры крыжыкі. Тое самае рабілі Лена, Коршак і Сідарук. Яго пузырыстыя тоўстаскурыя пальцы трымалі ручку, як нешта для іх неадчувальнае. Вось-вось выкаўзнецца, пяро з трэскам выпісвала тлустыя літары. Не, калі быў камандзірам узвода ў дывізіі Чапаева, пісаў лепш. Даўно гэта было. За плугам, за касою на палескіх балотах падзеравянелі далоні...

Старшынёю калгаса аднагалосна выбралі Кастуся Коршака. Ніхто не згледзеў, калі і як Апанас Мядзведзь знік са сходу. Не, заўважыў адзін — Жучок. Зложыўшы далоні трубкаю, ён зацюцюкаў:

— Цю-цю-цю...

Відаць, заўважыў знікненне Мядзведзя і Крот, бо кіўнуў Жучку:

— Не трэба так. Не трэба...

Праўленне Саюза пісьменнікаў БССР выказвае глыбокае спачуванне пазту Аляксею Зарыцкаму з прычыны напаткаўшага яго гора—смерці маці.

Саюз кампазітараў БССР і Беларускае аддзяленне Музфонду СССР выказваюць глыбокае спачуванне кампазітару Семяняку Юрыю Уладзіміравічу з выпадку напаткаўшага яго вялікага гора—смерці маці.

ВЯСЁЛАЯ ТРАСЯНКА

ЖАРТЫ, ГУМАРЭСКІ, ПАРОДЫІ, ЭПІГРАМЫ, ШАРЖЫ

— Ты ж ведаеш, я універсальны літаратар: пішу вершы, прозу, драматургію, кінасцэнарыі і г. д.



— Чаго вы здзіўляецеся? Дома я прывык пісаць у ванне!

Мал. А. ЗАЎЯЛАВА.

МІМАХОДЗЬ

Д. РОХКЕС

Плакат: «Беражыце лёс ад пажару!»

□

Знаёмы друг.

□

Адчайны баязлівец.

Ул. ДАНІЛАЎ

Калі гаворка заходзіла пра мастацтва, ён заўсёды выходзіў пакурыць.

□

Брыдкае качаня, зрабіўшыся лебедзем, пачало марыць пра хвост паўліна.

□

Ён сапраўды мастак слова, але мастак... абстрактны.

□

Уносячы свой уклад у мастацтва, ён старанна прыглядаўся, што б вынесці адтуль.

□

Ён адчуваў сябе ў сваёй талерцы нават пад жончыным абцасам.

Андрэй ПІВАВАРАЎ

ЗАНЯТКІ па курсах павышэння кваліфікацыі настаўнікаў праходзілі ў розных навучальных установах Гомеля. Мы чэрпалі веды то ў інстытуце ўдасканалення настаўнікаў, то ва універсітэце, то ў сярэдніх школах. Спавалі, як пераездныя сваці. Але ўсё ж часцей займаліся ў сярэдняй школе, што непадалёк ад інстытута ўдасканалення, — з трох гадзін дня.

Сяджу я аднойчы на ўроку, слухаю пра сінусы вугла альфа і раптам бачу перад самым носам надпіс алоўкам: «Не малойце на парце кірпатыя носікі і кучаравыя галоўкі. Вы псуеце дзяржаўную маёмасць. Лепей давайце пазнаёмімся. Хто вы і адкуль? Адказ пакладзіце ў парту».

Я ўважліва вывучыў почырк. Не было сумнення — пісала дзяўчынка. А раз гэта пакой дзесятага класа — выпускніца. Неяк няёмка было настаўніку завязваць перапіску са школьніцай, вельмі выглядала ўсё гэта па-блазенску, але ж... Але невядомы вобраз яе настырна лез у галаву. Падумаў, што не будзе ніякага грэху, калі чыркану пару слоў. Я ж цяпер, бадай, не настаўнік, а таксама вучань. І я напісаў: «Мілая дзяўчынка! Дзівацкі ў цябе спосаб знаёмства. Але — калі ласка. Працую вясковым настаўнікам на Рагачоўшчыне. Пятро Гарбуз».

На другі дзень мяне чакаў лісток з пытаннямі такога характару: «Дзякую, што адгукнуліся. У вас прыгожы почырк. Ці пішаце вы верны? Калі пішаце, то прысвяціце што-небудзь мне. Які ваш рост? Мяркуючы па прозвішчы, я ўяўляю вас нізенькім, тоўсценькім і кругленькім... Выбачце за гуллівасць. Які колер вашых вачэй, валасоў? Ці жанаты? Ці добра сядзець на маім месцы? Арынка».

«Нарэшце мы пазнаёміліся, — напісаў я, не забыўшыся сваю чарговую інфармацыю перасыпаць гумарам. — Вершаў не пішу. А з гарбузоў я самы доўгі — дзвесце адзін сантыметр. Вочы двайныя. Сівы, як лунь. Вяршок галавы, бы тое калена. Жанаты. Парта добрая. Толькі не ведаю, колькі ў цябе двоек. Можа болей, чым у мяне дзяцей. А іх сямёра».

«Пра дзяцей вы не ў той бок загнулі, — пісала Арынка. — Цяпер рэдка ў каго па столькі бывае. Мусіць, вы яшчэ зусім нежанаты. Пра дзеда — не веру. Зараз такія «лучі» па пенсіі. У мяне ж ні адной тройкі. Толькі чацвёркі і пяцёркі. Давайце сустрэнемся. Вы вельмі цікавы і забаўны чалавек. Калі не супраць, то можна заўтра. Ля драматычнага тэатра а палове дванаццатай дня. Цікавы спектакль...»

На месца спаткання я прыйшоў крыху раней. Загадзя купіў два білеты на дзённае прадстаўленне і, выбраўшы зручнае месца, пачаў назіраць за бурлівым патокам моладзі. Хутка павінна прыйсці мая выпускніца. Але як я яе пазнаю? А яна як? Будзе, напэўна, шукаць двухметровага геркулеса, калі мой рост усяго толькі метр шэсцьдзесят адзін. Запытацца ў каго з дзяўчат — можа хто з іх ведае Арынку? Толькі горад — не вёска. Там цябе ведае кожны, як аблупленага, а тут... Школ таксама багата, дзесятых класаў яшчэ больш.

Але што гэта такое? Вунь дзяўчынка відочна некага чакае. Ходзіць сюды-туды па тратуары, стрыжэ вачыма па праходжых, хвалюецца. А можа?

— Арынка! — паклікаў я.

Устрапянулася і спахопліва зірнула на мяне, пачырванела.

Са спектакля ішлі дадому разам.

— А я ведала, што пісала вам, — прызналася Арынка. — Вельмі хацелася паглядзець гэту камедыю, ды мама грошай не дае. Толькі вы ёй не расказвайце, добра?

— А ты, Арынка, ні гу-гу маёй жонцы, — па-змоўніцку плюснуў я вокам.

Гэта была мая пляменніца, дачка старэйшай сястры Аксіні, у якой я жыў зараз на кватэры.

Аўдзей САМАСЕЙ

СКАРОЧАНЫЯ КОПІІ

РАГАТАЯ ДУША

Надзейна ўмацаваны ў вушак
З ласіных мужных рог вяшак.
Прыходжу змораны дадому вечарам.
Чапляю нерашуча паліто.
І рогі ўспыхнулі, як тыя свечкі,
Такою чысцінёй святой.
Як статуя, застыну ля парога.
Пабег бы ў лес, у стомленыя дні, —
Душа уся навострана, як рогі,
Супроць яе, спакусы-цішыні.
Ды потым незнарок зусім
Я за каўнер пакратаў паліто,
Здавалася, выскоквалі ласі
І бубнамі грымелі капытоў.
Уцекачы дарог не выбіралі,
Яны імчалі проста ў лес, у ціш.
Зямля узбуджаным гула вібратарам,
А рогі той вушак не адпусціў.

(Казімір КАМЕЙША)

АДДАНАСЦЬ

Цягаю камяні. Да каменя камень —
І ўжо гатова кладка праз ручай.
Пакінь на гэтым беразе адчай,
Мацней абві, любімая, рукамі.

І ўжо нясу цябе ў майскі снег,
Цябе—і лёгкую, і маладую.
Ні губ, ні шчок ты не шкадуеш мне,
І я нічога ў свеце не шкадую...

(Віктар РАКАЎ)

РАМАНТЫЧНЫ «МЁД» ЗМЯНЯЕЦЦА РЭАЛІСТЫЧНАЙ «ГАРАЙ»

Крытыкі, якія разглядаюць вобразы, падобныя Гапону, з пазіцый рэалізму, ігнаруюць асноўную эстэтычную прыроду вобраза, таму і павінны ўвесь час агаворвацца, што гэты вобраз не тыповы, што, маўляў, тут моцна праявіўся шляхецкі лібералізм пісьменніка, яго імкненне ідэалізаваць жыццё, інакш кажучы, залішне дакараць аўтара замест таго, каб сказаць прама, што вобраз гэты рамантызуецца і тым самым выяўляе нязгоду пісьменніка з дорэвалюцыйнай, якую рэчаіснасць вызначыла мужыку.

А па-другое, пры характарыстыцы гэтых вобразаў і творэў як рэалістычных за рэалізм выдаецца не тое, што ў літаратуры было самым моцным, не яе дасягненні, а слабасці. Сінонімам рэалізму становіцца неразвітасць літаратуры, яе натуралістычная прыніжанасць. А гэта ўжо не апраўдваецца ніякімі высокімі меркаваннямі.

Але пасля сказанага не можа не ўзнікнуць пытання: ці ёсць увогуле якія-небудзь пункты судакранання творчасці В. Марцінкевіча, маецца на ўвазе дарэформеннай, паэтычнай, з рэалізмам, з рэалістычнай эстэтыкай і паэтыкай. Безумоўна, ёсць. Яны могуць быць выяўлены пры ўмове, калі на асноўныя эстэтычныя тэндэнцыі творчасці пісьменніка, на яго сентыменталізм і рамантызм глядзяць не як на «заганы», як на антаганістаў рэалізму, а як на з'явы, што папярэднічалі рэалізму XIX ст. і яго падрыхтоўвалі, г. зн. калі мы іх здолеем асэнсаваць у тых суадносінах, у якіх яны былі ў гісторыі сусветнай літаратуры ўвогуле...

Параўнаем дзве аналагічныя карціны сельскай гулянкі ў «Гапоне» і ў «Быліцах». У гэтых этнаграфічных замалёўках шмат агульнага. У абодвух выпадках дзеянне адбываецца ў карчме, дзе сабралася вясковая моладзь, мужчыны і жанчыны; паказаны вясёлыя танцы з прыпеўкамі. Але нельга не заўважыць, што, па-першае, у «Быліцах» ужо некалькі аслабявае сентыментальнае светаўспрыманне пісьменніка, пагэтаму прыкметна змяншаецца і насычанасць лексічнай фактуры твора памяншальна-ласкальнымі формамі.

Па-другое, і гэта самае галоўнае, пісьменнік становіцца больш уважлівым да дэталі і да жыццёвай прозы. Яго ўжо не задавальняе эстэтызацыя побыту, якая наглядалася ў «Гапоне». Калі ў «Гапоне» аб вясковай гулянцы ў карчме пісалася, што сельская дружына «піва, мёд, гарэлку п'е», то ў «Быліцах» гэта ўжо выглядае наступным чынам: «За сталом паважна сядзяць гаспадары, балакаюць сабе, папіваючы гары».

Гэта ўжо, бадай, на мове рэалізму. Рамантычны «мёд» змяняецца падкрэслена рэалістычнай «гарай».

(Міхась ЛАЗАРУК)

Браты БАРОЎКІ

ЖАРТАЎЛІВЫЯ ДЫЯЛОГІ

— Па ядзе работніка пазнаюць.

— Зокажы тады яшчэ шашлычок і блінцы з мясцам.

●

— Раскажы пра вераб'я, а перакажуць пра журавля.

— У такім разе раскажы каму-небудзь пра мяне.

●

— З адной губы і горача, і холадна.

— А хто табе ажаніцца не дае?

●

— Дурны сабака і на гаспадара брэша.

— Затое і чужога не прапусціць.

●

— Не ты казаў, а сарока ляцела ды варона ў яе на хвасце сядзела.

— Цікава, дзе ты сядзеў, калі ўсё гэтак добра ведаеш?

●

— Кожны мае свае мухі.

— Але ж твае нешта на аваднёў падобны.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

«ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

Выходзіць па пятніцах.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Індэкс 63856 АТ 15075

Адрас рэдакцыі: Мінск, вул. Захарава, 19.

Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі—33-24-61, намесніка галоўнага рэдактара—33-25-25, адказнага сакратара — 33-44-04, аддзела літаратуры—33-22-04, аддзела тэатра, кіно і музыкі—33-24-62, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 33-24-62, аддзела публіцыстыкі — 33-24-62, аддзела культуры—33-21-53, выдавецтва —32-22-19, бухгалтэрыі—32-15-87.

Рукапісаў рэдакцыя не вяртае.

Галоўны рэдактар Л. Я. ПРОКША.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, В. М. АЛАДАЎ, А. Ц. БАЖКО (намеснік галоўнага рэдактара), Б. І. БУР'ЯН, А. І. БУТАКОЎ, А. С. ГРАЧАНІКАЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, І. М. ДАБРАЛЮБАЎ, В. У. ІВАШЫН, А. С. КАЗЛОЎСКІ, П. М. МАКАЛЬ, У. Л. МЕХАЎ (адказны сакратар), Р. К. САБАЛЕНКА, І. А. САНКОВА, М. Г. ТКАЧОЎ, Ю. М. ЧУРКО, Р. Р. ШЫРМА.